Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

30 ЛІПЕНЯ 2008 г.
СЕРАДА
№ 140
(26253)

Кошт 500 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр Лукашэнка даручыў да 1 лістапада 2008 года аднавіць і адрамантаваць усе аб'екты спартыўнага прызначэння

Аб дзейнасці Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі і развіцці прафсаюзнага руху ў краіне 29 ліпеня кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнку праінфармаваў старшыня ФПБ Леанід Козік.

Паводле слоў Леаніда Козіка, прафсаюзныя арганізацыі, што ўваходзяць у ФПБ, нацэлены на канструктыўную работу, якую актыўна праводзяць разам з органамі ўлады. За апошнія два гады ФПБ стварыла больш за 1500 новых прафсаюзных арганізацый у прыватным сектары.

Леанід Козік падрабязна спыніўся на пытаннях арганізацыі дзіцячага і дарослага аздараўлення. Старшыня ФПБ канстатаваў тэндэнцыю павелічэння колькасці дзяцей, якія аздараўліваюцца ў горадзе ў так званых прышкольных лагерах.

Аляксандр Лукашэнка лічыць недапушчальным прадаўжэнне скарачэння колькасці загарадных аздараўленчых аб'ектаў для дзяцей: юныя жыхары Беларусі павінны мець магчымасць атрымліваць паўнацэнны адпачынак за межамі горада на прыродзе. Прэзідэнт указаў на важнасць правядзення рэвізіі адпаведных аб'ектаў.

Гаворачы аб арганізацыі аздараўлення для дарослых, Леанід Козік паведаміў, што ўсе санаторыі, якія знаходзяцца ў веданні ФПБ, працуюць з поўнай загрузкай, пры гэтым пуцёўкі карыстаюцца вялікім попытам не толькі сярод беларусаў, але і іншаземцаў. Паводле яго слоў, на сённяшні дзень у здраўніцах змаглі адпачыць ужо 14 700 замежных гасцей, пераважна з Расіі, Польшчы, Украіны, краін Балтыі. Людзей прывабліве добрае медыцынскае забеспячэнне і абслугоўванне ў санаторыях, высокаквалі-фікаваны персанал, харчаванне. Аднак госці выказваюць пажаданні адносна арганізацыі разнастайнага правядзення вольнага часу.

Прэзідэнт прапанаваў ФПБ вывучыць магчымасць будаўніцтва ў санаторыях плавальных басейнаў.

Аляксандр Лукашэнка падрабязна цікавіўся станам масавага спорту ў краіне. Цяпер у дзіцячаюнацкіх школах Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі займаюцца 55 тыс. чалавек.

Прэзідэнт звярнуў увагу на неабходнасць аднаўлення ўсіх аб'ектаў спартыўнага прызначэння, а таксама рамонту будынкаў, у якіх знаходзяцца спартыўныя школы. Як было адзначана, многія спартыўныя секцыі размяшчаюцца ў падвальных і паўпадвальных памяшканнях, якія былі выдзелены яшчэ ў савецкія часы і цяпер знаходзяцца далёка не ў лепшым стане.

Як падкрэсліў кіраўнік дзяржавы, да 1 лістапада 2008 года ўсё гэта павінна быць адрамантавана па ўсёй краіне, і займацца вырашэннем гэтай праблемы павінны мясцовыя органы ўлады.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ІЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ З НОВАЙ КРОПКІ АДЛІКУ

З 1 жніўня мінімальны спажывецкі бюджэт павялічыцца на 6,7 працэнта — аб гэтым паведаміла начальнік аддзела комплексных праблем развіцця сацыяльна-працоўнай сферы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Тамара Рак.

У прыватнасці, новы сярэднедушавы мінімальны спажывецкі бюджэт для сям'і з 4 чалавек складзе 345 670 рублёў. Пры гэтым, нагадала Тамара Рак, сярэдні МСБ выкарыстоўваецца для вызначэння права на атрыманне льготных крэдытаў пры будаўніцтве жылля.

Сяргей ГРЫБ.



ПА ЎРАДЖАЙНАСЦІ ЛІДЗІРУЕ ГРОДЗЕНШЧЫНА

На 29 ліпеня скошана 323,2 тысячы га збожжавых, што складае больш за 14 працэнтаў запланаванай плошчы, паведамілі рэдакцыі ў галоўным упраўленні Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання. Ураджайнасць збожжавых у сярэднім па краіне складае зараз 34,8 ц/га. Агульны валавы збор склаў 1 мільён 118,96 тысячы тон збожжа. За мінулы дзень было ўбрана каля 80 тысяч га, або 3,5 працэнта плошчы.

Сяргей КУРКАЧ.

У палку тысячнікаў прыбывае!

У мінулую сераду мы паведамлялі пра тое, што на ўборцы збажыны тысячнага рубяжа намалотаў першымі ў рэспубліцы дасягнуў экіпаж камбайнераў Валянціна Саламахі і Аляксандра Граня з КСУП «Агракамбінат Холмеч», што ў Рэчыцкім раёне. А на 29 ліпеня на камбайне «Лексікон» яны здабылі ўжо 2384 тоны збожжа!

Пра тое ж, як ідзе барацьба за лепшыя вынікі на жніве сярод механізатараў Гомельшчыны, нам расказала загадчыца аддзела арганізацыйна-прававой і кадравай работы абласнога прафсаюза працаўнікоў АПК Яўгенія Корсак. Аказваецца, рэкорды ўстанаўліваюць на ўборцы не толькі на «Лексіконах», але і на гомсельмашаўскіх машынах (два экіпажы з таго ж Рэчыцкага раёна Віктара Грэся і Андрэя Анікеенкі, Мікалая Герыловіча і Сяргея Лявоненкі). Адметна таксама, што і ў Буда-Кашалёўскім раёне з'явіліся пераможцы-тысячнікі: экіпаж КЗС-1210 Максіма Шаўчука і Яўгена Некрашэвіча з КСУП «Камінтэрн» — 1360 тон. Усяго ў вобласці на 29 ліпеня налічвалася 10 экіпажаў, якія перавысілі тысячны рубеж. Вызначыліся таксама і 12 вадзіцеляў якія перавезлі больш як па тысячы тон збожжа.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Масавая ўборка рапсу на палетках унутры мінскай кальцавой дарогі.

«Мне больш поле падабаецца, у горад не хачу»

Гэтыя шчырыя словы сказаў мне Вадзім Дуброўскі — яшчэ зусім малады, а ўжо вельмі паважаны не толькі ў сваім калектыве камбайнер з Пастаўскага раёна.

Летась на жніве Вадзім Дзмітрыевіч стаў адным з першых маладых «тысячнікаў». І сёлета вельмі старэецца на ўборцы ўраджаю. У адной гаспадарцы — СВК «Камайскі» — з ім разам працуюць бацька, дзядзька і малодшы брат.

Параілі мне пагутарыць з ім у Пастаўскім райкаме БРСМ.

— Добры вельмі хлопец! Проста малайчына! Толькі ж, вы разумееце, цяжка зараз хлебаробам, час для іх напружаны. Мо толькі падчас перапынку і зможаце пагутарыць? — сказалі лідары раённай структуры самай масавай маладзёжнай арганізацыі.

Вадзім — чалавек малады, нарадзіўся ў 1984-м, а ўжо шмат чаго ў жыцці дабіўся. На рабоце яго цэняць за добрую дысцыпліну. Не гультай. Працаваць умее. Вельмі любіць тэхніку, добра ў ёй разбіраецца. Чалавек ён ужо сямейны. Шчаслівы бацька: сыну толькі 9 месяцаў. Жонка знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску, даглядае дзіця. А па спецыяльнасці яна бухгалтар і страхавы агент.

Вельмі любіць Вадзім родны куточак Беларусі. Таму здзівіўся майму нечаканаму для яго пытанню: няўжо ніколі не думаў пераехаць у горад, як, на жаль, многія юнакі і дзяўчаты з вёсак?

— Не. Навошта? Мне поле падабаецца! З дзяцінства мой бацька, Дзмітрый Альфонсавіч, на асабістым прыкладзе паказваў, як трэба добра працаваць на зямлі. Браў мяне на працу. Ды і брат яго, Алег Альфонсавіч, таксама. Цяпер мы разам у кааператыве і працуем. І сярэдні мой брат Артур — на трактарах. А самы малодшы Віталь — будучы кухар-бармен.

Я ж усё жыццё ў Пастаўскім краі. Вучыўся тут у школе і на механізатара. Ды і няшмат з маіх былых аднакласнікаў у гарады далёкія па шчасце падаліся.

Працуе Вадзім на камбайне «Дон-1500 Б». Адзін, без памочніка. Прызнаецца, што цяжка яму аднаму. Працуе за дваіх. Адказна вельмі. Машына старая, але свайго камбайнера не падводзіць.

— А новы камбайн не абяцалі вам як маладому перадавіку? За леташні паказчык неяк прэміявалі?

— Пакуль што не *(смяецца)*! А калі б далі новы камбайн, вядома ж, вельмі добра было. Мне наша айчыннае сельгастэхніка падабаецца, працуе не горш за замежную.

Мы ўжо тыдзень працуем. Колькі намалацію? Тон 200 збожжа. Думаю, як і летась, канчатковы вынік будзе добрым.

У сем гадзін раніцы герой нашай публікацыі ўжо на працы. А дамоў (жыве ў вёсцы Сакуны, што кіламетраў за 14 ад месца працы) вяртаецца пасля дзевяці вечара.

— Вядома ж, цяжка. Але ўбіраць хлеб трэба, — сказаў Вадзім.

Безумоўна, у гэтыя напружаныя дні камбайнеры могуць нядрэнна зарабіць. А як нялёгка даюцца гэтыя вялікія, па сельскіх мерках, грошы. Гэта, прабачце, не ў кабінеце ў нейкай канторы ля вентылятара пасядзець, каб паперкі перабраць, ды камандаваць. Сэнс вельмі пастарацца ёсць, каб той жа мільён і больш налічылі. І без усялякіх лозунгаў пра «барацьбу за ўраджай».

Пасля жніва будзе чым заняцца маладому камбайнеру, і добры механізатар у вёсцы заўсёды пры справах.

Вёска, дзе жыве Вадзім Дуброўскі, невялікая. Як ён сказаў, усяго некалькі дзесяткаў дамоў там. Моладзі няшмат. Крама ёсць. А калі што трэба, напрыклад, бытавую тэхніку, на заказ прывязуць. Аграгарадок, паводле яго слоў, у гэтай вёсцы стварыць не планавалі.

Безумоўна, з задавальненнем запрасілі б яго пераехаць куды-небудзь, дзе параўнальна больш прывабныя ўмовы для пражывання. Такія працалюбівыя кадры, тым больш маладыя, цяпер у вялікім дэфіцыце ў вёсцы. Ды не паедзе! «Прырос», як гаворыцца. І добра, што ёсць такая моладзь у нашых вёсках. Якая корміць нас разам са сваімі бацькамі. І зараз збірае «золата» з палёў. Кожны дзень пры любым надвор'і.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ва Ўрадзе

«КОЖНАЕ НОВАЕ ПАВЫШЭННЕ ЦЭНАЎ У КРАІНЕ БУДЗЕ ЎЗВАЖАНЫМ...»

Пацвярджэннем таго, што ў Беларусі прымаюцца своечасовыя і правільныя рашэнні, накіраваныя на стабільнае развіццё эканомікі, з'яўляюцца вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за першае паўгоддзе. На пасяджэнні Савета Міністраў Беларусі, якое прайшло пад старшынствам прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, было зазначана, што за шэсць месяцаў тэмп росту валавога ўнутранага прадукту склаў 110,4 працэнта, прадукцыі прамысловасці — 113 працэнтаў, інвестыцыі ў асноўны капітал павялічыліся на 123,9 працэнта. Прычым згаданыя найважнейшыя параметры развіцця эканомікі значна перавышаюць прагноз на гэты год, які быў зацверджаны кіраўніком дзяржавы.

Як падкрэсліў першы віцэ-прэм'ер Уладзімір Сямашка, асноўнай крыніцай высокіх тэмпаў эканамічнага росту застаецца прамысловасць: тут выкананы не толькі зацверджаны прагнозны параметр, але і павышанае заданне, зацверджанае Урадам. Паводле слоў першага віцэ-прэм'ера, з 268 арганізацый Мінпрама 247 забяспечваюць прагнознае павелічэнне аб'ёмаў вытворчасці. У якасці прыкладу Уладзімір Сямашка ўзгадаў Мінскі трактарны завод, які за паўгоддзе павялічыў выпуск трактароў на 20,5 працэнта, і «Гомсельмаш», дзе выпуск збожжаўборачных камбайнаў узрос на 44 працэнты.

Устойліва высокімі — 113,6 працэнта — з'яўляюцца і тэмпы вытворчасці спажывецкіх тавараў. Гэты сектар прамысловасці, дарэчы, знаходзіцца пад пільнай увагай Урада: паколькі ў краіне прымаюцца меры для істотнага росту зарплаты, задача па павелічэнні выпуску ўласных тавараў застаецца на першым плане. Уладзімір Сямашка праінфармаваў прысутных, што ўжо распрацавана комплексная праграма развіцця вытворчасці спажывецкіх тавараў у Беларусі на 2009—2015 гады. Згодна з яе праектам, прадугледжваецца павелічэнне іх вытворчасці па ўсіх асноўных групах, у тым ліку ў 2010 годзе ў параўнанні з 2005-м на 67,3—70,3 працэнта, а ў 2015-м у параўнанні з 2010-м — на 62,5—70 працэнтаў.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Студэнтаў лічаць па балах

Нарэшце абітурыенты, якія спаборнічалі за права насіць званне студэнта Белдзяржуніверсітэта, уздыхнулі свабодна — завяршыліся ўступныя выпрабаванні ў вядучай ВНУ краіны.

На дзённую бюджэтную форму навучання Белдзяржуніверсітэта залічаны 1871 чалавек, на завочную бюджэтную форму навучання — 425, ваенны ж факультэт папоўніўся на 61 курсанта.

Сярод гуманітарных спецыяльнасцяў самы высокі прахадны бал — 344 — зафіксаваны на спецыяльнасці «Інфармацыя і камунікацыя» факультэта філасофіі і сацыяльных навук, такі ж прахадны бал дазволіў стаць студэнтамі абітурыентам, якія падавалі дакументы на спецыяльнасць «Сусветная эканоміка». Сярод прыродазнаўчанавуковых спецыяльнасцяў самы высокі прахадны бал — 352 — на спецыяльнасці «Камп'ютарная бяспека» факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі.

Трэба адзначыць, што сярэдні бал атэстата абітурыентаў БДУ павысіўся ў параўнанні з мінулым годам з 8,2 да 8,5.

У Беларускім дзяржаўным універсітэце інфарматыкі і радыёэлектронікі на 900 бюджэтных месцаў на шэсць факультэтаў конкурс склаў у сярэднім 2 чалавекі на месца. Прахадныя балы значна вышэйшыя за мінулагодняя. На факультэце «Камп'ютарныя сістэмы і сеткі» — звыш 300, а на спецыяльнасці «Інфарматыка» і «Праграмнае забеспячэнне інфармацыйных тэхналогій» — звыш 340 балаў.

У Беларускім аграрным тэхнічным універсітэце на аграмеханічным факультэце праходзяць у склад студэнтаў абітурыенты з балам звыш 160 (гарадскі конкурс) і звыш 140 (сельскі). А на аграэнергетычным факультэце ў конкурсе сярод абітурыентаў з горада і вёскі ўзялі ўдзел толькі тыя юнакі і дзяўчаты, якія набралі больш за 170 балаў. На факультэце «Прадпрымальніцтва і кіраванне» прахадны бал склаў сярод абітурыентаў з горада — прыкладна 160, а сельскай мясцовасці — 140.

Надзея ДРЫЛА.

Новы гомельскі вагон

Дваццаць новых вагонаў намечана сёлета вырабіць на Гомельскім вагонарамонтным заводзе. Ад ранейшых яны будуць адрознівацца тым, што ў іх не 36 месцаў для пасажыраў, а 40. У новым вагоне прама ў купэ можна будзе зарадзіць мабільнік і падключыць ноўтбук, праз кнопку выкліку заказаць, скажам, чай ці абед. Туалеты ў ім вакуумныя, і карыстацца імі можна і на прыпынках.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ISSN 1990 - 763X

БЕЛАРУСБАНК

Открытое акционерное общество «Сберегательный банк «Беларусбанк»,

расположенное по адресу:
220050, г. Минск, ул. Мясникова, 32

СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 4 АВГУСТА 2008 ГОДА ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ СО СЛЕДУЮЩЕЙ ПОВЕСТКОЙ ДНЯ:

1. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Акционеры ОАО «АСБ Беларусбанк» могут ознакомиться с информацией по вопросам повестки дня и заполнить бюллетень для заочного голосования (до 2 августа), а также с решениями, принятыми внеочередным Общим собранием акционеров банка (после 4 августа) по адресу: г. Минск, ул. Мясникова, 32, комн. 704(в), а также в филиалах — областных (Минском) управлениях, филиалах банка.

Дата окончания приема бюллетеней – до 2 августа 2008 года.

Телефоны для справок: (8-017) 218 87 72, 218 82 43.
Телефоны для справок: (8-017) 218 84 38, 218 87 72.

УНП 100325912.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства административно-производственного здания, об. пл. 5017,0 кв.м, расположенного в г. Слуцк, ул. 14 Партизан, 15. Начальная цена – 1 436 400 000 бел. руб. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 19.04.2008 г. Аукцион состоится **15.08.2008 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **14.08.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 326.

Контактный телефон (8 017) 224 61 34.
Наш сайт в Интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже *производственного комплекса «База материально-технического снабжения» (имеется ж/д ветка)*, в составе: здание котельной, об. пл. 30,2 кв.м; здание склада метизов, 324,3 кв.м; навес металлический, 913,2 кв.м; здание старой конторы (административно-хозяйственное здание), 165,9 кв.м; здание пункта сборки с/х машин, 656,7 кв.м; здание обменного пункта, 656,7 кв.м; здание лакокрасочного склада, 796,8 кв.м; административное здание, 370,7 кв.м; здание склада общего назначения, 1374,6 кв.м, в том числе подъездные дороги (об. пл. 980,3 кв.м), асфальтированная площадка (24 229 кв.м), забор, об. пл. 1717,1 кв.м, общей протяженностью 906,2 м (ж/б 1608,6 кв.м, металлический 19,8 кв.м, деревянный 88,7 кв.м), а также оборудование: два козловых крана КК-12,5-25-9, два газовых котла АОГВ-29 – расположенного по адресу: *Минская область, г. Столбцы, ул. Зеленая, 58.* Начальная цена с НДС – 2 836 399 672 бел. руб. *Площадь земельного участка – 3,5164 га.* Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 27.06.2008 г. Аукцион состоится **15.08.2008 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **14.08.2008 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в Интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 30.07.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 114,00
1 еўра	3 327,54
1 латвійскі лат	4 734,07
1 літоўскі літ	963,69
1 чэшская крона	140,04
1 польскі злоты	1031,42
1 расійскі рубель	90,62
1 украінская грыўня	451,71

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	23,3278
10 UAH	50,0328
1000 BYR	11,0245
EUR	36,7203

Курс у гандлёвых кампаніях (на 29.07.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

Кампетэнтны суразмоўца

І РЭЦЫДЫВІСТАМ ПАТРЭБНА ДАПАМОГА...

Летась у нашай краіне амаль палова ўсіх злачынстваў была здзейснена раней судзімымі грамадзянамі. Як аказалася, людзі, якія ўжо караліся, яшчэ раз пераступаюць межы закона з-за таго, што на іх жыццё, учынкі і ўвагуле на іх лёс не звяртаюць увагі. Проста кажучы, яны аказаліся «за бортам» грамадства. Аб тым, што рабіць, каб колькасць рэцыдыўных і ўвагуле паўторных злачынстваў паменшылася, аб іх наступствах і прычынах, а таксама як трэба працаваць з гэтымі асобамі, карэспандэнт газеты вядзе гутарку з Салаўду МАГАМАДАВЫМ, начальнікам аддзела па наглядзе за дазнаннем у органах унутраных спраў Генеральнай пракуратуры.

— Салаўду Абдул-Рашыдавіч, няўжо так востра стаіць праблема паўторных злачынстваў у Беларусі?

— Рэцыдыўныя злачынствы заўсёды былі ў полі зроку органаў унутраных спраў, пракуратуры. Яны пастаянна хвалююць нас, мы прымаем меры для барацьбы з імі, бо колькасць такіх злачынстваў расце з кожным годам. Найбольш дрэннае становішча ў Гродзенскай, Мінскай, Віцебскай абласцях. Гэтай катэгорыяй сёлета ўчынена 403 забойствы, у 2001 годзе гэтая лічба была роўная 360. Наўмыснае прычыненне цяжкіх цялесных пашкоджанняў — 777, рабаўніцтвы — да 3000...

— А што можна сказаць пра сельскую мясцовасць?

— Там гэта ўвогуле надзвычайная праблема. Напрыклад, колькасць рабаўніцтваў, якія здзейснілі рэцыдывісты, вырасла з 7500 да 22 000.

— У чым прычына праблемы, і хто ў першую чаргу павінен ёй займацца?

— Па рэспубліцы 81 працэнт асобаў, прыцягнутых за здзейсненне паўторных злачынстваў (рэцыдыў больш вузкае азначэнне), не працуюць. Больш за палову з іх у момант злачынства былі ў стане алкагольнага ап'янення, таксама каля 50 працэнтаў дзейнічалі ў складзе групы. Генеральная пракуратура правяла вялікую работу, мы распрацавалі планы, у якіх усталявалі, чаму колькасць злачынстваў расце. Высветлена, што асноўная прычына росту рэцыдыўнага злачынства — адсутнасць у органах унутраных спраў добра наладжанай сістэмы прафілактыкі. Больш за 90 працэнтаў тых, хто выйшаў з месцаў пазбаўлення волі, не падпадаюць пад нагляд органаў унутраных спраў. Між тым трэба...

— ...і што трэба рабіць?

— ..трэба ўсталяваць такі прэвентыўны нагляд, які б ахопліваў масу асобаў, схільных да рэцыдыву, а таксама тых, якія падпадаюць пад гэтыя патрабаванні фармальна. Растлумачу, што прэвентыўны нагляд — той, які ўстанаўліваецца ў дачыненні да асобы, якая вызваліўся з месцаў пазбаўлення волі, па ініцыятыве адміністрацыі ўстановы ці органаў унутраных спраў, калі бачна, што чалавек на шлях выпраўлення не стаў. Нагляд прызначаецца спецыяльна судом. Ён можа быць усталяваны па месцах знаходжання грамадзяніна па-за яго домам, у нейкіх канкрэтных месцах, дзе ёсць спакуса ўжыць, напрыклад, алкагольныя напоі. Нагляд вядзецца, калі чалавек працягнае весці антыгромадскі лад жыцця.

— Напэўна, гэта штодзённая работа міліцыянераў?

— Па выніках праверак мы выявілі, што прафілактычная работа органамі правапарадку вядзецца слаба. Асноўная маса людзей застаецца без увагі. Мы ўбачылі, што органы ўнутраных спраў з момантам вызвалення грамадзяніна мала кантралявалі іх у працоўным і бытавым уладкаванні. Прычына росту рэцыдыўных злачынстваў у тым, што адсутнічае дасканаласта сістэма кантролю, якая дазваляла б бачыць і адсочваць, ці ёсць у чалавека сродкі да існавання, чым ён іх здабывае. Ці пайшоў ён ранейшым шляхам або выпраўляецца, дзе ён жыве, з якімі праблемамі сустракаецца ў час адаптацыі, і чым неабходна дапамагчы.

— Напэўна, не толькі гэта праблема органаў унутраных спраў?

— Безумоўна. Цяпер Генеральнай пракуратурай робіцца шэраг мераў для таго, каб скаардынаваць больш шырока ўдзельнічаць у прафілактыцы. Будзе заключана пагадненне аб ўзаемадзеянні МУС, Генеральнай пракуратуры і БРСМ у прафілактыцы правапарушэнняў сярод моладзі. Мы будзем выкарыстоўваць патэнцыял і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Іх мэты дазваляюць удзельнічаць у такіх мерапрыемствах.

— Што паказалі вынікі праверак?

— Генпракурор асабіста сустракаўся з людзьмі, каб даведацца, як яны жывуць пасля вызвалення. Пасля гутаркі высветлілася, што ў некаторых з іх ёсць праблемы з працаўладкаваннем і рэгістрацыяй. Частка асобаў, якая адбыла пакаранне, наўмысна не займаецца грамадска карыснай работай, перабіваецца выпадковымі заробкамі, знаходзіць працу, на якой няма дысцыпліны, дзе не трэба стаяць ля станка, дзе можна ў стане алкагольнага ап'янення дзень правесці — і нічога. Мы выявілі, што ў дачыненні да гэтай катэгорыі эфектыўнасць мерапрыемстваў недастатковая. Прафілактычныя гутаркі, кантроль за станам жыцця вельмі небяспечнага чалавека не праводзіліся. Не практыкуюцца гутаркі з роднымі асуджаных. А можна было б даведацца, чым чалавек займаецца. Былі выпадкі, калі крымінальна-выканаўчыя інспекцыі ўвогуле не мелі даных пра месца працы асуджаных, іх знаходжанне. У выніку прыходзім да лічбы — 90 працэнтаў былых асуджаных застаюцца «па-за кадрам».

— Дык яны выйшлі на волю. Кантроль з боку праваахоўных органаў — гэта не абмежаванне?

— Гэты кантроль не скіраваны на прыцясненне такой групы асобаў. Наадварот. Ён павінен садзейнічаць таму, каб людзі працавалі, каб ім было дзе жыць. Мы арыентуем органы ўнутраных спраў, каб грамадзяне, якія прыйшлі з месцаў пазбаўлення волі, маглі на першасным этапе разлічваць на дапамогу выканаўчых і распарадчых мясцовых органаў. А калі бачна, што чалавек сапраўды працуе, плаціць выпраўляцца, у яго няма праблем — няма сэнсу ажыццяўляць кантроль. А тыя, хто будзе мяняць месцы работы, будзе п'янстваваць, пойдзе здабываць сродкі на далейшае жыццё злачынным шляхам.

— З іншага боку, не ўсе гэтыя людзі хочуць ісці працаваць. Як з імі быць?

— Сапраўды, такіх дастаткова. Трэба кантраляваць і прадухіляць іх злачынныя дзеянні. Трэба, каб гэтая справа вялася сістэмна і пастаўлена была шырока і дасканала. Гвалтоўна на работу ніхто не зможа прывесці. Але ў нашым заканадаўстве можна знайсці адказы — як працаваць з такімі асобамі, каб прадухіліць іх паўторныя злачынствы...

— Дык былым зняволеным, вядома, не вельмі хочуць працоўнае месца прадастаўляць...

— У нас дзяржаўныя органы занятасці прапануюць пэўны працэнт браніраваных для асуджаных месцаў працы. У рэспубліцы дзейнічаюць цэнтры, якія прадастаўляюць часовае месца жыхарства і паслугі па рэабілітацыі. Ёсць людзі, якія ў цэнтрах рэсацыялізацыі жывуць і год, і больш. Але месцаў такіх не так шмат, як хацелася б...

Прынамсі, дапамогу з атрыманнем пашпарта, з рэгістрацыяй дзяржава заўсёды аказа.

— Калі чалавек учыніў эканамічнае злачынства, прафілактычныя меры прэвентыўнага кантролю, напэўна, не дадуць выніку?

— Так, трэба дзейнічаць іншымі шляхамі. Напрыклад, у некаторых прысудах ужо закладваецца, што грамадзянін не можа займаць пэўныя пасады, якія звязаны з кіруючымі функцыямі...

— А не складзецца сітуацыя, калі мы будзем выхоўваць утрымanцаў? Выйшаў з месца пазбаўлення волі — атрымай і работу, і жыллё, і грошы. І будзем бегаць за імі і ўгаворваць яшчэ?

— Калі ў чалавека ёсць жаданне працаваць, жыць за свае сродкі, у Беларусі ён знойдзе сваё месца. Ці мала працоўных рук, якія патрабуюцца ў сельскай мясцовасці? Іншая справа, калі грамадзянін, які адбываў пакаранне, пачынае перабіраць — не падабаецца адна работа, падавайце яму іншую. Мы прадугледжваем свае крокі, каб не атрымалася такім чынам. І, папярэдзу на будучае, каб не ствараўся такі настрой у каго-небудзь, быццам бы вызваліўся — і амаль герой. Не! Дапамагаць будуць людзям, якім гэта сапраўды патрэбна, а ўтрымліваць за кошт дзяржавы нікога не збіраемся.

Гутарыў Дзмітрый АЛЬФЕР.

«КОЖНАЕ НОВАЕ ПАВЫШЭННЕ ЦЭНАЎ У КРАІНЕ БУДЗЕ ЎЗВАЖАНЫМ...»

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Прычым праграма ўключае не толькі задачы па павелічэнні вытворчасці, але і ахоплівае меры эканамічнага стымулявання і фінансавага забеспячэння, абароны айчынных спажыўцоў, развіццё інфраструктуры таварных рынкаў і накіравана на павышэнне канкурэнтаздольнасці беларускіх тавараў. Між іншым, плануецца, што гэты дакумент будзе ўзгоднены і зацверджаны на працягу бліжэйшых двух тыдняў.

Першы віцэ-прэм'ер станоўча ацаніў тое, што ў студзені—маі рэнтабельнасць прадукцыі, што выраблялася, дасягнула 17,8 працэнта пры прагнозе 13 працэнтаў. «Задача ўсіх органаў кіравання і дырэктарскага корпуса — праца па паляпшэнні эканамічнай устойлівасці, росце эфектыўнасці, галоўным вымяральнікам якой з'яўляецца рэнтабельнасць вырабленай прадукцыі», — падкрэсліў Уладзімір Сямашка. І патлумачыў, што забеспячэнне росту рэнтабельнасці дазволіць у некаторай ступені кампенсаваць рост цэнаў на энерганосьбіты ў наступным. Паводле яго слоў, на сёння няма яснасці па цэнах на расійскія энерганосьбіты на 2009 год. «Калі сцэнарный будзе песімістычным, то рэнтабельнасць нашых прадпрыемстваў акажацца тым найважнейшым дэмпферам, які дазволіць вытрымаць удар цэнаў на энерганосьбіты», — зазначыў ён.

Радуе Урад і тое, што ўсе міністэрствы, канцэрны і рэгіёны справіліся з даведзенымі паказчыкамі па энергазберажэнні. Энергаёмістасць ВУП з пачатку года знізілася на 6,3 працэнта пры заданні на паўгоддзе мінус два працэнты. За пяць месяцаў гэтага года ўдалося эканоміць 12,3 мільёна тон умоўнага паліва. «Мы павялічылі ВУП больш як на 10 працэнтаў практычна без павелічэння спажывання энергарэсурсаў», — заўважыў першы віцэ-прэм'ер. Забяспечаны таксама паказчык і па знікненні матэрыялаёмістасці. Пры плане зніжэння гэтага паказчыка на 1,5 працэнта фактычна ён знізіўся на 2 працэнты.

Асаблівую ўвагу Уладзімір Сямашка надаў рэалізацыі інвестыцыйных праграм. Для ўзмацнення інвестыцыйнай прывабнасці краіны, разняволення дзелавой ініцыятывы, узгадаў ён, прыняты дзесяткі дзяржаўных актаў. Што дало і добрыя вынікі. Першы віцэ-прэм'ер назваў «сур'ёзным рухам наперад» павелічэнне на 23,9 працэнта інвестыцый у асноўны капітал з улікам высокай базы папярэдніх гадоў. Асаблівасцю ж сёлетняга інвестыцыйнага працэсу стаў апераджальны рост інвестыцый у невытворчую сферу. Асноўнымі крыніцамі інвестыцый заставаліся ўласныя сродкі арганізацый — 42,2 працэнта ад агульнага аб'ёму. Паскоранымі тэмпамі расце і доля замежных крыніц. Паводле звестак, што прагучалі на пасяджэнні, рост замежных інвестыцый за паўгоддзе склаў 280 працэнтаў, аднак іх удзельная вага застаецца пакуль невысокай — толькі 1,4 працэнта. У асноўны капітал з замежных крыніц у студзені-чэрвені накіравана 233,4 млн долараў.

А вось тэндэнцыі росту тэмпаў фарміравання адмоўнага сальда знешняга гандлю Беларусі істотна замарудзіліся: за красавік яно павялічылася на 400 мільёнаў долараў, за май — на 214 мільёнаў. Як удакладніў Уладзімір Сямашка, за пяць месяцаў сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі склала мінус 840,5 мільёна долараў. Аб'ём знешняга гандлю за студзень—май узрос на 56,2 працэнта, у тым ліку экспарт — на 58,4, імпарт — на 54,1 працэнта. Першы віцэ-прэм'ер адзначыў, што на фарміраванне адмоўнага сальда ў найвышэйшай ступені ўплывае гандаль прамежкавымі таварамі і спажывецкімі. Гаворачы пра павелічэнне экспарту, ён звярнуў увагу на тое, што адбылося гэта ў многім за кошт паставак калійных угнаенняў, цана на якія істотна выросла. Акрамя таго, рэспубліка нарасціла экспарт тракторaў, грузавых аўтамабіляў, харчовых тавараў, у прыватнасці, цукру, малака, ялавічыны, сыру, масла. Па выніках года адмоўнае сальда не павінна перавысіць 1,4 млрд долараў. Каб вытрымаць гэты прагноз, у краіне рэалізаваны дадатковыя меры, павялічаны прагнозны тэмп росту экспарту ў цэлым па рэспубліцы да 120 працэнтаў.

Параўноўваючы паказчык інфляцыі ў Беларусі і суседніх краінах, Уладзімір Сямашка паведаміў, што ў Беларусі за першае паўгоддзе яна склала 7,3 працэнта, у Расіі — 8,7, ва Украіне — 15,5 працэнта. Прычым асноўнымі прычынамі яе росту ён лічыць знешнія фактары — суседнія тэндэнцыі падаражання энергарэсурсаў і харчавання. А вось больш нізкая ў параўнанні з іншымі дзяржавамі інфляцыя ў Беларусі, на яго думку, сведчыць на карысць устойлівасці айчыннай эканомікі. Між іншым, з агульнага прыросту інфляцыі ў нашай краіне 3,4 працэнта прыходзіцца на прырост цэнаў на харчаванне і 2,2 працэнта на павелічэнне тарыфаў на жыллёва-камунальныя паслугі. Што датычыцца далейшага росту цэнаў, то першы-віцэ-прэм'ер запэўніў: «Кожнае новае павышэнне цэнаў, будзе максімальна ўзважаным, прадуманым і не будзе мець сацыяльна небяспечнага характару».

Зразумела, не толькі цэны, але і заробкі людзей не будуць стаяць на месцы. Ужо ў снежні сярэднямесячная зарплата павінна скласці 966 тысяч рублёў (460 долараў у эквіваленце), у тым ліку ў бюджэтнай сферы — 903 тысячы (430 долараў). У студзені—чэрвені намінальная налічаная сярэднямесячная зарплата склала 817,3 тысячы рублёў, павялічыўшыся на 23,8 працэнта ў параўнанні з адпаведным леташнім перыядам. У чэрвені гэты паказчык дасягнуў 892,4 тысячы (418,8 долара). Уладзімір Сямашка ўзгадаў, што зарплата работнікаў арганізацый прамысловасці ў чэрвені склала 469,7 долара ў эквіваленце, будаўніцтва — 553,3, транспарту — 474,6, сувязі — 454 долары. У бюджэтнай сферы сярэднямесячная зарплата ў першым паўгоддзі ў параўнанні з аналагічным перыядам 2007 года павялічылася на 14,8 працэнта да 684,5 тысячы рублёў, у тым ліку ў чэрвені да 744 тысячы рублёў (349,1 долара). Рэальная зарплата ўзрасла на 8,4 працэнта.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

Беларусы змогуць карыстацца спрошчаным рэжымам транзіту праз Балгарыю

Грамадзяне трэціх краін, у тым ліку беларусы, могуць праехаць транзітам праз Балгарыю пры пэўных умовах бясплатна. Замежныя грамадзяне могуць перасякаць тэрыторыю Балгарыі без балгарскай транзітнай візы, калі яны маюць візу або адзін з дакументаў, выдадзеных дзяржавамі — членамі Еўрапейскага саюза, якія ў поўным аб'ёме прымяняюць нормы шэнгенскага заканадаўства. Размова ідзе аб каротказтэрміновай і доўгатэрміновай шэнгенскіх візах, дазволе на пражыванне.

Не трэба плаціць за транзіт па балгарскай тэрыторыі і тым, хто мае сапраўдную каротказтэрміновую, доўгатэрміновую візу або сапраўдны дазвол на пражыванне, выдадзеныя Кіпрам. Каб трапіць на Кіпр або ў адну з краін Шэнгенскага пагаднення, дастаткова мець сапраўдную візу гэтых дзяржаў. У гэтым выпадку транзітны дакумент праз Балгарыю, а таксама Румынію афармляць не трэба.

БЕЛТА.

З першых вуснаў

«МІРНЫ АТАМ»: БЯСПЕЧНА, ВЫГАДНА, ЭКАЛАГІЧНА...

Днямі Беларусь накіравала міжнародным профільным арганізацыям і краінам-суседкам афіцыйнае паведамленне аб намеры нашай дзяржавы будаваць на сваёй тэрыторыі атамную электрастанцыю сумарнай магутнасцю 2000 МВт з увядзеннем першага энергаблока ў 2016 годзе. Гэта вельмі важны крок на шляху да павышэння рэйтынгу нашай краіны на міжнароднай арэне. Беларусь афіцыйна заявіла, што збіраецца далучыцца да развітых краін свету, якія валодаюць самымі сучаснымі тэхналогіямі атрымання энергіі.

— Арганічныя энергарэсурсы на Зямлі вельмі хутка скончацца, — тлумачыць непазбежнасць развіцця атамнай энергетыкі **заслужаны дзеяч навукі Беларусі акадэмік Алег МАРТЫНЕНКА.** — Запасаў нафты ў свеце засталося толькі на 35 гадоў, прыроднага газу — на 70 гадоў (улічыце, што газ — вельмі карысная сыравіна для хімічнай прамысловасці і проста спальваць яго — вельмі нерацыянальна). Перад чалавецтвам паўстала сур'ёзная праблема — за кошт якіх альтэрнатыўных энергакрыніц яно зможа забяспечваць сабе камфортнае існаванне, жыццядзейнасць прамысловасці і сельскай гаспадаркі?

> Паводле прагнозаў МАГАТЭ, сусветныя патрэбы ў энергіі да 2050 года ўзрастуць у 3-4 разы, пры гэтым магутнасці атамных электрастанцый свету павялічацца прыблізна ў 14 разоў.

Аналіз паказаў, што акрамя атамнай энергетыкі іншай дастойнай альтэрнатывы няма. Немагчыма назваць ні адной энергакрыніцы, якая магла б даць такія аб'ёмы энергіі, якія сёння неабходны чалавецтву. Выбар атамнай энергетыкі — заканамерны. Аднак паралельна з нарошчваннем магутнасцяў АЭС людзі павінны выражаць і дзве спадарожныя задачы: паніжаць энергаёмістасць і энергазатратнасць усіх тэхналагічных працэсаў і максімальна эфектыўна выкарыстоўваць альтэрнатыўныя энергакрыніцы: сонца, паветра, геатэрмальныя і гідрарэсурсы.

Для Беларусі — па прычыне асаблівасцяў рэльефу і геаграфічнага месцаразмяшчэння — усе вышэйпамянёныя альтэрнатыўныя крыніцы не вырашаць праблемы энергазабеспячэння магутных вытворчасцяў. Самыя рэальныя для нас энергарэсурсы — лес і торф. Гэта добрая падтрымка буйной энергетыкі. Мы павінны зрабіць усё для максімальна эфектыўнага выкарыстання такога багацця. Нездарма кіраўнік нашай дзяржавы паставіў задачу выйсці на 25 працэнтаў забеспячэння ўласных энергапатрэбаў за кошт мясцовых відаў паліва.

— Аднак застаюцца яшчэ 75 працэнтаў...

— Якія мы з часам пакрыем свайм «атамам». Згодна з нашымі прагнозамі, да 2050 года тэмпы развіцця атамнай энергетыкі ў свеце ўзрастуць. Яе доля ў агульным сусветным энергабалансе будзе складаць прыблізна 50—60 працэнтаў. Сёння гэты паказчык крыху перавышае 16 працэнтаў. У Францыі атамныя электрастанцыі забяспечваюць 78 працэнтаў усёй вырабляемай электраэнергіі. У Швецыі — 50 працэнтаў, у Паўднёвай Карэі — 38, у Германіі і Японіі — 30, у Вялікабрытаніі і ЗША — 20 працэнтаў. Цяпер новы рэактар будуе Фінляндыя, ставіць пытанне аб будаўніцтве АЭС Польшча і Літва.

Паводле прагнозаў МАГАТЭ, сусветныя патрэбы ў энергіі да 2050 года ўзрастуць у 3-4 разы, пры гэтым магутнасці атамных электрастанцый свету павялічацца прыблізна ў 14 разоў. На сёння ў свеце будуецца 26 новых блокаў. Толькі Кітай у бліжэйшай перспектыве плануе пабудаваць у сябе 40 новых блокаў. Акрамя таго, у наступныя гады актыўна будзе развівацца атамная энергетыка Расіі, Індыі, Паўднёвай Карэі, Украіны, Польшчы, Чэхіі, Італіі, Балгарыі, Славакіі, ЗША. Так, Індыя і Пакістан збіраюцца павялічыць вытворчасць атамнай электраэнергіі на сваіх АЭС у 10 разоў. Як бачыце, увесь свет разумее непазбежнасць развіцця атамнай энергетыкі.

> У параўнанні з дзеючымі рэактарамі, якія эксплуатуюцца сёння недалёка ад межаў Беларусі (на Ровенскай, Смаленскай, Ленінградскай АЭС і інш.), узровень надзейнасці рэактараў новага пакалення перавышае іх у дзесяць тысяч разоў!

— Адным з бясспрэчных плюсоў «мірнага атама» з'яўляецца яго экалагічнасць...

— Безумоўна. І гэта заслугоўвае ўвагі. У плане ўплыву на клімат і прыроду атамная энергетыка — самая экалагічна чыстая. Яе нельга параўноўваць з вугальнай ці мазутнай, якія даюць шмат шкодных выкідаў.

Увогуле, калі мы будзем разглядаць пытанне з пазіцыі пазітыўнага развіцця нашай цывілізацыі, то пераканаемся, што атамная энергетыка — гэта цалкам асэнсаваны і цвярозы крок на шляху да нармальнай забяспечанай будучыні чалавецтва.

— Першае патрабаванне, якое павінна выконвацца пры праектаванні, будаўніцтве і потым пры эксплуатацыі АЭС, — гэта гарантаванне бяспекі. Увогуле, наколькі бяспечныя атамныя рэактары?

— Бяспека атамнай энергетыкі ўжо даведзена да максімальных паказчыкаў. У параўнанні з дзеючымі рэактарамі, якія эксплуатуюцца сёння недалёка ад межаў Беларусі (на Ровенскай, Смаленскай, Ленінградскай АЭС і інш.), узровень надзейнасці рэактараў новага пакалення перавышае іх у дзесяць тысяч разоў!

— Значыць, можна спадзявацца, што і наш рэактар, які ўстановяць на першай беларускай АЭС, будзе мець такую ж высокую ступень бяспекі?

— Менавіта так. Ён будзе самым дасканалым у свеце. Мы зможам выбраць такі рэактар, які ўвогуле будзе пазбаўлены верагоднасці цяжкай аварыі. На маю думку, нам трэба выбраць менавіта расійскі рэактар. Улічыце, што Расія колькі гадоў працавала над развіццём сваёй атамнай індустрыі і няспынна ўдасканальвала канструкцыі атамных рэактараў, будавала рэактары ў Кітаі, у Іране, у Індыі, забяспечвала патрэбы свайго ваенна-марскога флота. Гэта краіна з велізарным вопытам у галіне рэактарабудавання. Акрамя таго, не трэба забывацца, што расійская канструкцыя вода-вадзянога рэактара прызнана адной з самых бяспечных у свеце. І яшчэ: для забеспячэння бяспекі падчас эксплуатацыі рэактара вялікае значэнне маюць кадры, прафесійная падрыхтоўка людзей, якія будуць працаваць на АЭС. Нам значна прасцей рыхтаваць сваіх спецыялістаў у Расіі, а не на Захадзе, скажам, у Францыі, ці Канадзе. На мой погляд, выбар расійскага рэактара з'яўляецца для Беларусі аб'ектыўнай заканамернасцю.

Аднак чым больш мы прамарудзім з заказам, тым больш склада нам будзе будаваць АЭС. Я ўжо агучыў лічбы, як будзе развівацца атамная энергетыка ў свеце ў бліжэйшыя гады. Магутнасці Расіі не бязмежныя. А кантракты, якія будуць прапаноўваць ёй той жа Кітай, ці Індыя, могуць быць больш выгаднымі за наш. Акрамя таго, рост попыту абумовіць павышэнне цаны.

— Развіццё атамнай энергетыкі ў асобна ўзятай краіне патрабуе наяўнасці адпаведнага заканадаўчага падмурка на нацыянальным узроўні. Як склалася сітуацыя з нарматыўнай базай у нас?

— У Беларусі гэтае пытанне цяпер актыўна прапрацоўваецца. У аснову ўсіх нашых падыходаў пакладзены распрацаваныя МАГАТЭ заканадаўчыя акты, якія ўжо існуюць у свеце і з'яўляюцца асноватворнымі ва ўсіх пытаннях тэхнічнага і грамадзянскага аспектаў, падрыхтоўчага і эксплуатацыйнага перыядаў. Усе нашы крытэрыі ацэнкі размяшчэння АЭС, патрабаванняў да пляцоўкі, да будаўніцтва, да эксплуатацыі і выкарыстання мы грунтуем на ўжо выпрацаваных чалавечай супольнасцю патрабаваннях да атамнай энергетыкі. Пры гэтым мы не робім сабе ніякіх паслабленняў і скідак. Таму можна смела сцвярджаць, што беларускае заканадаўства будзе максімальна карэліравана з тымі міжнароднымі актамі, якія сёння існуюць у гэтай галіне ў свеце. Спецыяльная група экспертаў зараз займаецца адаптацыяй міжнародных актаў да нашых нацыянальных умоў. На момант увядзення ў эксплуатацыю першага блока беларускай АЭС уся заканадаўчая база будзе падрыхтавана.

— Як плануецца ўтылізаваць ядзерныя адходы, якія з часам назапасяцца на беларускай АЭС?

— Па-першае, іх атрымаецца не так і шмат. Па-другое, тэрмін службы атамнай станцыі — 50 гадоў. Да таго часу гэта ўжо будуць не адходы, а вельмі каштоўная сыравіна для атрымання новага паліва. У адпаведнасці з міжнароднымі актамі, краіна, якая будуе рэактар, абавязана вырашыць пытанне і з утылізацыяй адходаў (вывазу ці захавання). Расія прыняла на сябе абавязкі перад сусветнай супольнасцю, што яна прымае на сваю тэрыторыю адходы ЛЮБЫХ атамных станцый. Гэта вельмі мудрая і дальнабачная палітыка. Вучоныя свету цяпер плённа працуюць над развіццём тэхналогіі перапрацоўкі і другаснага выкарыстання ядзерных адходаў. Магу сказаць, што ў прынцыпе праблемы з радыеактыўнымі адходамі няма. На той час, калі яны ў нас назапасяцца, яны будуць лічыцца дэфіцытнай сыравінай.

Увогуле, мне хацелася б падкрэсліць, што атамная энергетыка ў Беларусі будзе актыўна развівацца. Першы крок у гэтым накірунку ўжо зроблены. Мы сталі на шлях нарошчвання самага тэхналагічнага, самага сучаснага спосабу атрымання электраэнергіі, які сёння існуе ў свеце. Гэта, безумоўна, зменіць і само аблічча нашай краіны. Беларусь зойме дастойнае месца сярод перадавых краін свету.

Гутарыла Інга МІНДАЛЁВА.

Пол Гарднер пакідае мінскае «Дынама» з-за праблем у сям'і і дрэннага самаадчування

Аб гэтым, каментуючы адстаўку настаўніка, паведаміў генеральны дырэктар клуба Уладзімір Ганчароў.

«Ёсць некалькі прычын, па якіх мы вымушаны спыніць супрацоўніцтва з Полам Гарднерам. Адна з іх — гэта тое, што да яго не зможа далучыцца жонка, якая на мінулым тыдні была прааперыравана ў ЗША. А сам Гарднер з-за дрэннага самаадчування ў мінулую пятніцу не мог паўнавартасна правесці трэніроўку — у яго падскочыў ціск», — патлумачыў Уладзімір Ганчароў. Акрамя таго, як паведаміў гендырэктар «Дынама», Пол Гарднер у гутарцы з ім прызнаўся, што ў настаўніка ёсць адчуванне, што стыль яго работы не ўспрымаецца камандай. «Праўда, Пол не ўдакладніў, кім яго стыль не ўспрымаецца — ігракамі або калегамі па трэнерскім штабе», — сказаў Уладзімір Ганчароў.

«З улікам усіх гэтых акалічнасцяў было прынята рашэнне аб адстаўцы Пола Гарднера. І ўжо з вечара 28 ліпеня пачалася работа па пошуку замены Гарднера. Мы аднавілі сувязь з кандыдатамі, з якімі вялі перамовы да назначэння Гарднера. Гатыя людзі гатовыя працаваць. Усе яны — паўночнаамерыканскія спецыялісты», — удакладніў генеральны дырэктар. Што датычыцца кантракта Пола Гарднера, які быў падпісаны на адзін год з магчымасцю працягу супрацоўніцтва яшчэ на адзін, то цяпер абмяркоўваецца пытанне аб выплаце настаўніку кампенсацыі ў сувязі з датэрміновым скасаваннем дагавора. Ігракі ж, якія падпісалі кантракты з «Дынама» і былі запрошаны па рэкамендацыі Гарднера, пакуль застаюцца ў камандзе. Выконваючым абавязкі галоўнага трэнера прызначаны былы форвард зборнай Беларусі Уладзімір Цыплакоў.

Сяргей ВІШНЕЎСКІ, БЕЛТА.

Абзац

■ Упраўленне Дэпартамента фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю па Мінскай вобласці і Мінску ўзбудзіла крымінальную справу ў дачыненні да шэрагу службовых асобаў прыватнага прадпрыемства «Кантыненталінвестментс», якое з'яўляецца афіцыйным дылерам аўтамабіляў «Сузукі», паведамілі ў прэс-службе КДК.

■ Адным з месцаў у гарадскім пасёлку Карма, дзе хто-ніхто з моладзі бавіць час, з'яўляецца тэрыторыя рынку. І вось нядаўна там юнакі так расхадзіліся, такі гвалт учынілі, што патрабавалася ўмяшанне работніка міліцыі. Калі ж ён пачаў наводзіць парадак, навучэнец Чырвонабярэжскага сельскагаспадарчага каледжа пусціў у ход супраць яго... зубы. Ён так укусіў міліцыянера, што той звярнуўся па дапамогу да медыкаў.

■ Нетыповая крымінальная справа ўзбуджана Ленінскім РАУС Гродна. Падставай для гэтага сталі хуліганскія дзеянні непрацуючага 21-гадовага грамадзяніна. На перакрыжаванні бульвара Ленінскага камсамола і вуліцы Серафімовіча ён пашкодзіў дзве стойкі з дарожнымі знакамі «Саступі дарогу», «Дзеці», «Штучная няроўнасць» і «Абмежаванне максімальнай хуткасці» з таблічкай «Зона дзеяння».

■ У Прымор'і ўчора разбіўся знішчальнік Су-27 пры выкананні плавога палёту. Ён упаў за 12 км на поўнач ад Усурыйска. На яго борце знаходзіліся два пілоты. Адзін з іх загінуў, другі паспеў катапультавацца і выжыў. Самалёт здзяйсняў аблёт пасля правядзення заводскіх рамонтных работ.

■ У Маскве забітыя два інкасатары Ашчадбанка. Учора раніцай на іх напалі рабаўнікі. Адкрыўшы страляніну на ажыўленай вуліцы, злачынцы паранілі таксама чатырох выпадковых прахожых. Адстрэльваючыся, адзін з інкасатараў параніў нападаўшага. Саўдзельнік кінуў параненага і знік. Па некаторых звестках, скрадзеная сума складае ўсяго тысячу еўра.

■ Згодна з даследаваннем, праведзеным лонданскім аддзяленнем кансалтынгавай фірмы Mercer, даражэй за ўсё кубак кавы каштуе ў Маскве. Тут яго кошт складае ў сярэднім 10 долараў 19 цэнтаў. Астатняя Еўропа таксама не вызначаецца нізкімі коштамі: у Парыжы за кубак кавы давядзецца выкласці 6 долараў 77 цэнтаў, у Афінах — 6 долараў 62 цэнты. Падарожнікам, якія не могуць абысціся без кафеіну, лепш адправіцца ў Паўднёвую Амерыку ці Афрыку: у Буэнас-Айрасе кава каштуе 2 долары 3 цэнты, а ў Іаганэсбургу — 2 долары 36 цэнтаў.

Поўны абзац

■ Ваенны пенсіянер з Новасібірска Юрый Бабін марыць усталяваць помнік капеечнай манеце. Матэрыял для манумента пенсіянер падрыхтаваў: ён сабраў больш за 5 мільёнаў капеечных манет агульнай вагой звыш 7,5 тоны. Цяпер ён залівае фундамент і будуе спецыяльнае памяшканне для захоўвання капеек, так як яны займаюць занадта шмат месца. Юрый Бабін пачаў збіраць капейкі адразу пасля перабудовы, скупляў іх у банках мяхамі, якія грузавікамі звозіў да сябе на падворак.

■ У МНС Алушты паступіў званок ад адпачывальніцы, якая знаходзілася ў раёне аўтамабільнага моста. Жанчына паведаміла, што на парапеце моста, на самым краі, на вышыні каля 25 метраў нерухома ляжыць чалавек. На месца прыбыло аддзяленне выратавальнікаў. Як аказалася, мужчына моцна спаў. Будзіць яго не сталі, так як апасаліся, што чалавек, прачнуўшыся, мог не ўтрымацца і зваліцца з 25-метровай вышыні. З дапамогай аўталесвіцы выратавальнікі падабраліся да спячага і абматалі яго вяроўкамі, ад чаго мужчына прачнуўся. Убачыўшы выратавальнікаў і сябе на агромністай вышыні, ён быў проста ў шоку. Ён зусім не памятаў, як апынуўся на месце, пералез праз парэнчы, спусціўся на 2 метры і заснуў на парапеце. Тлумачэнне адно: чалавек быў моцна п'яны, але імгненна працверазеў, калі аценіў сітуацыю. З дапамогай вяроўкі яго зацягнулі на мост пад апладысменты вялікай колькасці відавочцаў.

■ У Падольскім раёне Кіева на адрасе вул. Фрунзе, дом 20/22 размешчана трансфарматарная будка, у якой зарэгістравана 120 кампаній. На выніках падатковай праверкі ва ўкраінскай сталіцы было выяўлена 168 адрасоў, па кожным з якіх знаходзілася больш за 50 фірмаў, якія ў сапраўднасці там не знаходзіліся. Падатковая служба Кіева выявіла і рэкардсмена ў гэтай справе. У пакоі 414 дома 9 па вуліцы Гната Юры зарэгістравана 878 юрыдычных асобаў. Пры гэтым плошча памяшкання складае каля 14 квадратных метраў. Такім чынам, на кожнага зарэгістраванага там прадпрымальніка прыходзіцца каля паўтара сантыметра асабістай прасторы. Падстаўныя адрасы выкарыстоўваюцца для правядзення некалькіх аперацый, пасля якіх кампанія або знікае, або заняўляе аб банкруцтве.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Выбары-2008

АДМОЎ СТАЛА МЕНШ

Сёлета задаволена больш заяў на рэгістрацыю ініцыятыўных груп у параўнанні з мінулай кампаніяй

Перадвыбарная карціна досыць дынамічная — адзін этап змяняе другі. Вось завяршылася рэгістрацыя ініцыятыўных груп — тых, што будуць збіраць подпісы ў падтрымку патэнцыяльных кандыдатаў у дэпутаты. З 454 пададзеных заяў 23 не былі задаволены. Мы папрасілі Мікалая Лазавіка, сакратара ЦВК, даць ацэнку гэтаму этапу падрыхтоўкі да выбараў.

— Працэс рэгістрацыі ініцыятыўных груп прайшоў больш лаяльна і дэмакратычна, чым на папярэдніх выбарах, — рэзюмаваў ён, аргументаваўшы сваё меркаванне тым, што істотна знізілася колькасць адмоў у рэгістрацыі. — У мінулы раз адмоў было больш як 10 працэнтаў, на сёння ж — каля пяці працэнтаў. Адмаўляюць у асноўным у тых выпадках, калі грамадзянамі, якія падалі заявы на рэгістрацыю ініцыятыўных груп, былі парушаны патрабаванні заканадаўства.

Тым не менш, за кожным заяўнікам застаецца права абскардзіць рашэнне акруговай камісіі ў вышэйшай інстанцыі — Цэнтрвыбаркаме. На гэта нязгодным адводзіцца тры дні. Так што пярэчанняў можна чакаць яшчэ і сёння, аднак пакуль што незадаволеных рашэннем наконт сваёй заявы толькі пяцёра. Паводле прагнозаў Мікалая Лазавіка скаргаў будзе няшмат, ужо хоць бы таму, што нямнога і саміх адмоў. Тым не менш, усе такія пярэчанні абавязкова будуць разгледжаны на чарговым пасяджэнні ЦВК 31 ліпеня.

— З кожным выпадкам адмовы ў рэгістрацыі ініцыятыўнай групы, калі заяўнік нязгодны з рашэннем акруговай камісіі, мы будзем разбірацца дэталёва, — запэўніў Мікалай Лазавік.

Адпаведныя паўнамоцтвы ў Цэнтрвыбаркама ёсць — калі ён прызнае неабгрунтаваным рашэнне акруговай камісіі, то можа адмяніць яго і зарэгістраваць ініцыятыўную групу.

— У любым выпадку захоўваецца конкурс зарэгістраваных ініцыятыўных груп (іх 422) каля чатырох на адну выбарчую акругу, — падкрэсліў сакратар ЦВК. — Гэта прадугледжвае спабарнасць канкуруючых за дэпутацкі мандат на выбарах, якія маюць адбыцца.

Падчас пасяджэння Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў будзе разгледжаны і шэраг іншых пытанняў. У прыватнасці, вызначыцца парадак выкарыстання дзяржаўных СМІ пры падрыхтоўцы да правядзення выбараў.

— Адпаведная пастанова замацуе тое, якім чынам будзе прадастаўляцца эфірны час на тэлебачанні і радыё, а таксама вызначыць парадак публікацыі перадвыбарных праграм кандыдатаў у рэспубліканскіх газетах, — паведаміў Мікалай Лазавік.

Плануецца таксама прыняць пастанову аб Назіральным савеце па кантролі за захаваннем парадку і правілаў правядзення перадвыбарнай агітацыі ў СМІ. Фарміраванне гэтага экспертнага органа, паводле слоў Мікалая Іванавіча, стала традыцыйным у шэрагу апошніх выбараў.

— Гэта экспертны савет, які ацэньвае выступленні ў СМІ на прадмет наяўнасці ў іх парушэнняў дзеючага заканадаўства аб СМІ і выбарчага заканадаўства, — адзначыў спадар Лазавік. — У выпадку неабходнасці (магчыма, такая неабходнасць і не з'явіцца) ён будзе аналізаваць выступленні на прадмет утрымання ў іх паклёпу, абразы службовых асобаў і іншых кандыдатаў, заклікаў да нацыянальнай, расавай дыскрымінацыі і г.д. Такія экспертныя заключэнні Назіральнага савета з'яўляюцца рэкамендацыямі для прыняцця рашэння Цэнтрвыбаркамам.

На заўтрашнім пасяджэнні ЦВК будзе разглядацца і пытанне аб прыпісцы ўчасткаў для галасавання, утвораных за межамі Беларусі, да выбарчых акруг у сталіцы:

— Мяркуецца, што ўсе 40 выбарчых участкаў будуць прыпісаны да двух акруг Мінска. Якія канкрэтна акругі гэта будуць, вырашыцца падчас пасяджэння.

Нагадаем, што на тэрыторыі Беларусі сфарміравана 6485 выбарчых участкаў, з іх 287 — у стацыянарных лячэбных установах, 66 — у вайсковых часцях. Агульная іх колькасць крыху знізілася ў параўнанні з мінулымі выбарамі.

— Гэта звязана з дэмаграфічнымі зрухамі насельніцтва і змяненнем адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення, — патлумачыў сакратар Цэнтральнай камісіі. — Узбуйняюцца сельсаветы, аб'ядноўваюцца гарады і раёны.

Скажам, сёлета ў Віцебскай вобласці створана на дзве акругі менш, а ў сталіцы — на столькі ж больш. Гэта ж вызначыла і адпаведныя змяненні ў колькасці ўчасткаў.

НАЗІРАЛЬНІКАЎ АКРЭДЫТАВАЛІ

Місія СНД пачынае сваю работу на выбарах у Беларусі

Не менш важная перадвыбарная навіна звязаная на гэты раз не з завяршэннем, а з пачынаннем. Па сутнасці ўжо дадзены старт рабоце місіі міжнародных назіральнікаў ад СНД. Учора прайшла сустрэча кіраўніцтва ЦВК з групай прадстаўнікоў Выканкама СНД на чале са старшынёй выканаўчага камітэта СНД, выканаўчым сакратаром Сяргеем Лебедзевым.

— Галоўная мэта сустрэчы — вызначыць стандарты місіі міжнародных назіральнікаў СНД і дамовіцца аб іх узаемадзеянні з ЦВК у ходзе дзейнасці гэтай місіі, — паведаміў Мікалай Лазавік. — Мы падрыхтавалі ўжо адпаведныя пасведчанні для кіраўнікоў місіі. Можна сказаць, што яны атрымліваюць у Цэнтрвыбаркаме афіцыйную акрэдытацыю і прыступаюць да назірання за падрыхтоўкай выбараў у Беларусі.

Сакратар Цэнтральнай камісіі нагадаў і парадак работы міжнародных місій назіральнікаў.

— Яны звычайна заязджаюць у тры этапы. Першая група — штабная, яна вырашае пытанні размяшчэння, транспарту, сувязі. Другая група — доўгатэрміновыя назіральнікі — каля 40 — 50 чалавек, якія правядзяць маніторынг палітычнай сітуацыі, СМІ, ладзяць сустрэчы з кандыдатамі ў дэпутаты, аналізуюць усе этапы падрыхтоўкі да выбараў. Трэцяя — кароткатэрміновыя назіральнікі, іх будзе каля 300 чалавек, — прыязджае непасрэдна перад днём выбараў, назірае за працэсам галасавання і падвядзення вынікаў.

Паводле слоў Мікалая Лазавіка, для місіі СНД схема больш простая — ёй не трэба накіроўваць сваю штабную групу, паколькі Выканкам СНД мае сваю штаб-кватэру ў Мінску. І па сутнасці вось гэтая штабная група можа без дадатковых арганізацыйных мерапрыемстваў прыступіць да работы адразу ж пасля акрэдытацыі.

— Місія АБСЕ сваю штабную групу плануе накіраваць недзе ў 10-х чыслах жніўня, — адзначыў сакратар Цэнтрвыбаркама.

Нагадаем, што запрашэнні на выбары накіраваны таксама шэрагу парламенцкіх структур, а Цэнтральная камісія запрасіла сваіх калег з Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Малдовы, Расіі, Таджыкістана, Узбекістана, Украіны, Латвіі і Літвы.

Ала МАЧАЛАВА.

Акцыя

ІНСПЕКТАР ДАІ — СУПЕРГЕРОЙ, ДЗЕЦІ — ДЫСЦЫПЛІНАВАНЫЯ ПЕШАХОДЫ

Газета «Звязда» і Дзяржаўтаінспекцыя праводзяць сумесную акцыю, накіраваную на прафілактыку дзіцячага траўматызму на дарогах

Чарговая сустрэча з дзецьмі адбылася ў аздараўляльным лагеры «Сосны» Магілёўскага раёна. Супрацоўнікі Магілёўскай ДАІ арганізавалі для малых і падлеткаў цікавае мерапрыемства: гэта была, па сутнасці, вялікая гульня, якая вучыла іх бяспечным паводзінам на вуліцы і дарозе.

— Гэта акцыя нездарма праводзіцца летам: дзеці на канікулах, маюць зашмат вольнага часу і, на жаль, колькасць дарожна-транспартных здарэнняў з іх удзелам павялічваецца, — сказала начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды ДАІ УУС Магілёўскага аблвыканкама Вікторыя Жэўнер.

Сёлета у вобласці адбылося 32 аўтааварыі з удзелам дзяцей: 34 паранены і 1 хлопчык загінуў. ДТЗ са смяротным канцом адбылося ў Магілёўскім раёне: 12-гадовы хлопчык і яго маці сталі ахвярамі п'янага вадзіцеля, які не справіўся з кіраваннем і заехаў на пешаходную дарожку.

Гэта здарэнне — трагічны выпадак, калі абаранiцца ад збегу нешчаслівых абставінаў было немагчыма. Аднак у многіх іншых момантах дзецям, безумоўна, дапаможа веданне правілаў дарожнага руху для пешаходаў і веласіпедыстаў. Таму самым галоўным этапам на акцыі стаў экзамен на веданне ПДД.

Прадстаўнікі атрадаў адказвалі на пытанні білетаў. Лепшым знаўцам (а гэта пакуль 2 памылкі на 8 пытанняў — гэта значыць, што ёсць да чаго імкнуцца і трэба вучыцца далей) былі ўручаны прызы ад нашай газеты — фірмовыя чырвоныя бейсболкі з лагатыпам «Звязды» са святлоадбівальнай палоскай — флікерам.

Аксана, Наташа, Ігар і Міхаіл — каманда 2-га атрада «Анёльчыкі». Магілёўскія школьнікі, якім 15-16 гадоў, сёння ўжо мараць пра той час, калі ў

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

30 ліпеня 2008 г. № 28 (131)

МАЛАКОЛЬКАСНЫЯ СЕЛЬСАВЕТЫ СКАСУЮЦЬ

Сесія Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў прыняла рашэнне скасаваць Высакаборацкі сельсавет у Краснапольскім раёне.

У склад Высакаборацкага сельсавета ўваходзілі 8 населеных пунктаў, і цяпер яны ўвойдуць у склад суседняга Яноўскага сельсавета.

Такое рашэнне абгрунтавана невялікай колькасцю жыхароў Высакаборацкага сельсавета: на яго тэрыторыі цяпер жыве толькі 410 чалавек. Ідзе старэнне і выміранне вёсак. Да таго ж Краснапольскі раён моцна пацярпеў ад Чарнобыльскай аварыі, і ў постчарнобыльскія гады яго пакінулі тысячы чалавек.

— Што ж, калі трэба — то трэба, — пракаментаваў ліквідацыю Высакаборацкага сельсавета яго старшыня Аляксандр Васіленка. — Але мне ўсё ж здаецца, што гэтым усе праблемы не вырашыць. Напрыклад, жыхарам самай аддаленай вёскі Лешчанка да будучага цэнтра сельсавета аграгарадка Яноўка трэба ехаць болей за 20 кіламетраў. А ў гэтай вёсцы жывуць 40 чалавек, у асноўным — пенсіянеры.

У Высакаборацкім сельвыканкаме сёння працуюць два чалавекі — старшыня і сакратар. Старшыня, 28-гадовы малады чалавек з вышэйшай адукацыяй агранома, яшчэ не меркаваў сур'ёзна пра новае працаўладкаванне.

Кіраўніцтва аблсавета абяцае, што супрацоўнікам скасаванага сельсавета будуць прапанаваны працоўныя месцы, а ў Яноўскім сельсавеце ў сувязі з павелічэннем колькасці людзей і, адпаведна, аб'ёму працы, магчыма з'яўленне дадатковых штатных адзінак.

Ліквідацыю малакольскасна-га сельсавета ў Магілёўскам аблсавеце называюць «першай ластаўкай». Падобныя рашэнні могуць датычыцца Чэрыкаўскага, а потым і амаль усіх іншых сельскіх раёнаў вобласці.

— Гэты працэс нам не спыніць, і не трэба: сітуацыя сама выспела, — лічыць старшыня абласнога Савета Уладзімір Панцюхоў. — Напрыклад, на той жа Краснапольшчыне створана адна сельская гаспадарка на ўвесь раён. Праблемы тэрытарыяльнага будаўніцтва цесна звязаныя са стварэннем аграгарадкоў і ўзбуйненнем сельскіх гаспадарак. Але разам з гэтым, трэба крапатліва вывучаць кожны канкрэтны выпадак, каб не ўскладніць сітуацыю з жыццезабеспячэннем сельскіх жыхароў.

Паводле папярэдніх падлікаў, са 196 сельскіх Саветаў Магілёўскай вобласці да 2010 года павінны застацца толькі 150.

Ілона ІВАНОВА.

У ГОРКАХ ЗАСЕЛЕНЫ НОВЫ САЦЫЯЛЬНЫ ЖЫЛЫ ДОМ

Сучасны 40-кватэрны дом у раённым цэнтры пабудаваны за сродкі абласнога і рэспубліканскага бюджэтаў. Кватэры ў ім атрымалі людзі, якія стаялі ў чарзе на сацыяльнае жыллё.

Дзеці-сіроты, якія выраслі і сталі дарослымі людзьмі, занялі 30 кватэр. Астатнія засялілі інваліды, пацярпелыя ад Чарнобыля, сем'і з дзецьмі-інвалідамі, малазабяспечаныя пенсіянеры.

— Гэты дом узведзены ў раёне Акадэміі, у вельмі добрым месцы непадалёк ад возера, — паведаміў начальнік управлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Горацкага райвыканкама Іосіф Булаш. — Там створана безбар'ернае асяроддзе, зроблена добраўпарадкаванне. І людзі вельмі задаволеныя. Сёння да нас завітаў інвалід Вялікай Айчыннай вайны, які атрымаў кватэру ў сацыяльным доме: ён дзякаваў за клопат, а мы яго віншавалі з навасяллем.

Ілона ІВАНОВА.

ІШЛА НА 1 ГОД, ЗАТРЫМАЛАСЯ НА 13

Марыя ПАДАБЕД — старшыня Домжарыцкага сельскага Савета, на пасадзе гэтай ужо 13 гадоў. Вырасціла з мужам трох сыноў. Старэйшы Іван працуе ў запаведніку. Уладзімір — памочнік ляснічага ў Домжарыцах, заканчвае лесаінжынерны факультэт тэхналагічнага ўніверсітэта ў Мінску. Малодшы Эдуард вучыцца ў Лепельскім агратэхнічным каледжы.

Цудоўны зімовы сад пры школе.

Марыя Падабед — старшыня Домжарыцкага сельскага Савета.

— А ішла сюды часова, думала, ад сілы на адзін год, — успамінае Марыя Эдуардаўна, — пакуль знойдуць каго. І бач ты, прыкіпела! Не скажу, што ўсё лёгка давалася. Праблем хапае. Але ж іх трэба вырашаць.

Адметнасць сельскага Савета ў тым, што значная частка вёсак знаходзіцца на тэрыторыі Бярэзінскага запаведніка. З аднаго боку, гэтая акалічнасць вымушае больш строгага падыходу вяскоўцаў да прыродных, лясных угоддзяў. А з іншага — гэтыя мясціны вельмі прывабныя. Як гаворыць старшыня сельскага Савета, тут няма занядбаных хацін. Адразу ж знаходзяцца на іх спадкаемцы. Купіць зямельны ўчастак даволі праблематычна.

На тэрыторыі сельсавета 11 населеных пунктаў, 900 жыхароў — амаль палова з іх непрацуючыя пенсіянеры. На жаль, некаторыя вёсачкі дажываюць свой век. У Ніўках — адзін двор, Саўскім Бары — два, Ствольне — шэсць, Кветчы — 27 двароў. Сюды ды і ў іншыя невялічкія вёскі тры разы на тыдзень прыязджае аўтакрама, прывозіць неабходныя тавары, прадукты. Сёлета выдзелена новая машына, абсталяваная халадзільнікам. Так што цяпер вяскоўцы могуць заказаць свежы мясны фарш, паласавацца марожаным.

Домжарыцы — цэнтр сельсавета — маюць даволі моцную сацыяльную сферу. Ёсць Дом культуры, музычная школа, Дом ткацтва, бібліятэка, школа, на базе якой створаны экалагічны ліцэй, урачэбная амбулаторыя, аптэка. На жаль, відавочная праблема з медыцынскімі кадрамі. Мабыць, адсутнасць жылля нараджае адсутнасць медыцынскіх спецыялістаў. Праўда, два разы на тыдзень з Лепеля, з цэнтральнай раённай бальніцы, прыязджае на «хуткай дапамозе» урач-тэрапеўт, які аб'язджае пажылых адзінокіх вяскоўцаў, ветэранаў вайны, тых, каму патрэбна неадкладная дапамога. У іншыя дні едзе сюды фельчар. Адзін раз на тыдзень прыязджае стаматолаг.

Многія жыццёвыя праблемы дапамагае вырашаць кіраўніцтва Бярэзінскага запаведніка, сядзіба якога размешчана ў Домжарыцах. Вода- і газазабеспячэнне вырашаецца з дапамогай ранёных уладаў.

А яшчэ Марыя Эдуардаўна ўдзячная сваім лепшым памочнікам — вясковым старэйшынам. Кожны панядзелак яны абавязкова даводзяць да ведама старшыні ўсе праблемы, вострыя пытанні, якія датычацца жыцця вяскоўцаў.

— Асабліва хачу адзначыць 80-гадовага, але такога актыўнага і маладога душой, старэйшыну з вёскі Валова Гара Васіля Мікітавіча Акулёнка, — расказвае Марыя Падабед. — Хутка будзем адзначаць 70-гадовы юбілей і Таісы Васільеўны Аўтушкі — старэйшыны з Пераходцаў, а ўзяць бы Васіля Кірылавіча Кузьмічонка з Барсукоў, Надзею Аляксандраўну Юрагу з Рожна... Што б я рабіла без сваіх старэйшын! А іх у мяне дзесяць!

Марыя ЖЫЛІНСКАЯ.
Фота аўтара.

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ ДЗЯРЖАЎНАЙ АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ У НЯЎДАЛЫХ СЕМ'ЯХ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 12 снежня 2007 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 20 снежня 2007 года

Артыкул 1. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 21 чэрвеня 1991 года «Аб мерах прымусовага ўздзеяння ў дачыненні да хранічных алкаголікаў і наркаманаў, якія сістэматычна парушаюць грамадскі парадак або правы іншых асобаў» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, 1991 г., № 23, ст. 311; Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 69, 2/188) наступныя дапаўненні:

1. Пункт 1 дапоўніць часткай чацвёртай наступнага зместу:

«Непрацуючыя асобы, абавязаныя вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, што з'яўляюцца хранічнымі алкаголікамі або наркаманамі, у першачарговым парадку падлягаюць накіраванню ў лячэбна-працоўныя прафілакторыі.».

2. Пункт 6 дапоўніць часткай трэцяй наступнага зместу:

«Раённы (гарадскі) суд не пазней за наступны дзень пасля прыняцця пастановы аб накіраванні асобы ў лячэбна-працоўны прафілакторый, калі дзеці згаданай асобы застаюцца без апекі бацькоў, паведамляюць аб гэтым ва ўпраўленне (аддзел) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (аднаго з бацькоў) для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.».

3. У пункце 10:

частку другую дапоўніць чацвёртым сказам наступнага зместу: «Асобы, якія знаходзяцца ў лячэбна-працоўным прафілакторыі, абавязаныя вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, маюць права на працоўны водпуск працягласцю сем каляндарных дзён.»;

частку пятую дапоўніць другім і трэцім сказамі наступнага зместу: «Адміністрацыя лячэбна-працоўнага прафілакторыя за тры месяцы да заканчэння тэрміну знаходжання асобы, абавязанай вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, у выпадку неабходнасці яго працаўладкавання інфармуе аб гэтым суд, органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства гэтай асобы. У дзень вызвалення гэтай асобы адміністрацыя лячэбна-працоўнага прафілакторыя накіроўвае выканаўчы дакумент у суд па месцы жыхарства.»;

дапоўніць пункт часткай шостай наступнага зместу:

«Асобы, абавязаныя вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, якія падлягаюць працаўладкаванню, да месца жыхарства суправаджаюцца работнікам лячэбна-працоўнага прафілакторыя.».

Артыкул 2. Унесці ў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 11 студзеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 18 — 19, 2/13; 2003 г., № 133, 2/995; 2005 г., № 120, 2/1134; 2006 г., № 6, 2/1173; № 86, 2/1215; 2007 г., № 264, 2/1378) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. У артыкуле 47:

частку чацвёртую дапоўніць словамі «або па месцы знаходжання дзяцей на дзяржаўным забеспячэнні»;

пасля часткі чацвёртай дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Іск аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў можа прад'яўляцца істцом таксама па месцы знаходжання (жыхарства) дзіцяці, калі дзіця знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні.»;

частку пятую дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «Адміністрацыя лячэбна-працоўнага прафілакторыя за тры месяцы да заканчэння тэрміну знаходжання асобы, абавязанай вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, у выпадку неабходнасці яго працаўладкавання інфармуе аб гэтым суд, органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства гэтай асобы. У дзень вызвалення гэтай асобы адміністрацыя лячэбна-працоўнага прафілакторыя накіроўвае выканаўчы дакумент у суд па месцы жыхарства.»;

дапоўніць пункт часткай шостай наступнага зместу:

«Асобы, абавязаныя вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, што знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, якія падлягаюць працаўладкаванню, да месца жыхарства суправаджаюцца работнікам лячэбна-працоўнага прафілакторыя.».

Артыкул 2. Унесці ў Грамадзянскі працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 11 студзеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 18 — 19, 2/13; 2003 г., № 133, 2/995; 2005 г., № 120, 2/1134; 2006 г., № 6, 2/1173; № 86, 2/1215; 2007 г., № 264, 2/1378) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. У артыкуле 47:

частку чацвёртую дапоўніць словамі «або па месцы знаходжання дзяцей на дзяржаўным забеспячэнні»;

пасля часткі чацвёртай дапоўніць артыкул часткай наступнага зместу:

«Іск аб пазбаўленні бацькоўскіх правоў можа прад'яўляцца істцом таксама па месцы знаходжання (жыхарства) дзіцяці, калі дзіця знаходзіцца на дзяржаўным забеспячэнні.»;

частку пятую дапоўніць другім і трэцім сказамі

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ДАПАЎНЕННЯЎ І ЗМЯНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ ДЗЯРЖАЎНАЙ АБАРОНЫ ДЗЯЦЕЙ У НЯЎДАЛЫХ СЕМ'ЯХ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

9. У артыкуле 350:

у частцы другой словы «органам запісу актаў грамадзянскага стану» замяніць словамі «органам, які рэгіструе акты грамадзянскага стану,»;

частку трэцюю выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Рашэнне суда, якім устаноўлена няправільнасць запісу ў кнізе рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану, служыць падставай для выпраўлення такога запісу органамі, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану.».

10. У частцы першай артыкула 364:

у абзацы пятым:

словы «органамі запісу актаў грамадзянскага стану» замяніць словамі «органамі, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану»;

пасля слоў «асобе,» і «не супадаюць з» дапоўніць абзац адпаведна словамі «уласнае» і «уласным»;

у абзацы восьмым словы «органаў запісу актаў грамадзянскага стану» замяніць словамі «органам, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану,»;

у абзацы дзевятым:

пасля слова «рэгістрацыя» дапоўніць абзац словам «заключэння»;

словы «органах запісу актаў грамадзянскага стану» замяніць словамі «органах, што рэгіструюць акты грамадзянскага стану,».

11. У артыкуле 371:

частку другую пасля слова «прозвішча,» дапоўніць словам «уласнае»;

у частцы чацвёртай словы «орган запісу актаў грамадзянскага стану» замяніць словамі «орган, што рэгіструе акты грамадзянскага стану,»;

дапоўніць артыкул часткай пятай наступнага зместу:

«Суд не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння аб прызнанні грамадзяніна адсутным без вестак або аб аб'яўленні грамадзяніна памерлым, калі дзеці зганаднай асобы застаюцца без апекі бацькоў, павінны быць вырашаны пытанні працаўладкавання асобаў, якія не працуюць або працуюць, але не ў поўным аб'ёме вяртаюць на працягу шасці месяцаў расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, накіроўваецца судом па апошнім вядомым месцы жыхарства даўжніка і лічыцца патрэбным.».

12. Артыкул 372 пасля слоў «запісу» і «кнізе» дапоўніць адпаведна словамі «акта» і «рэгістрацыі».

13. Артыкул 375 дапоўніць часткай шостай наступнага зместу:

«Суд не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння аб прызнанні грамадзяніна абмежаванa дзеяздольным або недзеяздольным, калі дзеці зганаднай асобы застаюцца без апекі бацькоў, павінны быць вырашаны пытанні працаўладкавання асобаў, якія не працуюць або працуюць, але не ў поўным аб'ёме вяртаюць на працягу шасці месяцаў расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, накіроўваецца судом па месцы жыхарства папячыцеля ці камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (аднаго з бацькоў) для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.».

14. Частку першую артыкула 394 дапоўніць пунктам 13 наступнага зместу:

«13) заяўленa патрабаванне аб спагнанні з асобы, якая не працуе або працуе, але не ў поўным аб'ёме вяртае на працягу шасці месяцаў расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, або з асобы, месца жыхарства якой невядомае, расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні.».

15. У артыкуле 397:

пункт 2 часткі другой пасля слова «прозвішча,» дапоўніць словам «уласнае»;

дапоўніць артыкул часткай чацвёртай наступнага зместу:

«У пастанове аб судовым загадзе аб спагнанні расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, тэрмінам звыш 30 тыдняў, а таксама знаходжання на ўтрыманні асобы, абавязанай вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, дзіцяці (дзяцей) ва ўзросце да трох гадоў.».

19. Частку першую артыкула 491 дапоўніць пунктам 5 наступнага зместу:

«5) прадугледжаных пунктам 8 артыкула 490 гэтага Кодэкса, — да дасягнення дзіцем (дзецьмі), якія знаходзяцца на ўтрыманні асобы, абавязанай вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, трохгадовага ўзросту.».

20. Частку першую артыкула 493 дапоўніць пунктам 8 наступнага зместу:

«8) калі даўжнік, абавязаны вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, прызнаны недзеяздольным або не можа выконваць бацькоўскіх абавязкі па стане здароўя згодна з пералікам захворванняў, зацвярджаным Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з часткай трэцяй артыкула 93 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, на падставе заключэння ўрачэбна-кансультацыйнай камісіі, выдадзенага дзяржаўнай арганізацыяй аховы здароўя.».

21. У артыкуле 533:

у частцы другой словы «упраўлення юстыцыі абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта» замяніць словамі «галоўнага ўпраўлення, упраўленна (аддзела) юстыцыі абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта»;

у частцы сёмай словы «упраўлення юстыцыі абласных (Мінскага гарадскога) выканаўчых камітэтаў» замяніць словамі «галоўныя ўпраўленні, упраўленні (аддзелы) юстыцыі абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў».

Артыкул 3. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і ад 9 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 55, 2/53; 2004 г., № 195, 2/1097; 2005 г., № 120, 2/1134; 2006 г., № 122, 2/1261) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У тэксце Кодэкса словы «дзяржаўны орган, які рэгіструе акты грамадзянскага стану» і «Дзяржаўны орган, які рэгіструе акты грамадзянскага стану» замяніць адпаведна словамі «орган, які рэгіструе акты грамадзянскага стану» і «Орган, які рэгіструе акты грамадзянскага стану» ў адпаведных склоне і ліку.

2. У частцы першай артыкула 14 словы «мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў» замяніць словамі «раённых, гарадскіх выканаўчых камітэтаў і мясцовых адміністрацый раёнаў у гарадах».

3. Частку першую артыкула 66[1] выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Пры невыкананні або неналежным выкананні бацькамі або адным з іх, а таксама іншымі асобамі і арганізацыямі, якія прымаюць удзел у выхаванні і ўтрыманні дзяцей, сваіх абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзяцей, або злоўжыванні сваімі правамі, або адмоўным уплыве на паводзіны дзяцей, або жорсткім абыходжанні з імі дзеці маюць права звярнуцца па абарону сваіх правоў і законных інтарэсаў у камісіі па справах няпоўнагадовых, органы апекі і папячыцельства, пракуратуру, а пасля дасягнення чатырнаццаці гадоў — і ў суд.».

4. Артыкул 67 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 67. Неналежнае выхаванне і ўтрыманне дзяцей

Бацькі, а таксама іншыя асобы і арганізацыі, якія прымаюць удзел у выхаванні і ўтрыманні дзяцей, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь нясуць адказнасць за неналежнае выхаванне і ўтрыманне дзяцей.

Выхаванне і ўтрыманне дзіцяці прызнаюцца неналежнымі, калі не забяспечваюцца правы і законныя інтарэсы дзіцяці, у тым ліку калі дзіця знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

Пад сацыяльна небяспечным становішчам маецца на ўвазе абстаноўка, пры якой:

не задавальняюцца асноўныя жыццёвыя патрэбы дзіцяці (не забяспечваецца бяспека, нагляд і догляд дзіцяці, патрэбы дзіцяці ў ежы, жыллі, адзенні, атрыманні дзіцем неабходнай медыцынскай дапамогі, не ствараюцца санітарна-гігіенічныя ўмовы для жыцця дзіцяці і г.д.);

дзіця з-за беспрытульнасці і безнагляднасці ўчыняе дзеянні, якія ўтрымліваюць прыкметы адміністрацыйнага правапарушэння або злачынства;

асобы, якія прымаюць удзел у выхаванні і ўтрыманні дзіцяці, вядуць амаральны лад жыцця, што аказвае шкоднае ўздзеянне на дзіця, злоўжываюць сваімі правамі і (або) жорстка абыходзяцца з ім або іншым спосабам неналежна выконваюць абавязкі па выхаванні і ўтрыманні дзіцяці, у сувязі з чым маюць месца небяспека для жыцця або здароўя.».

5. Частку першую артыкула 80 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Бацькі або адзін з іх могуць быць пазбаўлены бацькоўскіх правоў у дачыненні да няпоўнагадовага дзіцяці, калі будзе ўстаноўлена, што:

яны ўхіляюцца ад выхавання і (або) утрымання дзіцяці;

яны злоўжываюць бацькоўскімі правамі і (або) жорстка абыходзяцца з дзіцем;

яны вядуць амаральны лад жыцця, што аказвае шкодны ўплыў на дзіця;

яны адмовіліся ад дзіцяці і падалі пісьмовую заяву аб згодзе на ўсынаўленне past ix асобным пражыванні з дзіцем;

на працягу шасцімесячнага тэрміну пасля адабрання ў іх дзіцяці па рашэнні камісіі па справах няпоўнагадовых раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы знаходжання дзіцяці не адпалі падставы для адабрання ў іх дзіцяці, указаныя ў частцы першай артыкула 85[1] гэтага Кодэкса.».

6. У частцы першай артыкула 81:

словы «камісія (інспекцыя) па справах няпоўнагадовых» замяніць словамі «камісія па справах няпоўнагадовых, інспекцыя па справах няпоўнагадовых»;

дапоўніць частку другім сказам наступнага зместу: «Іск аб пазбаўленні бацькоў (аднаго з бацькоў) бацькоўскіх правоў у выпадку, прадугледжаным часткай трэцяй артыкула 85[1] гэтага Кодэкса, прад'яўляецца ўпраўленнем (аддзелам) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе або ўстановай, у якой знаходзіцца дзіця, не пазней за пяць рабочых дзён пасля выяўлення адпаведнага рашэння камісіяй па справах няпоўнагадовых раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе.».

7. Назву артыкула 85 дапоўніць словамі «па рашэнні суда, органа апекі і папячыцельства».

8. Дапоўніць Кодэкс артыкулам 85[1] наступнага зместу:

«Артыкул 85[1]. Адабранне дзіцяці па рашэнні камісіі па справах няпоўнагадовых раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе

У выпадку, калі ўстаноўлена, што бацькі (адзіны з бацькоў) вядуць амаральны лад жыцця, што аказвае шкодны ўплыў на дзіця, з'яўляюцца хранічнымі алкаголікамі або наркаманамі або іншым спосабам неналежна выконваюць свае абавязкі па выхаванні і ўтрыманні дзіцяці, у сувязі з чым яно знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, камісія па справах няпоўнагадовых раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы знаходжання дзіцяці ў трохдзённы тэрмін прымае рашэнне аб прызнанні дзіцяці маючым патрэбу ў дзяржаўнай абароне, аб адабранні дзіцяці ў бацькоў (адзінага з бацькоў), устанаўленні яму статусу дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, аб змяшчэнні дзіцяці на дзяржаўнае забеспячэнне (дзіцяці (дзяцей) ва ўзросце да трох гадоў.».

Адабранне дзіцяці ажыццяўляецца на працягу дня, які ідзе за днём вынясення рашэння аб адабранні дзіцяці, камісіяй, фарміруемай камісіяй па справах няпоўнагадовых раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы знаходжання гэтых дзяцей.».

13. У частцы шостай артыкула 122 словы «, а па справах аб міжнародным усынаўленні — таксама ў» замяніць словам «і».

14. У частцы першай артыкула 125:

абзац дзевяты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«асобаў, якія маюць на момант усынаўлення непагашаную або нязнятую судзімасць за наўмысныя злачынствы, а таксама асобаў, якія асуджаліся за наўмысныя цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы супраць чалавека;»;

дапоўніць частку абзацам адзінаццатым наступнага зместу:

«асобаў, дзеці якіх былі прызнаны маючымі патрэбу ў дзяржаўнай абароне ў сувязі з невыкананнем або ненадлежным выкананнем гэтымі асобамі сваіх абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзяцей у адпаведнасці з часткай першай артыкула 85[1] гэтага Кодэкса.».

15. Частку другую артыкула 143 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Ажыццяўленне функцый па апецы і папячыцельстве ў дачыненні да няпоўнагадовых асобаў ускладаецца на ўпраўленне (аддзел) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе, а ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі, — на камісію па справах няпоўнагадовых раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы знаходжання дзіцяці, у дачыненні да асобаў, прызнаных недзеяздольнымі, — на галоўнае ўпраўленне, упраўленне (аддзел) аховы здароўя абласнога выканаўчага камітэта, камітэт па ахове здароўя Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, у дачыненні да дзеяздольных асобаў, якія маюць патрэбу ў папячыцельстве па стане здароўя, — на ўпраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) сацыяльнай абароны мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе.».

16. Частку першую артыкула 153 дапоўніць абзацамі сёмым і восьмым наступнага зместу:

«асобаў, якія маюць непагашаную або нязнятую судзімасць за наўмысныя злачынствы, а таксама асобаў, якія асуджаліся за наўмысныя цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы супраць чалавека;

асобаў, дзеці якіх былі прызнаны маючымі патрэбу ў дзяржаўнай абароне ў сувязі з невыкананнем гэтымі асобамі сваіх абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзяцей у адпаведнасці з часткай першай артыкула 85[1] гэтага Кодэкса.».

17. Частку першую артыкула 173 дапоўніць абзацамі сёмым і восьмым наступнага зместу:

«асобаў, якія маюць непагашаную або нязнятую судзімасць за наўмысныя злачынствы, а таксама асобаў, якія асуджаліся за наўмысныя цяжкія і асабліва цяжкія злачынствы супраць чалавека;

асобаў, дзеці якіх былі прызнаны маючымі патрэбу ў дзяржаўнай абароне ў сувязі з невыкананнем гэтымі асобамі сваіх абавязкаў па выхаванні і ўтрыманні дзяцей у адпаведнасці з часткай першай артыкула 85[1] гэтага Кодэкса.».

18. Артыкул 194 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 194. Органы, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану

Рэгістрацыя актаў грамадзянскага стану ў гарадах ажыццяўляецца аддзеламі запісу актаў грамадзянскага стану, Дамамі (Палацамі) грамадзянскіх абрадаў гарадскіх выканаўчых камітэтаў, а ў пасёлках гарадскога тыпу і сельскіх населеных пунктах — адпаведнымі мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі.

Рэгістрацыя актаў грамадзянскага стану грамадзян Рэспублікі Беларусь за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца консульскімі ўстановамі, а таксама дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі Рэспублікі Беларусь у выпадку выканання імі консульскіх функцый.

Агульнае і метадычнае кіраўніцтва рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану аддзеламі запісу актаў грамадзянскага стану, Дамамі (Палацамі) грамадзянскіх абрадаў гарадскіх выканаўчых камітэтаў, пасяльковымі і сельскімі выканаўчымі і распарадчымі органамі, кантроль за рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану гэтымі органамі, метадычнае кіраўніцтва рэгістрацыяй актаў грамадзянскага стану консульскімі ўстановамі, а таксама дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі Рэспублікі Беларусь у выпадку выканання імі консульскіх функцый, ажыццяўляюцца Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь.».

19. У частцы чацвёртай артыкула 198 словы «Дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь» замяніць словамі «Консульскія ўстановы, а таксама дыпламатычныя прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь у выпадку выканання імі консульскіх функцый».

20. Частку першую артыкула 202 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Паўторныя пасведчанні аб рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану выдаюцца аддзеламі запісу актаў грамадзянскага стану, архівамі органаў, якія рэгіструюць акты грамадзянскага стану, галоўнымі упраўленнямі юстыцыі абласных, Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, консульскімі ўстановамі, а таксама дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі Рэспублікі Беларусь у выпадку выканання імі консульскіх функцый, а паўторныя пасведчанні аб нараджэнні і заключэнні шлюбу — таксама Дамамі (Палацамі) грамадзянскіх абрадаў гарадскіх выканаўчых камітэтаў на падставе запісаў у кнігах рэгістрацыі актаў грамадзянскага стану і метрычных кнігах.».

21. У частцы першай артыкула 223 словы «упраўленнем юстыцыі абласнога (Мінскага гарадскога) выканаўчага камітэта» замяніць словамі «галоўным упраўленнем, упраўленнем (аддзелам) юстыцыі абласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта».

22. У назве і частцы першай артыкула 230, частцы другой артыкула 232, артыкуле 238 словы «дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь» замяніць словамі «консульскія ўстановы, а таксама дыпламатычныя прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь у выпадку выканання імі консульскіх функцый».

23. Артыкул 231 дапоўніць часткай сёмай наступнага зместу:

«Рэгістрацыя скасавання шлюбаў грамадзян Рэспублікі Беларусь, якія пражываюць па-за межамі тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, па рашэннях судоў, што ўступілі ў законную сілу да 1 верасня 1999 года, ажыццяўляецца консульскімі ўстановамі, а таксама дыпламатычнымі прадстаўніцтвамі Рэспублікі Беларусь у выпадку выканання імі консульскіх функцый».

Артыкул 4. Унесці ў Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 9 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 1999 г., № 76, 2/50; 2005 г., № 120, 2/1134) наступныя дапаўненні і змяненне:

1. Артыкул 90 дапоўніць часткай 7 наступнага зместу:

«7. Асобы, абавязаныя вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаныя за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 174 гэтага Кодэкса і за іншыя злачынствы, учыненыя ў перыяд работы ў арганізацыях на падставе судовай пастановы, не падлягаюць умоўна-датэрміноваму вызваленню ад пакарання.».

2. Артыкул 119 дапоўніць часткай 6 наступнага зместу:

«6. Асобы, абавязаныя вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, асуджаныя за злачынствы, прадугледжаныя артыкуламі 174 гэтага Кодэкса, і за іншыя злачынствы, учыненыя ў перыяд работы ў арганізацыях на падставе судовай пастановы, не падлягаюць умоўна-датэрміноваму вызваленню ад пакарання.».

3. Артыкул 174 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 174. Ухіленне бацькоў ад утрымання дзяцей альбо ад вяртання расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні

1. Ухіленне бацькоў больш як тры месяцы на працягу года ад выплаты па судовай пастанове сродкаў на ўтрыманне няпоўнагадовых або поўнагадовых, але непрацаздольных і маючых патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе дзяцей —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

2. Ухіленне бацькоў ад вяртання расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, якое выявілася ў няяўцы на працу дзесяць і больш працоўных дзён на працягу трох месяцаў, ва ўтойванні або занижэнні імі памеру заработнай платы і прыраўнаваных да ёй даходаў альбо ў іншым вінаватым дзеянні (бяздзейнасці), якое пацягнула за сабой невыкананне або нядобрасумленае выкананне штомесячных абавязацельстваў па вяртанні расходаў на ўтрыманне дзяцей, —

караецца папраўчымі работамі на тэрмін да двух гадоў або абмежаваннем волі на тэрмін да трох гадоў.

3. Дзеянні, прадугледжаныя часткамі першай або другой гэтага артыкула, учыненыя асобай, раней судзімай за ўхіленне ад утрымання дзяцей альбо ад вяртання расходаў, затрачаных дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, —

караюцца папраўчымі работамі на тэрмін ад аднаго года да двух гадоў або абмежаваннем волі на тэрмін ад аднаго года да чатырох гадоў.».

Артыкул 5. Унесці ў Крымінальна-працэсуальны кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 1999 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 77—78, 2/71; № 47, 2/152; 2003 г., № 8, 2/922) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. Частку 8 артыкула 126 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«8. Аб прымяненні меры стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту орган крымінальнага праследавання або суд абавязаны паведамляць асобам, указаным у артыкуле 115 гэтага Кодэкса, пры прымяненні гэтай меры стрымання ў дачыненні да асобаў, дзеці якіх застаюцца без апекі бацькоў, — не пазней за наступны дзень пасля прыняцця ўказанага рашэння паведаміць упраўленне (аддзел) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.».

5. Частку 2 артыкула 302 дапоўніць чацвёртым сказам наступнага зместу: «У выпадку, калі ў абвінавачанага, які вышукваецца, застаюцца дзеці без апекі бацькоў, аб яго вышуку не пазней за наступны дзень пасля прыняцця рашэння паведамляецца ўпраўленню (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па яго месцы жыхарства для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей.».

6. Частку 1 артыкула 368 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«1. Суд не пазней за наступны дзень пасля пастановы абвінавачанага прысуду ў дачыненні да абвінавачанага, асуджанага да пакарання ў выглядзе абмежавання волі з накіраваннем у папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, арышту, пазбаўлення волі, пажыццёвага зняволення, смяротнага пакарання, калі дзеці ўказанай асобы застаюцца без апекі бацькоў, паведамляе аб гэтым упраўленню (аддзелу) адукацыі раённага, гарадскога выканаўчага камітэта, мясцовай адміністрацыі раёна ў горадзе па месцы жыхарства бацькоў (аднаго з бацькоў) для забеспячэння дзяржаўнай абароны дзяцей. Калі ва ўзятага пад варту падазронага, абвінавачанага засталіся без прыгляду і дапамогі састарэлыя бацькі, іншыя ўтрыманцы, следчы, дазнаватель абавязаны прыняць меры па перадачы іх пад нагляд або пад апеку сваякам альбо іншым асобам і ўстановам, а пры наяўнасці ў яе маёмасці або жылля, якія застаюцца без нагляду, — аб перадачы іх на захаванне сваякам або мясцовым выканаўчым і распарадчым органам.».

Артыкул 6. Унесці ў Крымінальна-выканаўчы кодэкс Рэспублікі Беларусь ад 11 студзеня 2000 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2000 г., № 32, 2/140; 2003 г., № 8, 2/922; 2006 г., № 92, 2/1219) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У артыкуле 37:

у частцы 3 словы «органы дзяржаўнай службы занятасці» замяніць словамі «камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта»;

у частцы 4:

словы «дзяржаўную службу занятасці» і «ёю» замяніць адпаведна словамі «камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта» і «імі»;

словы «або павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі» выключыць.

2. Частку 4 артыкула 38 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4. Асуджаны, які не мае працы, абавязаны ўладкавацца на працу самастойна альбо стаць на ўлік у камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленні (аддзеле) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта на працягу пятнаццаці дзён з дня пакідання ранейшага месца працы. Асуджаны не мае права адмаўляцца ад працы, прапанаванай камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленнем (аддзелам) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта.».

3. Частку 2 артыкула 42 пасля слова «Асуджаныя» дапоўніць словамі «, да якіх ва ўстаноўленых законам выпадках і парадку могуць быць прыменены замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем або ўмоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання».

4. У пункце 1 часткі 1 артыкула 43:

словы «органах дзяржаўнай службы занятасці» замяніць словамі «камітэце па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта»;

словы «або павышэння кваліфікацыі, перападрыхтоўкі» выключыць.

5. Частку 8 артыкула 47 пасля слоў «якія маюць сям'ю» дапоўніць словамі «, акрамя асобаў, абавязаных вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, маюць права на працоўны водпуск працягласцю сем каляндарных дзён.».

6. Частку 4 артыкула 48[1] выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«4. Асуджаны да абмежавання волі без накіравання ў папраўчую ўстанову адкрытага тыпу, якія падлягае абавязковаму прыцягненню да працы і да моманту пачатку выканання пакарання не мае пастаяннага месца працы, абавязаны на працягу пятнаццаці дзён працаўладкавацца самастойна. Калі асуджаны не ўладкаваўся на працу пасля заканчэння ўказанага тэрміну, ён накіроўваецца крымінальна-выканаўчай інспекцыяй у камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта і працаўладкоўваецца імі. У гэтым выпадку асуджаны не мае права адмаўляцца ад работы, прапанаванай яму камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленнем (аддзелам) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта. Асуджаны, які ўхіляецца без уважлівых прычын ад працаўладкавання, можа быць прыцягнуты да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.».

7. У артыкуле 1[1] артыкула 51 словы «органы дзяржаўнай службы занятасці» замяніць словамі «камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта».

8. У частцы 2 артыкула 54 словы «устаноўленым законам» замяніць словамі «устаноўленых законам выпадках і».

9. У частцы 4 артыкула 93 словы «па працы і сацыяльнай абароне» замяніць словамі «, якія прызначаюць і выплачваюць пенсію,».

10. Частку 4 артыкула 99 дапоўніць трэцім сказам наступнага зместу: «Асуджаныя, абавязаныя вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, маюць права на працоўны водпуск працягласцю сем каляндарных дзён.».

11. Частку 5 артыкула 110 пасля слова «Асуджаныя» дапоўніць словамі «, да якіх ва ўстаноўленых законам выпадках і парадку могуць быць прыменены замена неадбытай часткі пакарання больш мяккім пакараннем або ўмоўна-датэрміновае вызваленне ад пакарання».

12. У частцы 2 артыкула 159 словы «устаноўленым законам» замяніць словамі «устаноўленых законам выпадках і».

13. У артыкуле 191:

частку 3 дапоўніць другім сказам наступнага зместу: «У выпадку неабходнасці працаўладкавання асуджаных, абавязаных вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, адміністрацыя ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы ў дзень вызвалення асуджанага накіроўвае ў суд па яго месцы жыхарства выканаўчы дакумент.»;

дапоўніць артыкул часткай 4[1] наступнага зместу:

«4[1]. Вызваленыя асуджаныя, якія абавязаны вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, і падлягаюць працаўладкаванню, да месца жыхарства суправаджаюцца работнікам установы крымінальна-выканаўчай сістэмы.».

14. Артыкул 192 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 192. Аказанне дапамогі вызваленым у іх працоўным і бытавым уладкаванні

1. Не пазней чым за тры месяцы да заканчэння тэрміну пакарання асуджанага да абмежавання волі або да забаўлення волі адміністрацыя ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы праз органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта прымае меры па яго працоўным і бытавым уладкаванні. У дачыненні да асобаў, якія абавязаны вяртаць расходы, затрачаныя дзяржавай на ўтрыманне дзяцей, якія знаходзяцца на дзяржаўным забеспячэнні, у выпадку неабходнасці іх працаўладкавання адміністрацыя ўстановы крымінальна-выканаўчай сістэмы не пазней чым за тры месяцы да маючага адбыцца вызвалення інфармуе аб гэтым суд, органы ўнутраных спраў і камітэт па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, упраўленне (аддзел) па працы, занятасці і сацыяльнай абароне гарадскога, раённага выканаўчага камітэта па месцы жыхарства ўказаных асобаў.

2. Службай сацыяльнай адаптацыі ўстаноў крымінальна-выканаўчай сістэмы з асуджанымі праводзіцца выхаваўчая праца з мэтай падрыхтоўкі іх да вызвалення, растлумачваюцца іх правы і абавязкі пасля вызвалення.

3. Інваліды I і II групы, а таксама мужчыны ва ўзросце старэй за 60 гадоў і жанчыны ва ўзросце старэй за 55 гадоў пры неабходнасці па іх згодзе накіроўваюцца камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне аласнога, Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта ў дамы-інтэрнаты для састарэлых і інвалідаў. Няпоўнагадовыя, у неабходных выпадках перадаюцца органам апекі і папячыцельства па месцы жыхарства няпоўнагадовых для прадастаўлення ім статусу дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, і для іх далейшага ўладкавання.».

Артыкул 7. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 31 мая 2003 года «Аб асновах сістэмы прафілактыкі беспрытульнасці і правапарушэнняў няпоўнагадовых» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 64, 2/949; 2007 г., № 170, 2/1347) наступныя змяненні і дапаўненні:

1. У артыкуле 1:

у абзацы другім слова «правапарушэнняў» замяніць словамі «дзеянняў, якія ўтрымліваюць прыметы адміністрацыйнага правапарушэння або злачынства (далей, калі не ўстаноўлена іншае, — правапарушэння)»;

у абзацы трэцім словы «, навучанню або» і «дома або дзіцячай інтэрнацкай установы» замяніць адпаведна словамі «і» і «дома, дзіцячай інтэрнацкай установы, дзіцячай вёскі (гарадка)»;

абзацы пяты і шосты выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«няпоўнагадовы, які заходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, — асоба ва ўзросце да васемнаццаці гадоў, якая знаходзіцца ў абставінах, пры якіх не задавальняюцца яе асноўныя жыццёвыя патрэбнасці; якая з прычыны бездагляднасці або безнагляднасці ўчыняе правапарушэнні; бацькі, усынавіцелі, апекуны або папячыцелі якой вядуць амаральны лад жыцця, што аказвае шкодны ўплыў на ўказаную асобу, злоўжываюць сваімі правамі і (або) жорстка абыходзяцца

Твае правы

СВАБОДНЫ ДЫПЛОМ. АБО ПЕРШАЕ МЕСЦА?

Спіс самых вострых праблем для абсалютнай большасці невялікіх рэгіёнаў будзе амаль аднолькавым — гэта жыллё, камунальныя паслугі і… «працоўныя» пытанні. Прычым што да апошніх, то тут заўсёды аказваецца дарэчы кваліфікаваная кансультацыя юрыста. Канчатковы разлік і пенсіі, водпускі і размеркаванне — усё гэта стала галоўнымі тэмамі чарговай «выязной прыёмнай» Дэпартамента дзяржаўнай інспекцыі працы Міністэрства працы і сацыяльнай абароны, якая была наладжана днямі для жыхароў Міёрскага, Верхнядзвінскага, Браслаўскага і Шаркаўшчынскага раёнаў.

ГРОШЫ ТОЛЬКІ ПАСЛЯ ПРОДАЖУ МАЁМАСЦІ

Завод апынуўся ў цяжкім стане і цяпер знаходзіцца ў стадыі ліквідацыі. Пры гэтым з кастрычніка мінулага года тут не робяцца выплаты зарплаты. А адсюль і пытанне: калі работнікі прадпрыемства ўсё ж атрымаюць свае грошы?

— Атрымаць зароблены грошы работнікі павінны, — кажа намеснік дырэктара дэпартамента Дзяржаўнай інспекцыі працы Ірына Шыляева. — Аднак сітуацыя тут даволі складаная. Справа ў тым, што для разліку па зарплаце на рахунак завода павінны паступіць грошы. А гэта адбудзецца толькі тады, калі будзе ацэнена і прададзена маёмасць прадпрыемства-банкрута.

КРОПКУ СТАВІЦЬ СУД

Арганізацыя несвоечасова плаціць зарплату, работнік хоча скасаваць кантракт. Ці можна патрабаваць звальнення ў выпадку, калі такая сітуацыя ўзнікла ў… прыватнай фірме?

— Працоўнае заканадаўства аднолькавае для ўсіх, яно датычыцца арганізацый усіх формаў уласнасці, — падкрэслівае Ірына Шыляева. — І ў тым ліку агульнымі з'яўляюцца ўмовы датэрміноватага скасавання кантракта з-за парушэння яго наймальнікам. Праўда, неабходна памятаць, што факт парушэння ўстанаўлівае не сам работнік, а адзін з трох спецыяльна ўпаўнаважаных на тое органаў — дзяржінспекцыя працы, прафсаюзы або суд. І яшчэ. Скасаванне кантракта пасля выяўлення парушэння — толькі права, але не абавязак наймальніка. Калі наймальнік звальняць усё роўна не хоча, то прымусіць яго зрабіць гэта можа толькі суд.

ПЕНСІЙНЫ ЎЗРОСТ — НЕ ПАДСТАВА

Работніца, якая мае кантракт да лютага наступнага года, афармліла на сябе догляд унука ва ўзросце да 3 гадоў. Прычым хутка жанчына выходзіць на пенсію. Ці можна яе звольніць у сувязі з дасягненнем пенсійнага ўзросту?

— Цяпер звольніць работніцу магчыма толькі за якія-небудзь вінаватыя дзеянні, але паколькі яна даглядае ўнука, то такой падставы для звальнення, зразумела, не ўзнікне, — заўважае Ірына Шыляева. — Такім чынам, спыніць працоўныя адносіны з жанчынай да лютага наступнага года нельга. Разам з тым варта заўважыць: працягваць кантракт да дасягнення ўнукам узросту 5 гадоў наймальнік не абавязаны. Такая гарантыя прадугледжана толькі для маці, бацькі або апекуна.

ВОДПУСК АВАНСАМ БЕЗ КАМПЕНСАЦЫІ

Чалавеку быў прадастаўлены водпуск авансам, а неўзабаве з'явілася неабходнасць адклікаць работніка з адпачынку. Ці можна ў такім выпадку патрабаваць выплату кампенсацыі?

— Адклікаць з водпуску можна толькі ў сувязі з вытворчай неабходнасцю, скажам, перапыніць адпачынак магчыма ў выпадку аварыі, спынення абсталявання або па абставінах, прадугледжаных у калектыўным дагаворы, — тлумачыць Ірына Шыляева. — Прычым наймальнік мае права адклікаць з водпуску выключна з пісьмовай згоды самога работніка. Плюс да таго трэба мець на ўвазе, што паводле новага Працоўнага кодэкса работнік павінен адгуляць як мінімум 21 дзень. Адпаведна, выплата кампенсацыі можа рабіцца толькі за астатнюю частку водпуску. Аднак робіцца зноў-такі не заўсёды — скажам, заканадаўства не прадугледжвае кампенсацыю водпуску, што быў прадастаўлены авансам. У выпадку адклікання з такога водпуску «недагуляную» частку можна толькі перанесці на больш позні тэрмін.

КАСІЦЬ. АЛЕ Ў… НАВУШНІКАХ

Каб палегчыць работы па добраўпарадкаванні тэрыторыі, арганізацыя вырашыла набыць газанакасілку. Справа, безумоўна, добрая. Аднак адразу ж узнікла пытанне: хто можа працаваць на касілцы?

На першы погляд, праблема вельмі простая. Аднак не зусім, бо для выкарыстання газанакасілкі неабходна выканаць як мінімум дзве ўмовы. Па-першае, трэба праінструктаваць работніка па тэхніцы бяспекі. А, па-другое, арганізацыя ў абавязковым парадку павінна забяспечыць работніка сродкамі індывідуальнай абароны. І, у прыватнасці, выдаць яму спецыяльны касцюм, абутак, шчыток, а таксама… навушнікі.

ПАСЛЯ АРМІІ ЁСЦЬ ВАРЫЯНТЫ

Звычайная сітуацыя. Два маладыя спецыялісты атрымалі размеркаванне ў розных населеных пунктах, а пасля вырашылі ўзяць шлюб. Наколькі рэальна ў такім выпадку прэтэндаваць на свабодны дыплом?

— Пры немагчымасці прадстаўлення работы мужу і жонцы-выпускніку ў адным населеным пункце разлічваць на пераразмеркаванне або на атрыманне свабоднага дыплома на самай справе можна, — зазначае Ірына Шыляева. — Але ў любым выпадку для вырашэння гэтага пытання трэба звяртацца ў камісію па размеркаванні навучальнай установы.

Аднак раз-пораз выпадкі бываюць па-сапраўднаму нестандартнымі. Вось адзін з прыкладаў. Хлопец павінен быў пачаць работу па размеркаванні 30 ліпеня. Аднак 16 ліпеня яго прызываюць на тэрміновую службу ў войска. З улікам гэтага, ці захоўваецца права на першае працоўнае месца?

— Прадастаўленае па размеркаванні месца адназначна захоўвалася б у сітуацыі, калі б выпускнік ужо прыступіў да работы, — адзначае першы намеснік старшыні Камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Віцебскага аблвыканкама Мікалай Глушонак. — Аднак паколькі прыступіць да работы хлопец не паспеў, то пасля вяртання з тэрміновай службы застаюцца тры варыянты. Па-першае, завярнуцца ў арганізацыю размеркавання. Па-другое, калі свабоднага месца ў гэтай арганізацыі ўжо не застанецца, можна звярнуцца ў сваю навучальную ўстанову з просьбай аб пераразмеркаванні. І, у рэшце рэшт, варта заўважыць — маладым людзям, якія прыходзяць з арміі, прадугледжаныя дадатковыя дзяржаўныя гарантыі па працаўладкаванні. Таму ў крайнім выпадку трэба звярнуцца ў службу занятасці.

УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД УЗНОСАЎ

Адно з распаўсюджаных «пенсійных» пытанняў — ці ўплывае на індывідуальны каэфіцыент работа па сумяшчальніцтве? Між тым, малюнак тут атрымліваецца наступным. Калі з заробкаў па сумяшчальніцтве не рабіліся адлічэнні ўзносаў на дзяржаўнае сацыяльнае страхаванне, то весці гаворку аб павелічэнні індывідуальнага каэфіцыента не выпадае. А калі адлічэнні рабіліся — пенсійны каэфіцыент павінен узрасці. Прычым для яго пераразліку трэба прадставіць звесткі аб «сумяшчальніцкіх» заробках.

Нашмат складаней іншая сітуацыя. Жанчына працяглы час працавала даяркай… у дапаможнай гаспадарцы вучылішча. Ці можа такая жанчына пайсці на датэрміновую пенсію?

У дадзеным выпадку трэба ўзгадаць заканадаўства. Даярка можа пайсці на пенсію ў 50-гадовым узросце адначасова пры некалькіх умовах. Па-першае, трэба мець не менш чым 20-гадовы спецыяльны стаж. Па-другое, трэба запрацаваць гэты стаж менавіта ў калгасах, саўгасах і іншых сельгаспрадпрыемствах. І, па-трэцяе, за работу пасля 1 студзеня 1991 года даяркам неабходна прадставіць пацвярджэнне выканання нормаў абслугоўвання жывёлы.

Словам, першы крок — напісаць у раённае ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ці ў Мінсельгасхарч і папрасіць патлумачыць, ці адносіцца дапаможная гаспадарка вучылішча да «іншых сельгаспрадпрыемстваў». І калі адказ будзе станоўчым, варта звярнуцца ў вучылішча па даведку аб выкананні нормаў абслугоўвання жывёлы. У прыватнасці, такая даведка можа быць выдадзена на падставе квартальных ці гадавых справаздач.

Нарэшце, таксама папулярная тэма — залік у стаж часу, калі чалавек знаходзіўся на ўліку ў службе занятасці насельніцтва. Магчымасць такога заліку па-ранейшаму ёсць. Аднак нялішне адзначыць: з 1 жніўня 2006 года беспрацоўным «ідзе» ў стаж толькі 6 месяцаў.

Сяргей ГРЫБ.

Міёрскі раён.

Рэпарцёр атрымаў заданне...

СХАДЗІЦЬ У РАЁННЫ КІНАТЭАТР

Не пайсці было проста немагчыма: з неба зацерушыў дождж, сеанс пачынаўся праз чатыры хвіліны ды і кошт квітка выклікаў усмешку. У мінскім кінатэатры ён быў у чатыры разы вышэйшы за мясцовы, аднак на даўжыню чаргі сталічных кінаманаў гэта ніяк не ўплывала.

Тут жа ля касы мы з сябрам былі адзінымі пакупнікамі.

— Ёсць гледачы, няшмат, але ёсць! — адказалі на наша пытанне з-за акенца касы. — Фільм пачаўся, таму ў фае нікога і няма.

У прыцемку глядацкай залы мы цішком прайшлі на тыя месцы, якія нам спадабаліся. На нумар месца ў квітку можна было не глядзець — у зале амаль усе сядзенні былі незанятыя. На першым радзе размясцілася невялікая кампанія, недалёка ад іх — сям'я з двума дзецьмі, а справа ад нас — бацькі з маленькай дачушкай, якую, па ўсім відаць, ну зусім не цікавіў жанр фэнтазі. Амаль увесь сеанс дзяўчо бегала то ў фае, то ў шапік па чыпсы.

Пасля прагляду двухгадзіннага фільма крыху ламала ў целе ад нязручных драўляных сядзенняў, у вушах стаяў гук шалясцення абгортак, аднак уражвала зусім не гэтае. Дзіва: у тым жа Мінску сходзіць у кіно на добры фільм часам бывае праблематычна — яшчэ ці возьмеш квіткі, а ў невялікім раённым цэнтры ў адзіны кінатэатр ходзяць лічаныя людзі!

***

— Учора на два вячэрнія сеансы ў агульнай колькасці прыйшло шаснаццаць чалавек, — расказвае **Сяргей ЯЦКЕВІЧ, дырэктар камерцыйнага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Бярэзінская раённая кінавідэасетка»**. — У чым прычына? Іх шмат, на мой погляд. На жаль, проста на «выдатна» працуюць «кінапіраты» — рынак тэлевізійнай прадукцыі насычаны як ніколі. Не паспее фільм выйсці ў пракат, а падпольны прадукт ужо гатовы. Вось і атрымліваецца, што пакуль фільм дойдзе да нашага раёна, жыхары яго паглядзелі ўжо, сёння ж існуе вялікі выбар тэхнікі для відэапаказу.

— Ёсць пэўная сістэма праката, — тлумачыць **Святлана ВАЙНІЛОВІЧ, намеснік дырэктара ККУП «Бярэзінская райкінавідэасетка»**. — Дзяржава закупляе копію пэўнага фільма, прычым за немалыя грошы. У КУП «Мінаблвідэапракат» складаецца графік праката. У Мінскай вобласці, напрыклад, пракат пачынаецца з буйных раённых цэнтраў і ідзе па выхадной. З 22 раёнаў вобласці мы атрымліваем копію амаль апошнімі. Вось тут нас «піраты» і абганяюць. Ёсць яшчэ адзін нюанс. Расійская прадукцыя адразу ідзе на тэлеэкран, яшчэ не пабываўшы на кінаэкранах. Іншая справа з беларускімі фільмамі — амаль усе яны спачатку трапляюць у пракат, а ўжо потым — на тэлеэкраны. Калі фільм камерцыйны, закупляецца дзве копіі, а гэта, зразумела, і хутчэй, і эканамічна эфектыўней. Мы прапаноўвалі даваць фільмы кінатэатрам на дысках, — якасць ад гэтага не пацерпіць — аднак гэта лічыцца парушэннем распрацаванай сістэмы.

— Так дзяржава губляе шмат грошай, — лічыць Сяргей Паўлавіч. — Неабходна дапрацаваць існуючую сістэму, каб быў нармальны эканамічны эфект. Напрыклад, наша прадпрыемства сёння, на жаль, жыве на дзяржаўныя датацыі, выдаткі ў два разы большыя за прыбытак.

Яшчэ адна прычына абыякавасці моладзі да кінатэатра, як лічыць Сяргей Яцкевіч, гэта змена яе інтарэсаў.

— Моладзь імкнецца ў вялікія гарады, — гаворыць ён. — Таму яе колькасць у маленькіх змяншаецца, няма каму ісці ў кіно. А некаторых прадстаўнікоў маладога пакалення з тых, хто застаўся, я сам часта бачу на стадыёне ды ў парку, прычым зусім не на турніках і не з футбольнымі мячамі…

***

Як кажуць, выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў… Звычайна супрацоўнікі Кінавідэапрадпрыемства запыту не чакаюць. Самі ездзяць на відэаперасоўках па раёне, наведваюць вёскі, дзе ёсць Дамы культуры ці школы. Менавіта з імі супрацоўнічае з верасня па май прадпрыемства, паказваючы дакументальныя, мастацкія фільмы, фільмы на вучэбную тэматыку і кінахронікі. Для вясковых жыхароў кожны такі «прыезд кіно» — свята. У Капланцах, Міхалёве, Высокай Гары, дзе засталіся стацыянарныя кінаўстаноўкі, вяскоўцы рэгулярна збіраюцца на сезонныя летнія паказы. Цяпер такія ўстаноўкі ўзнаўляюцца ў Любушанах, Лешніцы, хутка пачнецца рамонт у Багушэвічах, а значыць, што хутка ў гэтых вёсках жыць стане весялей.

Летам жа ў горадзе часта можна ўбачыць роўныя чародкі дзяцей экраны. Калі фільм камерцыйны, закупляецца дзве копіі, а гэта, зразумела, і хутчэй, і эканамічна эфектыўней. Мы прапаноўвалі даваць фільмы кінатэатрам на дысках, — якасць ад гэтага не пацерпіць — аднак гэта лічыцца парушэннем распрацаванай сістэмы.

— Так дзяржава губляе шмат грошай, — лічыць Сяргей Паўлавіч. — Неабходна дапрацаваць існуючую сістэму, каб быў нармальны эканамічны эфект. Напрыклад, наша прадпрыемства сёння, на жаль, жыве на дзяржаўныя датацыі, выдаткі ў два разы большыя за прыбытак.

Яшчэ адна прычына абыякавасці моладзі да кінатэатра, як лічыць Сяргей Яцкевіч, гэта змена яе інтарэсаў.

— Моладзь імкнецца ў вялікія гарады, — гаворыць ён. — Таму яе колькасць у маленькіх змяншаецца, няма каму ісці ў кіно. А некаторых прадстаўнікоў маладога пакалення з тых, хто застаўся, я сам часта бачу на стадыёне ды ў парку, прычым зусім не на турніках і не з футбольнымі мячамі…

***

Як кажуць, выратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў… Звычайна супрацоўнікі Кінавідэапрадпрыемства запыту не чакаюць. Самі ездзяць на відэаперасоўках па раёне, наведваюць вёскі, дзе ёсць Дамы культуры ці школы. Менавіта з імі супрацоўнічае з верасня па май прадпрыемства, паказваючы дакументальныя, мастацкія фільмы, фільмы на вучэбную тэматыку і кінахронікі. Для вясковых жыхароў кожны такі «прыезд кіно» — свята. У Капланцах, Міхалёве, Высокай Гары, дзе засталіся стацыянарныя кінаўстаноўкі, вяскоўцы рэгулярна збіраюцца на сезонныя летнія паказы. Цяпер такія ўстаноўкі ўзнаўляюцца ў Любушанах, Лешніцы, хутка пачнецца рамонт у Багушэвічах, а значыць, што хутка ў гэтых вёсках жыць стане весялей.

Летам жа ў горадзе часта можна ўбачыць роўныя чародкі дзяцей на чале з выхавальнікамі, якія ўсе разам крочаць у адзін бок — кінатэатр карыстаецца папулярнасцю сярод аздараўленчых пляцовак. А ў лагеры «Папараць-кветка» і на базе аддпачынку «Сонечная паляна» ўжо па шматгадовай традыцыі ладзяцца кінавечары.

— Сёння ў нас ёсць два камплекты відэаперасовак, адна з якіх — запасная. Яе мы эксплуатуем толькі ў чэрвені, калі актыўна працуюць дзіцячыя аздараўляльныя пляцоўкі. Вось тады попыт вельмі высокі! — гаворыць Сяргей Яцкевіч. — А калі ёсць попыт, мы працуем без аддпачынку і выхадных. Цікава, што нашы магілёўскія калегі пераймаюць у нас вопыт, бо ў іх сітуацыя горшая — у Магілёўскім раёне кінасетка была амаль пахаваная.

***

Рэклама — рухальнік прагрэсу. Правіла, якое заўсёды спрацоўвае. І ў раённай кінасферы гэта ведаюць. Чатыры шчыты-афішы ў горадзе, аб'явы на дыскатэках з паказам эпізодаў з фільмаў, рэкламныя ролікі прэм'ер перад кожным сеансам… Дарэчы, калі раней прэм'ера ў кінатэатры адбывалася раз на месяц, то цяпер новы аўторак — новы фільм. А хутка на сайце горада з'явіцца Інтэрнэт-афіша з раскладам усіх сеансаў.

— Ёсць яшчэ добрыя навіны, — дзеліцца Святлана Вайніловіч. — На наступны год запланаваны рамонт даху будынка, а праз год, у 2010-м, мы плануем капітальны рамонт з заменай усяго тэхнічнага абсталявання. Паставім, нарэшце, сістэму Dolby. Купім прыстойныя сядзенні. Будзе наш кінатэатр лепшы за любы сталічны!

***

Што ж, перспектывы добрыя. Галоўнае, каб мяккія сядзенні кінатэатра хоць бы час ад часу замянялі моладзі лавачкі ў парку, а людзям дарослым — звыклыя канапы.

Каб кіно ў маленькім горадзе не пераставала існаваць.

Таццяна ДАНІЛУШКІНА.
Фота аўтара.

ЯНЫ «ПАЛЯВАЛІ» ЗА МЕТАЛАМ

Двое рабочых чыгуначнага транспарту ўкралі чатыры тоны (!) металу з вагонаў Гомельскага завода «Цэнтраліт». А рабочы аднаго СВК, што ў Рэчыцкім раёне, дарэчы, раней судзімы, пакваліўся на 205 металічных рашотак, што знаходзіліся на піларме і каштавалі звыш двух мільёнаў рублёў.

Не адстаў ад яго і 22-гадовы рабочы КСУП «Саўгас Краснае», які сарваў замкі склада захоўвання матэрыялаў чыгуначнай станцыі Іолча і прыхапіў 10 накладак, 58 падкладак і тры башмакі стрэлачнага перавода, але рэалізаваць не паспеў, бо міліцыя, як і ў двух папярэдніх выпадках, натрапіла на яго след. А вось злодзея, які «прырабіў ногі» чатыром карпусам каналізацыйных люкаў у адным з населеных пунктаў Акцябрскага раёна, яшчэ трэба знайсці.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

НЕ ПРЫКМЕЦІЛІ

На зернесушыльным току ў в. Стайкі пад Баранавічамі знік лічыльнік.

Цэлы месяц ніхто з работнікаў не прыкмячаў прапажу.

А цяпер лічыльнік коштам больш за сем мільёнаў рублёў шукае міліцыя.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

НЕ ВУГАЛЬ, А «CANON»

У пункце мытнага афармлення «Прывалка» беларускі грамадзянін, вадзіцель літоўскай грамадскай транспартнай фірмы, прад'явіў дакументы, якія сведчылі, што ў Беларусь увозіцца актываваны вугаль. А насамрэч…

Паводле інфармацыі прэс-групы Гродзенскай рэгіянальнай мытні, у грузавым памяшканні аўтамабіля было выяўлена 3800 штук лічбавых фотаапаратаў «Canon» і «Nikon», 4 тысячы адзінак мужчынскага адзення, 18 тысяч пар жаночага абутку плюс запчасткі да легкавых машын і відэатэхніка. Агульны кошт затрыманага тавару складае больш за 4,6 мільярда рублёў. Яго лёс вырашыць суд.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

З КУЛЬБАЙ У АТАКУ — ЗА БУТЭЛЬКУ

З в. Кулякі Іванаўскага раёна ў бальніцу была дастаўлена 82-гадовая пенсіянерка з цяжкімі траўмамі галавы і рук.

Следства ўстанавіла, што пацярпелую ў яе доме пабіла другая пенсіянерка — на 24 гады маладзейшая. Каб завалодаць бутэлькай «Руская», яна з драўлянай кульбай напала на гаспадыню.

Разбойніцу затрымалі.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

СІЛА КУЛАКА ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

У Брэсце, каля бара «Павуціна», ноччу мясцовы прадпрымальнік нешта не падзяліў з жыхаром абласнога цэнтра і ўдарам кулака выбіў вока — траўма з'яўляецца цяжкай. А ў Давыд-Гарадку, таксама прадпрымальнік, каля бара «Бутэрбродная» праламаў кулаком скроневую косць пенсіянеру. Прадпрымальнікі арыштаваныя.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

ЯГАДЫ З… «КАПЕЙКІ»

У Расонскім раёне рабочая звярнулася па дапамогу ў міліцыю.

Расказала, што раніцай у лесе невядомы ўзламаў багажнік яе аўто «Жыгулі» першай мадэлі. Скраў 22 літры чарніц. Яшчэ з паліўнага бака зліў 15 літраў бензіну. Высветлілася, што нашкодзіў 22-гадовы рабочы. Узбуджана крымінальная справа.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Пляменніца



Хваёвы куток Панямоння. Хата, пуня, студня-журавель, ліпы. Спадарожная, нічым не парушаная цішыня, пах скошанай травы, пакалыхванне старых антонавак. Гэта — Смольня — астравок памяці, ўспамінаў, для некага — натхнення. Паэтава зямля. А яшчэ і месца першай сустрэчы Купалы і Коласа. Цяпер — філіял дзяржаўнага літаратурнага музея. І разам з тым — колішняя сядзіба малодшага брата Якуба Коласа — Юзіка Міцкевіча, вобраз якога з пяшчотаю і любоўю намаляваны ў паэме «Новая зямля».

Шмат чаго памятае і ўмее красамоўна распавесці пра сваю слаўвутую радню і колішняе жыццё цяперашняя гаспадыня – сярэдняя дачка Юзіка (у Юзіка было восем дзяцей), Коласава пляменніца Соф'я Іосіфаўна Міцкевіч. У гэтай хаце, якую купілі ў вёсцы Яршы на Уздзеншчыне, перавезлі і склалі наноў, Соф'і выпаў лёс нарадзіцца, правесці маленства, адсюль паехала вучыцца на настаўніцу. Дарэчы, як і Якуб Колас, яна скончыла Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Адсюль 40 гадоў хадзіла на працу ў Мікалаеўшчынскую школу, дзе выкладала беларускую і рускую мовы, батаніку, вяла драмгурток.

Магчыма, Соф'я ведае на памяць увесь твор, які называюць энцыклапедыяй народнага жыцця. Але памяць жа ў яе, безумоўна, выключная. Соф'я любіць кожны радок «Новай зямлі» і заўсёды ў свае ўспаміны тонка і дасціпна ўплятае цытаты з дзядзькавай паэзіі.

Кожны раз, наведваючы Смольню, малюся, каб выйшла гаспадыня, каб была здаровая, каб «пачаставала» смакатою коласавага слова. Яна адчыніць хату-музей, падыдзе да покуці, гляне ў акенца. Заўсёды лаўлю сябе на думцы, што ў гэтым прынёманскім куточку (хочацца сказаць — у гэтым свеце), не існуе больш каштоўнага за гэтую яе прысутнасць, цікія крокі і рухі, жывыя вочы і памяць. Ведаеце, як называў яе паэт? Зосяй. Яна звярталася да яго — дзядзька Костусь. Нібыта нічога асаблівага. А мне ў радасць было пачуць гэта ад яе самой.

Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.

Простыя рэчы

КАШАЛЁК

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Мы яшчэ не школьнікі. Але засталося некалькі месяцаў да той школы. Прападаем на вуліцы, займаемся абы чым, прадчуваючы хуткую няволю вучнёўства. Едзе нарыхтоўшчык, як тады казалі, другаснай сыравіны, што жыве недалёка. Спыніўся.

— Што, абібокі? Няма куды час дзяваць? Вы б лепш на гародах пахадзілі, касцей назбіралі — я вам нешта і заплацію бы.

А чаму б і не? Тады нашы бацькі трымалі ў хлявах свіней, з вёсак яшчэ нестарыя нашы дзядулі і бабулі прывозілі пасля забою жывёлы мяса. Так што ў зімовыя мясаеды касцей на гародах сапраўды хапала. Пачалі збіраць — захапіліся. А галоўнае, што грошы заробім.

І вось зацягнулі тыя косці нарыхтоўшчыку. Ён ускінуў іх на вагі. Нешта падлічыў. Потым дастае з кішэні кашалёк. Вядома ж, гэта было дзіцячае ўражанне, але здаўся ён мне вялікім-вялікім. А калі гаспадар яго раскрыў — грошай там было незлічона.

Нарыхтоўшчык пакорпаўся і даў нам траім па рублю. З якою радасцю беглі мы дадому! Цяпер жа не трэба прасіць у маці на марожанае.

Дома бацька паглядзеў на зароблены мною рубель і засмяяўся. Тады я яго тлумачэнні слаба зразумеў. Цяпер ведаю, што якраз у 1961-м адбылася грашовая рэформа, якая праводзіла абмен знакаў 10 да 1. Такім чынам, даўшы нам па старому рублю, які яшчэ быў у абарачэнні, нарыхтоўшчык заплаціў нам па 10 капеек новымі. Вось чаму бацька і смяяўся. У яго самога не было кашалька. Ды і навошта. Атрымліваючы за сваю працу цесляром 480 рублёў, ён пасля рэформы стаў атрымліваць 48. Маці не працавала. Дапамагала кароўка, свінні ды куры, а яшчэ тое, што прыносілі іх бацькі з вёскі.

Такі вось успамін маленства і першая мая сустрэча з кашальком.

Першыя грошы, якія прыходзілі на замену менаваму гандлю (калі нейкі тавар мяняўся на іншы), узніклі яшчэ ў глыбокіх стагоддзях мінулай эры. Былі яны самымі разнастайнымі — ад марскіх ракавінак да кавалкаў солі. Потым грошы паступова набылі выгляд манет. І практычна яшчэ нядаўняе вынаходніцтва чалавецтва — банкноты.

А калі ж узніклі першыя кашалькі? Дазвольце не зусім гістарычнае адступленне.

Існуе грэчаскі міф пра арганаўтаў. Грэчаскі герой Ясон са спадарожнікамі адпраўляецца на караблі «Арго» ў далёкую Калхіду (цяперашняя незалежная Грузія) па залатое руно (скуру) чароўнага барана. Але ж гэта не зусім паэтычная фантазія — залатарунны баран. Ёсць і крыху рэальная аснова. У старажытнасці людзі засвоілі простую тэхналогію здабычы золата. Яны прамывалі зямлю, дзе было золата, на аўчынах. Шэрсць затрымлівала цяжкія залатыя зярняткі, а лёгкія пяскі сцяклі разам з вадой.

Дык вось мая ўсмешлівая гіпотэза: згарнуў такую залатаносную аўчыну ў некалькі столак — чым вам не першы кашалёк?

Якімі, напрыклад, былі кашалькі ў сярэднявеччы, калі пра банкноты яшчэ і не ведалі, абыходзіліся манетамі з золата, срэбра, медзі? Па старых карцінах, па касцюмаваных кінафільмах, якія рэканструююць той побыт, ведаем — скураныя ці з ільняной тканіны. Але ж хочаш пахваліцца — падвесь на гэты пояс.

У старой беларускай мове захавалася шмат назваў менавіта такіх кашалькоў-торбачак. **Кеса, кеска, гамалейка, магалейка, кабза**. «… і паказаў магалейку з чырвонцамі».

Ёсць і такое слова — **капшук**. Таксама мяшэчак для тытуню, махоркі, які сцягваецца шнурком. Але ў такіх капшуках насілі і дробныя грошы. Не згубіцца, і заўсёды пад рукою.

Некалі, апісваючы вясковае жыццё, я выкарыстаў яго і ў тым, і ў другім значэнні.

Выходзіць ранак — цэўкай кволы,
Капшук згубіўся абы дзе.
Сусед ад вечара вясёлы
Да крамы з кошыкам брыдзе.

Відаць, з рускай у беларускую мову перайшло і слова **каліта**. Яно азначае не толькі сумку для грошай, вялікі кашалёк, але і самі грошы, багацце. А ў абласным значэнні проста паходную торбу. У Сяргея Грахоўскага:

Дастае тоўстую кнігу
Дзед з вялікай каліты.

У XIV стагоддзі ў рускіх землях быў такі князь Іван I. Потым стаў ён і вялікім князем Уладзімірскім. Увогуле збіраў рускія землі, закладаў асновы палітычнай і эканамічнай цэласнасці будучай дзяржавы. Пры ім рэзідэнцыю рускага мітрапаліта перанеслі з Уладзіміра ў Маскву. Землі яшчэ залежалі ад татар, дык вось ён, Іван I, дабіўся ў Залатой Арды права збору мангола-татарскай даніны на Русі. Зразумела, што перападала не толькі татарам, але і зборшчыку. І ўвогуле быў прыхямысты, капейку збіраў. Таму і ўвайшоў у расійскую гісторыю як Іван Каліта.

Партманет — гэта таксама кашалёк для грошай, дакументаў, але гэта ўжо ганарова, фацэтна, як гавораць нашы мясцовыя каталікі. Дарэчы, слова паходзіць ад французскага porte-monnaie. Партманет дастаюць з кішэні паважна, не спяшаючыся. Раскрываюць яго з адчуваннем сваёй годнасці і веданнем таго, што тут ляжыць. А хто любіць выхваліцца, дык зробіць так, што суседзі ўбачаць, колькі ў яго там грошай.

Між іншым, ёсць у мяне жыццёвая гісторыя, не столькі смешная, колькі павучальная, звязаная менавіта з партманетам. Адбылася яна з адным з блізкіх маіх сяброў. І за даўнасцю, без імёнаў, магчыма яе расказаць.

Служыў ён у Германіі афіцэрам. І вось чарговы адпачынак. Прыехаў у Брэст. Тут атрымаў грошы — і немалыя. Тое, што набегла ў савецкіх рублях за год бездакорнай службы, адпускныя. Склаў іх у партманет. А да цягніка, каб дабрацца дадому, яшчэ шмат часу. Пахадзіў па горадзе, зайшоў павячэраць у рэстаран. І там пазнаёміўся з жанчынай. Яшчэ малады, яшчэ з аднаго погляду не пазнае, якога гэта кшталту жанчына. Слова за слова. Добра пасядзелі. Яна яго і запрасіла да сябе.

— Пакуль той цягнік раніцай, пойдзем да мяне адпачнём.

Пайшлі, з сабою віна прыкупілі. Ну, а ў той хаце на ціхай вулачцы доўга не заседжваліся. Распрануліся. І толькі прылеглі — заходзяць у хату два моцненькія мужчыны. Ну, сістэма адпрацаваная. Рэўнасць, гвалт, пагрозы. А потым: «Давай грошы!»

— Бярыце, што ёсць у кішэнях.

Тыя перапаролі ўсё адзенне — нейкая драбязга, на дарогу ці ў рэстаране пасядзець.

— Ты каго прывяла? — ужо адкрыта на жанчыну.

Тая ў слёзы, апраўдваецца.

А сябар, заходзячы ў хату, выняў партманет і ў ганку засунуў яго пад бэльку. Як потым прызнаваўся — чыста аўтаматычна.

Малайцы пайшлі, жанчына плача. А ён хуценька апранаўся — і на вакзал. З партманетам, вядома ж.

Асабіста я не нашу кашалёк, грошы добра змяшчаюцца ў кішэні. Абы яны былі. І мяркуючы па ўстойлівых народных выразах, большасць простых беларусаў таксама тых кашалькоў не мела. Мяркуйце. Пра кашалёк.

Пусты кашалёк — пра адсутнасць грошай.

Тугі кашалёк — пра наяўнасць вялікіх грошай.

А пра кішэнь у тым жа значэнні колькі!

Біць па кішэні — змушаць на трату грошай.

Вецер гуляе ў кішэні — няма там нічога з грошай.

Класці сабе ў кішэнь — нешта прысвоіць не сваё.

Набіць кішэнь — прысвоіць вельмі шмат.

Не па кішэні — дарагавата, хацеў бы, ды не магу ўзяць.

Пустыя кішэні — пра беднага чалавека.

Тоўстыя кішэні — наадварот, пра чалавека, які мае грошы.

Калаціць кішэні — збіраць самае апошняе, вытужвацца.

Сучаснасць наша такая, што грошы носяцца ў багатых людзей ужо не ў партманетах ці кашальках, а ў «дыпламатах» і кофрах. Вось-вось, пра кофр. Успомніў. Ва Еладзіміра Караткевіча ёсць аповесць «Зброя». Гэта своеасаблівы працэс яго вяртання да родамага рамана «Каласы пад сярпом тваім». Галоўны герой той жа — князь, будучы паўстанец 1863 года Алесь Загорскі прыязджае ў Маскву для закупкі зброі для паўстання. І тут ён сустракаецца з старааброднцам, чалавекам вялікіх магчымасцяў і вялікіх грошай Чыўіным, які ў рэшце рэшт і дапамог ва ўсім. А вось першае сустрэча:

«Ён азірнуўся і ўбачыў старога ў янотавым футры. Стары — па выглядзе купец з небагатых — цягнуўся да іх па жыжцы, валюхаючы, бо падпіхваў каленам цяжкі кофр.

Усе змоўклі. Купец дацягнуўся да іх і з палёгкай паставіў кофр».

Гэта адбывалася ў чаканні рамізніка. Сёння чакаюць таксі, а ўладальнік кофрaў з вялікімі грашыма — персанальных замежных аўто.

І на заканчэнне размовы аб такой простай рэчы таксама ўсмешлівае, але не вельмі — гісторыя, якая магла адбыцца і з аўтарам. 1983 год. У маладога чалавека выйшла першая, тоненькая кніжка паэзіі. Трэба ехаць у Мінск па ганарар. А ганарар, аказваецца, не такі і малы — каля тысячы рублёў. Практычна амаль што гадавая зарплата. Чалавек атрымаў яго. Ну як тут не адзначыць падзею. І ў рэдакцыі, і па-за яе межамі выпіта некалькі бутэлек каньяку з паэтамі вышэйшай годнасці. І разабрала маладога чалавека. Прачнуўся ён у мінскім тралейбусе на нейкім прыпынку. Выйшаў, сеў на лавачку. Крыху ачуняў. Лап-лап па кішэнях — а грошай-то і няма. Пратрос наноў і пінжак, і ўсе кішэні ў нагавіцах. Няма! Вось табе і ганарар. Скрушаны чалавек закурыў. Пасядзеў яшчэ. Кінуў недакурак пад ногі. А потым сагнуўся, каб выкінуць яго ў патрэбнае месца — і нешта зашуршэла ў назе. Нагнуўся — памацаў. Ёсць яны, грошы, засунутыя ў шкарпэтку.

Такія яны, нашы кашалькі.

Алесь КАСЦЕНЬ, *г. Паставы.*

КАСЦЮКОВІЧЫ — ГОРАД ПРЫГОЖЫХ ЖАНЧЫН

У раённым цэнтры выбралі «Міс Касцюковічы-2008». Аднак вызначалі «жанчыну года» не толькі па прыгажосці, але па разумнасці і творчай ініцыятыве.

Акрамя дэфіле па подыуме ў вечаров

Нашчадкі вогненных вёсак

Галіна НЕСЦЕРАВА (Гурэнчык), вёска Макаўе Асіповіцкага раёна:

«Я ДУМАЛА, ГЭТА ЎСЁ МНЕ ПРЫСНІЛАСЯ...»

Дацэнт Белдзяржуніверсітэта Людміла Белякова паведаміла, што пагасцяваць на радзіму прыехала з Украіны, з горада Ілычоўска Адэскай вобласці, яе цётачка Галіна Несцерава (у дзяцінстве — Гурэнчык). Родам Галіна Паўлаўна з вёскі Макаўе Асіповіцкага раёна, якая была спалена разам з людзьмі і не адрадзілася пасля вайны.

Макаўе — сярод іншых 186 «вогненных» вёсак Вялікай Айчыннай вайны — на адзіных у свеце Могілках вёсак у Хатыні, жыццё якіх перарвалі нямецка-фашысцкія акупанты.

Да вайны ў Макаўі было 48 хат, 248 жыхароў. У студзені 1943 года вораг цалкам спаліў вёску, загінула 229 чалавек. Разам з макаўчанамі пакутніцкую смерць прынялі і жыхары іншых вёсак.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У сям'і Паўла Мацвеевіча і Вольга Пятроўны Гурэнчыкаў было чатыры дачкі: Марыя (1925 года нараджэння), Ніна (1927), Рая (1933) і Галіна (1935).

— Мая старэйшая сястра Ніна — інвалід ад нараджэння. У яе праблема з нагамі. Яна не магла хадзіць — магла толькі скакаць на адной назе (як дзяўчынкі скачуць, гуляючы «ў класікі»): другая нага была прыкорчана ў калене... Пасля вайны ёй зрабілі аперацыю, крыху выпрамілі нагу — і ўсё роўна яна была карацейшая на 10 сантыметраў. Ніна ходзіць у артапедычным чаравіку.

Галіна Паўлаўна добра помніць, як упершыню ўбачыла немцаў.

— Памяж лесам і нашымі хатамі была горка, на ёй стаяла... не ведаю, як сказаць... Накшталт маяка, мабыць, геадэзічная вежа, вельмі высокая. Не помню дакладна, у які іменна дзень увайшлі ўпершыню немцы ў Макаўе. А было так. Мы сядзелі каля хаты, бацька нешта рабіў у хляве... І раптам немцы з-пад горкі на матацыклах. Іх было вельмі многа — знаеце, уражанне страшнае. Гэтыя каскі, усе ў чорным, стрыкат матацыклаў... Маці як убачыла — крыкнула нам: «З хаты не выходзьце!» — і адразу пабегла да бацькі. Але немцы ў той раз нідзе не спыняліся, проста праехалі праз Макаўе.

...Макаўе спалілі на Каляды за сувязь з партызанамі. Уся вёска была лясная — знаходзілася зусім побач з лесам. А наша хата стаяла самай крайняй, таму частымі гасцямі былі партызаны. Добра помню: чужы чалавек зойдзе — маці з ім шэпчацца, бацька шэпчацца... Ён рукзак на плечы — хлеба яму пакладуць, яшчэ нечага... Лес каля хаты — літаральна за метраў 30. Бацька быў партызанскім сувязным.

Аднойчы ў хату зайшлі немцы — а маці паклала мяне ў ложак і абставіла бутэлечкамі, нібыта я хворая. «Тыф!» — сказала немцам. І яны адразу выйшлі, бо вельмі баяліся тыфу. Не чапалі мяне і Нінукалечку, убачыліся, што яна толькі скача... А астатніх, усю вёску, сагналі на паляну — немцы нацэльвалі на людзей аўтаматы, ледзь не спускалі сабак. Тады, праўда, нікога не кранулі: пратрымалі да вечара і адпусцілі.

Бяда прыйшла пазней. Незадоўга да гэтага быў такі момант. Немцы ў нас у хаце сядзелі. Яны, калі прыходзілі, заўсёды курэй лавілі, патрабавалі: «Шпік! Млека!» — сала, малака... Былі наогул вельмі неакуратныя ў адносінах да насельніцтва — некаторыя рэчы, дуаму, рабілі проста «на зло». Напрыклад, садзіліся спраўляць фізіялагічную патрэбу акурат насупраць акна — каб усе бачылі.

— Не лічылі мясцовае насельніцтва за людзей — нібыта рэчы...

— Так. Мама, помню, спякла хлеб. Дастала з печы боханы, на стале яны ляжалі — і так пахлі прыемна, смачна. Немцы сядзяць, ядуць — і раптам заходзіць адзін партызан. Ён нешта сказаў па-нямецку, рассунуў іх і пасярэдзіне сеў — як свой... Потым немцы выйшлі, далі каманду сваім — і ў лес.

— А што гэта было?

— Потым бацька расказваў, што партызаны вырашылі пайсці на хітрасць, каб выманіць немцаў у лес. Накіравалі хлапца, які ўмеў крыху гаварыць па-нямецку, каб паведаміў, што група партызан нібыта хоча здацца. Немцы і выехалі ў лес. Неўзабаве такая страляніна пачалася — што вам не перадаць. Здаецца, і зараз у мяне ў вушах яна стаіць... Гэта партызаны наладзілі засаду. Шмат немцаў перабілі.

— Як вашай сям'і ўдалося ўратавацца?

— Бацька паспеў вывезці нас у лес.

— Яму паведамілі, што ідуць карнікі?

— Так, партызанская разведка працавала. Стала вядома: ідзе карны атрад, каб знішчыць Макаўе як партызанскую вёску... Разам з намі яшчэ некалькі сем'яў выехала.

Прычым мы, па сутнасці, і не збіраліся: маці, што змагла, хуценька кінула на сані — і ў лес. Усю скаціну пакінулі дома, у хляве.

У лесе прабылі некалькі дзён. Мужчыны назіралі за вёскай. Падыходзілі да Макаўя, залазілі на дрэвы і глядзелі, што там робіцца.

Як зараз бачу — бацька кажа: ціха ў вёсцы, людзі печы паляць, дым ідзе ва ўсіх хатах. І гаворыць старэйшай сястры: «Марыя, ідзі дадому, запалі печ, накармі скаціну» (у нас былі авечкі, свінні, карова, куры). Але Марыі, відаць, яшчэ колькі часу трэба было пажыць: бацька забыўся даць ёй ключы. А сама яна не скеміла, як улезці ў хату (усё ж было замкнёна: і хата, і хлеў). І яна вярнулася назад.

— Не выпаліла ў печы, не накарміла скаціну?..

— Гэта яе тады і выратавала. А як толькі Марыя вярнулася ў лес, мо праз паўгадзіны пачалася такая страляніна!.. І мы, купка людзей, што ўцяклі ў лес (чалавек 15), кінуліся хто куды — урассыпную. Мяне, меншую, бацькі падхапілі, Марыя за намі. Рая пабегла ў іншы бок. А Ніна-калечка бегчы не магла. Засталася яшчэ жанчына з грудным дзіцем і мая стрыечная сястра Паліна.

Калі ўсё сціхла, пачалі падыходзіць да месца нашай «дыслакацыі». Пачулі моцны плач Ніны. Яна і расказала: немцы падышлі ў белай маскіровачнай вопратцы, на лыжах. Перагледзелі рэчы, некаторыя забралі. З імі былі і паліцаі, яны запэўнівалі: «Не бойцеся, вярталіся ў вёску, вас ніхто не будзе чапаць». Паверылі, селі на сані і паехалі. І Ніна з імі. А потым яна падумала: як жа бацькі? Ніна падсунулася на край саней і скінулася. Немцы не сталі яе забіваць. Мабыць, падумалі: сама загіне гэтая дзяўчынка-інвалід, куды ж яна дзенецца ў снезе на марозе... Але ёй неяк удалося дапаўзці назад. Нікога не было — вось яна і галасіла, думаючы, што засталася зусім адна.

А Рая, якая бегла з суседзямі, зусім абяссілела. Але яе не пакінулі, мужчыны цягнулі за руку — каб адбегчы як мага далей. Таму што ўжо чулася гаўканне сабак. Не ведаю, чаму немцы іх не спусцілі. Можа, баяліся, што партызаны іх перастраляюць...

Калі немцы вярнуліся з лесу, сагналі ўсіх жыхароў Макаўя ў недабудаваны зруб. Аблілі бензінам і падпалілі.

Усе хаты — згарэлі.

Усе людзі, хто застаўся, не паспеў збегчы ў лес, — згарэлі.

І тая жанчына з немаўляткам, і стрыечная сястра Паліна таксама апынуліся ў палаючым зрубе.

Там магла б быць разам з імі і Ніна, калі б штосьці не падказала ёй выкінуцца з саняў, не вяртацца ў Макаўе.

Мужчыны залазілі на дрэвы і бачылі вялізны дым, які ідзе з Макаўя.

«Уся вёска гарыць», — сказалі нам.

...Немцы з'ехалі. Пэўна, не рызыкнулі другі раз ісці ў лес.

Якая стаяла ціш...

Бацька прывёз нас у Чырвоную Слабаду Чэрвеньскага раёна — адтуль родам наша маці. Мы жылі ў хаце яе брата. Бацька то з'яўляўся, то знікаў: ён быў сувязны ў партызан.

...А есці няма чаго. Успомнілі, што каля хаты ў Макаўі закапалі жыта. Бацька са старэйшай сястрой Марыяй адкапалі яго і везлі на санях у Чырвоную Слабаду. І раптам нямецкі самалёт. Лётчык страляў па іх з кулямёта. 19-гадовая Марыя атрымала смяротнае раненне.

— Які лёс... Выпадак не даў ёй застацца ў Макаўі, але праз некалькі месяцаў...

— Мабыць, сапраўды, — лёс...

У Чырвонай Слабадзе быў паліцай. Таму бацька пабаяўся пакідаць нас у вёсцы. Забраў у лес. Жылі да канца вайны ў зямлянцы.

Пасля вызвалення адразу накіраваліся ў Макаўе. Толькі коміны стаялі...

У Чырвонай Слабадзе нам далі хату, у якой размяшчалася да вайны калгасная кантора. Бацька адразу пайшоў на фронт. Восенню 1944-га атрымалі пахаванку: прапаў без вестак...

З фронту ў Чырвоную Слабаду жывым вярнуўся толькі адзін мужчына — мой дзядзька Няхай Андрэй.

Ведаю, што пасля вайны хтосьці спрабаваў будавацца ў Макаўі — але не змаглі там... А з вёскі амаль нікога не засталося — не было каму аднаўляць Макаўе.

* * *

У 1953 годзе Галіна выйшла замуж за ваеннага, малодшага лейтэнанта Несцерава. І пачалося качавое-вандроўнае жыццё: Камчатка — Курылы — Украіна... Планавалі перабрацца на радзіму, у Беларусь, але муж рана памёр. Галіна Паўлаўна так і засталася жыць у горадзе Ільічоўск Адэскай вобласці. Сын і дачка падарылі трох унукаў...

* * *

У Раі было чацвёра дзяцей, яны рана засталіся круглымі сіротамі. Іх дапамагала выхоўваць Ніна, якая жыве ў вёсцы Машчаліна Лядаўскага сельсавета Чэрвеньскага раёна. Дапамогу жанчыне аказвае і сельсавет, і райвыканкам. Звярталася за цэлай — прывезлі, за штыкетнікам, дрывамі — таксама прывезлі, прычым бясплатна. Адносіны з боку мясцовай улады да гаротніцы надзвычай уважлівыя.

* * *

Пару гадоў назад Галіна Паўлаўна была ў Беларусі.

— Калі я даведалася, што тагачасны старшыня Чэрвеньскага райвыканкама Лапатка Аляксандр Іларыёнавіч родам з Макаўя — пайшла да яго і кажу: «Госпадзі, якая я шчаслівая, што бачу чалавека з Макаўя!..» Прадставілася яму — і пачала расказваць, дзе мы жылі ў Макаўі і што я памятаю. Ён здзівіўся: «Вы ж яшчэ такая маленькая былі, і ўсё помніце». Гавару: я чамусьці думала, што гэта ўсё мне прыснілася і так засела ў душу. Але гэта сапраўды было...

Аляксандр Іларыёнавіч Лапатка зараз на пенсіі. Я адшукала яго, каб распытаць пра Макаўе — хаця сам ён нарадзіўся ў 1945 годзе.

Яго бацькам, Іларыёну і Надзеі, у той страшны дзень удалося выратавацца і выратаваць жыцці маленькім дзецям: сыну (1938 года нараджэння) і дачцэ (1940). Але двое старэйшых дзяцей Іларыёна засталіся ў Макаўі назаўсёды...

— За два кіламетры ад Макаўя знаходзіўся штаб партызан, Асіповіцкі падпольны райкам партыі і райкам камсамола, была ўзлётна-пасадачная паласа, — расказвае Аляксандр Лапатка. — Гэта быў цэнтр магутнага партызанскага руху... Калі пад Сталінградам для немцаў усугубілася абстаноўка, партызаны надта ім перашкаджалі. Вось немцы і вырашылі расправіцца з партызанскай вёскай... Бацькі расказвалі: дзевяць вазоў абгарэлых астанкаў везлі хаваць на ўскраек вёскі тыя нямногія, каму ўдалося выжыць, і сваякі загінулых... Прыкладна ў гэты ж час пацярпелі і некаторыя суседнія вёскі, іх таксама палілі...

* * *

Патэлефанавала ў Асіповіцкі райвыканкам удакладніць, у якім стане знаходзіцца помнік у Макаўі. Начальнік аддзела ідэалагічнай работы райвыканкама **Ганна ЗЕМЛЯНУХІНА** паведаміла, што да помніка традыцыйна ўскладаюцца кветкі на Дзень Перамогі і на свята вызвалення Беларусі.

Ганна Уладзіміраўна абяцала асабіста з'ездзіць у Макаўе, каб больш уважліва вывучыць сітуацыю. Мы звязаліся праз некалькі дзён.

— На жаль, выехаць у Макаўе пакуль не выпадае: была моцная навальніца, шмат дрэў павалена, вядзецца іх уборка, так што праехаць туды складана, — тлумачыла Ганна Землянухіна. — Але хачу адзначыць, што за кожным помнікам, устаноўленым у раёне, шэфствуе канкрэтная арганізацыя. За помнік у Макаўі, згодна з рашэннем райвыканкама, адказвае Градзянскае лясніцтва. Агульны кантроль ажыццяўляе Градзянскі сельскі выканкам. На абеліску ўказана, што 9 студзеня 1943 года вёска Макаўе была цалкам спалена нямецка-фашысцкімі акупантамі, загінулі 173 мірныя жыхары. Інфармацыя пра гэту трагедыю змешчана ў кнізе «Памяць. Асіповіцкі раён».

Сакратар Градзянскага сельскага савета Галіна Уладзіміраўна Кірыновіч паведаміла мне, што помнік у Макаўі ў нармальным стане. Канешне, помнік гэты не новы. Хочацца, каб помнікі былі сучаснымі, манументальнымі, са скульптурнымі кампазіцыямі. Добры мемарыяльны комплекс у Брыцалавічах — там у студзені 1943 года загінула больш як 700 чалавек... Дарэчы, па кожным помніку райвыканкам заклаў у бюджэт пэўныя сродкі, каб да 65-годдзя вызвалення Беларусі ўсё максімальна дагледзець.

У Асіповіцкім раёне ў час Вялікай Айчыннай вайны пацярпелі вельмі шмат вёсак. Знішчаны разам з жыхарамі і не адрадзіліся пасля вайны вёскі Бартное, Весялова, Май, Макаўе, Старонка. Знішчаны разам з людзьмі і адноўлены пасля вайны вёскі Асавок, Бозак, Брыцалавічы, Буда, Вярбілава, Лочын, Мажное, Пагарэлае, Палядкі, Вялікая Гарожа... Шмат вёсак знішчана з часткай насельніцтва. Некалькі гадоў таму райвыканкам выдаў матэрыялы пра спаленыя вёскі Асіповіцкага раёна. У вёсцы Градзянка пражывае Лідзія Данілаўна Татарына, яна родам з Макаўя. У час вайны была ў партызанах. Яна брала ўдзел у пахаванні астанкаў спаленых людзей.

Нагадаю, у час Вялікай Айчыннай вайны акупанты знішчылі больш як 9200 беларускіх вёсак, з іх больш як 5 тысяч спалілі разам з усім ці часткай насельніцтва. 628 вёсак падзялілі лёс Хатыні.

Таццяна ПАДАЛЯК.

Тэлесеткі

СПРЭЧКІ З ПРАЦЯГАМ

Глядзець ці не глядзець?

На Першым канале амаль адначасова пачаліся адразу два медыцынскія серыялы — «Клініка» і «Часткі цела». І калі першы — маладзёжны, забаўны, камедыйны, то ахарактарызаваць другі больш складана. У апісанні значыцца «камедыйная драма». Але ў першых жа серыях — сцэны, як кажуць, не для падлеткаў і слабанервовых. Пластычныя аперацыі «буйным планам», без прыхарошвання, адкрытыя сэксуальныя эпізоды... Нядзіўна, што некаторыя чытачы, патэлефанаваўшы ў рэдакцыю, абурыліся: «Чаму Першы НАЦЫЯНАЛЬНЫ канал паказвае нам гэта?». Пытанне «Звязда» пераадрасавала ў дырэкцыю ліцэнзійных праграм і кінапаказу Белтэлерадыёкампаніі.

— Два медыцынскія серыялы запар — гэта простае супадзенне або спецыяльная падборка? — пацікавіліся мы.

— Медыцынская тэма сапраўды папулярная ў серыялах, бо датычыцца кожнага. Менавіта ў бальніцах часта разыгрываюцца сапраўдныя чалавечыя драмы, вырашаюцца лёсы, — перакананая **Галоўны дырэктар** памянёнай дырэкцыі **Ларыса МАЛАХАВА**. — Пры планаванні адзначалася, што абодва серыялы на медыцынскую тэму, але паколькі яны розныя па жанры, разлічаныя на розную аўдыторыю, мы палічылі магчымым адначасовы кінапаказ.

Ну добра, няхай сабе серыялы ідуць адначасова. Па некаторых каналах іх восем штук на дзень, і нічога — для кожнага знаходзіцца аўдыторыя. Але наконт «Частак цела» размова асобная. З аднаго боку, на здымкі ў гэтым серыяле стварылася цэлая чарга «зорак» — Ніколь Кідман, Мадонна, Брук Шылдс, Аланіс Марысет пажадалі на ўласным прыкладзе адлюстраваць цуды пластычнай хірургіі. А з іншага — навязаны культ прыгожага цела ўзмацняе ў «чалавека звычайнага» комплекс непаўнацэннасці, асабліва калі гэты чалавек — падлетак. Нездарма ў Амерыцы бацькоўскі камітэт нават праводзіў нацыянальную кампанію, каб забараніць паказваць серыял на агульнадаступным канале.

— Якой рэакцыі вы чакаеце ад беларускіх тэлегледачоў? — удакладнілі мы ў Ларысы Іванаўны. — І ці будуць нейкія эпізоды «выразаны» па этычных меркаваннях?

— Думаю, ніхто не будзе аспрэчваць сцвярджэнне Ф.М. Дастаеўскага пра тое, што прыгажосць выратуе свет. І калі ў серыяле здымаліся прыгожыя, вядомыя, таленавітыя людзі — гэта дадае серыялу прывабнасці. Нездарма ж, дарэчы, «Часткі цела» адзначаны прэміяй за лепшы падбор акцёраў.

На мой погляд, паказ серыяла «Часткі цела» не стварае культу «прыгожага цела». У кожнай серыі мы сочым за лёсам пацыентаў, якія спрабуюць за прыгожай знешнасцю схаваць свае жыццёвыя праблемы і глыбокія псіхалагічныя комплексы. І якраз стваральнікі фільма вельмі ўдала падкрэсліваюць, што прыгожае цела — не панацэя ад усіх праблем. У серыяле закранаюцца самыя важныя пытанні для кожнага чалавека — пытанні чалавечых стасункаў, маральныя і этычныя, адчуванне абавязку і адказнасці. Таму, я лічу, беларускія тэлегледачы змогуць годна ацаніць добры сцэнарый, удалую рэжысёрскую работу і таленавітую ігру прыгожых акцёраў. Нягледзячы на шумныя спрэчкі вакол гэтага серыяла, яго высока ацанілі не толькі гледачы, але і суровыя крытыкі. Серыял з'яўляецца ўладальнікам самых прэстыжных узнагарод: прэміі «Залаты глобус», «Эммі», «Спадарожнік» Міжнароднай акадэміі кінапрэсы, а таксама прэміі за лепшы падбор акцёраў і за лепшую музыку да серыяла.

Што да забаронаў — усім вядома на практыцы, што ўсялякая забарона толькі павышае інтарэс. У кожнага гледача ёсць права выбару: глядзець серыял ці не глядзець. А вось уносіць змяненні і скарачэнні ў серыял недапушчальна, бо гэта парушэнне аўтарскага заканадаўства.

— Хто і як увогуле вызначае, якія серыялы набываць для паказу? Ці ёсць на Белтэлерадыёкампаніі экспертны савет, які папярэдне праглядае фільмы, сочыць за навінкамі кінарынку і вытворчасці?

— Набыццё серыялаў — гэта калектыўны творчы працэс, у якім удзельнічаюць адразу некалькі структур Белтэлерадыёкампаніі. Першапачаткова фарміруецца сетка вяшчання, дзе вызначаецца час і дзень дэманстрацыі серыяла, потым у адпаведнасці з канцэпцыяй вяшчання, улікам патэнцыяльнай глядацкай аўдыторыі і яе пераваг ідзе падбор серыялаў. Рашэнне аб закупцы прымаецца на пасяджэннях спецыяльнай камісіі Белтэлерадыёкампаніі, куды ўваходзяць розныя спецыялісты: прадзюсары каналаў, эканамісты, маркетолагі, кіназнаўцы і г.д. Папярэдне мы збіраем падрабязную інфармацыю пра серыялы і іх стваральнікаў, акцёрскі склад, вызначаем, у які час гэты серыял можа сабраць найбольшую аўдыторыю. Калі серыял ужо быў паказаны на іншых тэлеканалах, то глядзім медыяпаказальнікі. Для вывучэння пераваг кінагледачоў праводзім фокус-групы. Натуральна, мы маем магчымасць праглядзець калі не ўвесь серыял, то хоць бы некалькі серый. Так што, як бачыце, набыццю нобыццю кожнага серыяла папярэднічае вялікая аналітычная работа.

— А вам асабіста якіх серыялаў не хапае на беларускім тэлебачанні? Што з убачанага вам спадабалася?

— Хацелася б паболей якасных серыялаў расійскай і айчыннай вытворчасці. На маю думку, серыял павінен быць такога ўзроўню, калі ён «ператвараецца» ў шматсерыйнае дабротнае мастацкае кіно. Самымі ўдалымі праектамі мінулага сезона лічу прэм'ерныя паказы серыялаў «Ліквідацыя» і «Апостал», якія сама з вялікім задавальненнем глядзела.

Пакуль адны спрачаюцца вакол серыялаў, другія іх актыўна глядзяць. Лета, якое лічыцца зацішшам для тэлепраграм, дырэкцыі кінапаказу толькі дадае работы. «Аб'ём мастацкіх фільмаў і серыялаў у летні час у нас толькі павялічваецца, прычым, хачу заўважыць, іх якасць ад гэтага не губляецца, — гаворыць Ларыса Малахава. — Летам на каналах дэманструюцца як прэм'еры (напрыклад, «Часткі цела», «Калі ў Вас няма цёкі», «Бухта страху», «Рака-мора»), так і паўторныя, праверэаныя часам і ўпадабаныя гледачамі серыялы і фільмы. Да таго ж поўным ходам ідзе падрыхтоўка да новага сезона. Спадзяюся, кожны тэлеглядач зможа знайсці для сябе штосьці цікавае на каналах Белтэлерадыёкампаніі».

ДА СЛОВА

- *Серыялы пераўзыходзяць мастацкія фільмы па аб'ёме паказу ў 1,5 раза. 60 працэнтаў агульнага часу ўсяго кінапаказу прыпадае на долю серыялаў, і толькі 40 — на долю фільмаў.*
- *Самы працяглы серыял, паказаны Белтэлерадыёкампаніяй, — «Каханне як каханне» (ішоў на Першым канале). У ім ажно 320 серый!*
- *Самым рэйтынгавым у мінулым сезоне стаў серыял «Апостал». А вось які быў самым дарагім, даведацца так і не ўдалося — у Белтэлерадыёкампанії кажуць: камерцыйная тайна.*
- *Што да скандальных «Частак цела», якія выклікалі ў адных гледачоў шчырае захапленне, а ў іншых — не менш шчырае абурэнне, то сацыёлагі сцвярджаюць, што за мінулы тыдзень гэты серыял стаў галоўнай падзеяй вячэрняга эфіру. Паводле даных аналітычнага цэнтра «ЕсооМ», больш як трэць аўдыторыі (35,5 працэнта) увечары аддала перавагу менавіта «Часткам цела». Большасць апытаных, асабліва моладзь і жанчыны, адзначылі высокі прафесійны і мастацкі ўзровень здымак і вырашылі, што надалей працягнуць глядзець серыял. А ўлічваючы, што беларусам абяцалі паказаць як мінімум чатыры сезоны «Частак цела», галоўныя скандальныя моманты яшчэ наперадзе...*

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Мінгандаль узмацніў кантроль за выкананнем тэлеканаламі Беларусі нормаў закона аб рэкламе

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведаміла намеснік начальніка ўпраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Мінгандлю Вольга Краўцова.

Яна расказала, што ў красавіку-маі гэтага года быў арганізаваны маніторынг, дзе парушэнні, звязаныя з перавышэннем узроўню гуку рэкламных ролікаў адносна транслюемых праграм, выяўлены ў дзейнасці практычна ўсіх асноўных беларускіх каналаў: АНТ, НТБ-Беларусь, СТБ, РТР, 8-га канала, Першага музычнага канала. Міністэрствам ужо складзены пратаколы на 8-ы канал і Першы музычны. Суд прыняў рашэнне аб накладанні адміністрацыйнай адказнасці ў адносінах да 8-га канала. Справа, якая датычыцца Першага музычнага, знаходзіцца на разглядзе. У адносінах да астатніх тэлерагінаў заканчваецца працэдура складання пратаколаў.

Законам уведзена новая норма, якая прадугледжвае, што гук рэкламы не павінен быць вышэйшы за гук перапыненай ёю трансляюемай праграмы.

Цяпер акрама гуку кантралюецца і будзе кантралявацца ў далейшым працягласць рэкламнага блока — не больш за 4 мінуты, рэкламы на працягу гадзіны — не больш за 18 мінут.

Простая мова

ЯК ПРЫЯЗДЖАЕ ШЧАСЦЕ

Замест эпіграфа, альбо, як заўжды — што бачыла. І бачу...

Мінск, «тралік» (так — скарочана — цяпер тралейбус завуць), мілагучная аб'ява: «Наступны прыпынак — «Дом друку».

— Мама, а кто такой друк? — пытае чыёсьці дзіця.

— Не знаю, сынок. Наверно, герой какой-то...

Штораніцы (і каторы ж гадок?!) выходжу на гэтым прыпынку, гледзячы пад ногі — натоўп — лавірую там між людзьмі.

...Трэцяга дня на асфальце красоўкі ўбачыла — велізарныя, беласнежна-белыя, на калматых, голых нагах...

Спужалася — бокам абышла. Аж сорамна потым стала. За сябе. На такім «геройскім» прыпынку.

ПАЧНІ

У знаёмай гаспадарцы — набытак: восем прыгожых маладзенькіх курачак. Самая адважная з іх праз тыдзень знеслася. Праўда, яечка было — з грэцкі арэшак.

— Гэта нічога, — пасміхаўся дзед-гаспадар, яго разглядаючы. — З нечага ж трэба пачаць?..

То чаму б, маўляў, не з малога, калі, паводле адной з прыказак — хто пачаў, зрабіў палавіну?

ПАКУЛЬ НЕ ПОЗНА

Мода пайшла — шукаць аднакласнікаў, «спісвацца», сазвоньвацца. І само сабой — сустракацца. Хто праз 10 гадоў пасля школы, хто праз 30, хто...

Сёлета, 2 ліпеня, сустракаліся аднакурснікі, якія скончылі філфак БДУ ў 1951-м — 57 гадоў таму!

Гучыць, праўда? Зусім не так, як 10. Альбо нават 30. Шкада, што чуюць гэта не ўсе. Хто таксама хацеў бы сустракацца. Са сваімі. Тут.

СКАЗАНА? ЗРОБЛЕНА

Горад. Гастраном. Ля дзвярэй яго — пяць прыступак. Прычым досыць крутых. Побач з імі — «нешта». Што — здагадацца няцяжка: «ціпа — пандус», як моладзь кажа. Як ён з'явіўся — таксама: кіраўніцтву, відаць, каманду «спусцілі» — зрабіць... Думаць, што і для каго — часу не было, бо трэба ж хутчэй выконваць.

Выканалі, далажылі каму след: маўляў, усё зроблена, пандус ёсць.

А што па ім, пры ўсім сваім жаданні, іноўзін інвалід-калясачнік у гастраном не заедзе (ды і назад не спусціцца... Хіба — свят-свят — на злом галавы) справа дзясятая... Гастраномаў жа ў горадзе шмат.

А інвалідаў? Хто іх дзе бачыць?..

ПАСЕЕШ ПРЫВЫЧКУ...

Бабіна дарога — ад печы да парога.

Побач, як быццам — адна «кропачка» ад другой — а столькі вёрстаў наматаеш! (Як казаў адзін з сяброў — я разумею, чаму жанчынам столькі тапачак трэба: яны ж топчуцца, топчуцца, топчуцца).

Тапчуся, значыць — гатую абед. І нават не адна — з памочніцай, маладой беласпінай коткай. Седзячы на падваконні, яна ўпрыгожвае кухню, потым, скокнуўшы ўніз, выпісвае цёплыя пяшчотныя кругі каля ног. Ну грэх жа не аддзячыць? Частую. Раз, другі, трэці і...

Пасееш прывычку — пажнеш характар: котка больш «не працуе» — прынамсі, не лезе на падваконне, не саграе. Яна садзіцца «ўзбоч маршрута» і, здаецца, немірагаючы, глядзіць уверх, чакае — калі ж адтуль нешта звалілася?

...І чаканне гэта зразумелым было б, нават заканамерным, калі б за печчу не шасталі мышы.

ВОСЬ І КРУЦІСЯ...

Крамка. Вітрына. Прывычнага і (на мой погляд) здзеклівага «Покупайте белорусское!» над ёю няма, а вось тавары ёсць: касметыка — нашай, айчыннай вытворчасці. Пакуль на памяці, думаю, трэба што-кольвечы ўзяць. Хоць фірма і незнаёмая...

— Мне крэм, — кажу прадавачцы. — Вось гэты і той.

— А шампунь? — раптам прапануе яна.

— Шампунь — не трэба, я іншым карыстаюся.

— Дык у нас жа акцыя — бярыце: трэцяя пакупка — бясплатна.

«З чаго б гэта? — насцярожана пытаю ў сябе. — І што з тым шампунем рабіць?»

— Некаму аддасцё, — бы чытаючы думкі, кажа дзяўчына. — Альбо сабаку памыеце...

«Купанне вясковага дварняка» (а тым больш у шампуні...) гэта, безумоўна карціна! Маслам, можна сказаць. Пакуль смеючыся (у душы) яе ўяўляю, прадавачка адлічвае грошы, у пакецік пакуе пакупкі.

«...Мусіць, праляцела я з імі? Мусіць, няякасны той крэм, той шампунь, калі да іх «у нагрузку» яшчэ штось даюць?» — думаю па дарозе дамоў.

А з другога боку, мо якраз наадварот: вытворца ведае, што ідоў у нас досыць кансерватыўны — баіцца купляць штось новае і таму, каб прабіцца на рынак, каб знайсці пакупніка, гатовы на пачатку аддаваць тавар задарма, ладзіць такія вось акцыі...

Акцый, як высвятляецца, пакупнік баіцца таксама.

ДОЧКІ-МАЦЕРЫ

Лета. Ягады. На вакзале (ды ў выхадныя...) з вядром (а то і двума-трыма) ледзь не кожны. А ўжо змучаныя...

Дзвюм бабулям у «траліку» сесці пашчасціла — побач. Відаць, на раёнах адна спытала ў другой:

— Унукам ягаду везяце?

— Ну, — ціха адказала тая і праз хвільку дадала, — а, зрэшты — халера яго знае... Клубніцы во зрадзілі — трэцяга дня цэлае вядро назбірала, прывезла. Перабрала, кожнаму па талерцы намыла, пад нос паставіла — з'елі, нават падзякавалі. Назаўтра, думала, даядуць астатняе — у халадзільніку ж, гатовае, задарма (людзі грошы плацяць)... Альбо замарозіць, ці варэнне звараць. Па другое вядро паехала — ледзь прывалакла. Пытаюся ў дачкі, дзе ж першае? «А, — кажа, — самім есці не хацелася дык я на работу бабам завезла»... Мо і во гэтыя ім завязе?

— Гэта нічога, хоць бабыды з'яўдуць, — уздыхае яе спадарожніца, — а ў мяне летась год няўдалы быў, на дачы, можна сказаць, нічога не вырасла. Дзякуй суседкам. Ведаюць, што ў мяне двое праўнукаў, — падзяліліся. Сама я ніводнай ягадкі не з'ела. Усё ў слоічкі, усё малым. Ім жа вітаміны трэба. Прыехалі — цэлы багажнік ад мяне забралі. Гэта — увосень. А зімой паехала іх праведаць, адкрыла халадзільнік. Гляджу — цэлая палічка слоічкаў: усе паадкрываныя і ў кожным цвілі на палец. Пытаю ўнучку, што ж гэта было? А яна вочы на мяне паставіла і адказвае: «Бабушка, но я же должна знать, какое варенье мои девочки любят больше? Вот мы и открыли все сразу — им попробовать...».

— Во-во... Чужую працу ніхто не шануе, не цэніць, — з болем прызналі жанчыны, цягнучы вёдры... да самых родных — да ўнучак-дачок.

НЕ ЗБЫЛОСЯ

Як па сённяшніх мерках — сям'я ў іх была вялікая: бацька, маці, чацвёра дзяцей, дзядуля. Хатка — наадварот, малая. Складалася яна з вялікіх сеняў, кухні, залы з сінім жалезным ложкам (для бацькоў) і вузкай доўгай каморкі, дзе спалі ўсе астатнія. Галі — адзінай дзяўчынцы, да таго ж старэйшай — там няёмка было (некамфартна, як цяпер кажуць). Таму (ды і ці толькі таму?!..) пасля васьмігодкі яна паехала ў горад, уладкавалася на працу. У заводскім інтэрнаце ёй ложак-месца далі.

Спала і бачыла там (марыць не шкодна!), што гэта ненадоўга, што не сёлета дык налета, мо, возьме хто замуж, мо займее яна свой асобны пакой (хай самы маленечкі), каб, калі што, зачыніцца і пабыць з'явіўся потым, пасля нараджэння першынца.

Яшчэ пазней, пасля нараджэння двойні, пераехалі ў сваю, большменш прыстойную кватэру. Куды потым забрасі хворую свякроў і куды, падросшы, сыны па чарзе папрывозілі жонак, папрывозілі з радзільняў дзяцей. Мара пра свой асобны, хай самы маленькі пакой заставалася марай — не збывалася... Ну ніяк...

І не збылася, бо... памерла жанчына раптоўна, летам, у гарачыню. Таму, як прасіла, на вясковыя могілкі, «да сваіх», яе ніхто не павёз, — крэміравалі, урну з прахам падзаховалі ў магілу... былога мужа.

Так прасцей даглядаць, рашылі сыны.

НАЗАВІ... ХОЦЬ ГАРШКОМ?

...Якуб Колас пра сябе: «Вырас на адзіноце».

У наш час — гэта, відаць, немагчыма, бо ўсюды людзі, усюды машыны, гукі, пахі, усюды... рэклама.

У метро для яе плазменныя экраны павесілі — кліпы круцяць: хоць-нехаць глядзіш (на што і разлічана), хоць-нехаць слухаеш, адпаведна — хоць-нехаць думаеш над пытаннем, змешчаным на экране ў ражку: «Хочаш такую?». У сэнсе — мелодыю ў свой мабільнік?

Але ж пры гэтым, на экране, паказваюць жывых людзей, у тым ліку — вельмі вядомых спявачак.

Няўжо іх (у святле апошніх трактовак слова «хачу»), не бянтэжыць гэта пытанне? Няўжо галоўнае — «круціцца», «свяціцца» і быць на слыху? А ўсё астатняе, — справа дзясятая?

КЛІН КЛІНАМ?

Горад, дзень, двор, два сябрукі пасяродцы.

— Вынь, бачыш, мой балкон на пятым паверсе, — паказвае адзін.

— Бачу... Прасторны, — зайздросціць другі. — Ты нават гамак павесіў.

— Не! — абрывае суразмоўца, — і не я, і не гамак — жонка... Свой ліфчык.

Гэта — анекдот. Зараз — праўда.

Горад, праспект, дом. На балконе трэцяга паверха кабета з'явілася — сагнулася, зірнула ўніз, ці няма там каго, перакінула палавік (што звычайна кладуць ля дзвярэй) і стала страсаць — жывы пясок, на... чужыя «гамакі», на чужыя «парашуты» (за рызінку «прышчэпленыя» вялікія жаночыя трусы)...

Хамства? Ну вядома ж! Але можа крыснае?..

Мо хоць так, хоць некага можна навучыць не вешаваць людзям на вочы тое, што нельга? Вывешваць...

ЯК ПРЫЯЗДЖАЕ ШЧАСЦЕ

Вёска. Прыпынак — з крыху паводдаль прывязаным да плоту канём, з бабай на возе і досыць маладжавым мужыком побач. Раз-

Краіна здароўя

Выпуск № 37 (93)

РАННІЯ КАВУНЫ І ДЫНІ МОГУЦЬ НАНЕСЦІ ШКОДУ ЗДАРОЎЮ

У сярэдзіне ліпеня на сталічных прылаўках з'яўляюцца першыя кавуны і дыні. Між тым, раннія культуры могуць нанесці шкоду здароўю, папярэджваюць у Мінскім гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі.

Як расказалі спецыялісты, у гэты перыяд ва ўстановы аховы здароўя Мінска звяртаюцца людзі з адзнакамі атручэння бахчавымі. «Гэта нядзіўна, бо ліпень — яшчэ не сезон. Для таго, каб хутчэй давесці няспелыя плады да таварнага выгляду, іх нярэдка апрацоўваюць нітратамі і «абколваюць» ін'екцыямі. І гаворка аб карысці ўжо не ідзе, галоўнае не нанесці сур'ёзнай шкоды здароўю. Таму з дэгустацыяй кавуноў і дыняў лепш пачакаць да канца жніўня», — раяць медыкі.

Перш чым спакусіцца на пакупку паласатага кавуна або пахучай дыні, трэба ведаць, чым кіравацца пры выбары. Спачатку трэба пастукаць — спелы кавун, насупрак існуючай думкі, павінен выдаць глухі гук, а не гучны. Сцісніце яго рукамі. Калі пачуеце трэск — смела купляйце. Звярніце ўвагу на земляную пляму на баку. Пажаданa, каб яна была жоўтай, а не белай. Правядзіце па лупіне пазногцем. Спелы кавун лёгка падзерці.

У перакормленага нітратамі кавуна колер мякаці інтэнсіўна чырвоны з фіялетавым адценнем. Валокны, якія ідуць ад асяродка да лупіны, у здаровага кавуна белыя, але ні ў якім разе не жоўтыя (ад яркага да цёмнага адценняў). У «нітратнага» кавуна паверхня зрэзу гладкая, глянцавая. У спелага зрэз іскрыцца, як свежавыпаўшыя сняжынкі. Кавалак мякаці кавуна таксама трэба расцерці ў шклянцы з вадой. Калі вада стане чырвонай або руковай, такі кавун не варта есці. Калі ж кавун добры, вада проста памутнее.

Спелая дыня мае моцны дынны водар, які сыходзіць ад лупіны. Гук пры пастукванні павінен быць глухім. Калі націснуць на лупіну дыні з процілеглага боку ад сцябла, то ў спелай паверхня паддаецца націску. Калі ж лупіна цвёрдая, то дыня недаспелая. Лепш не есці дыню, калі на ёй паверхні ёсць пашкоджанні і мяккія месцы: там могуць развівацца ўзбуджальнікі сальманелёзу і батулізму.

У Мінскім гарадскім цэнтры гігіены і эпідэміялогіі таксама раяць не захоўваць кавун у халадзільніку. «Калі вы цэніце кавун не толькі за салодкасць і жывацворную вільгаць, але і за пажыўныя ўласцівасці, захоўвайце яго пры пакаёвай тэмпературы. Пры такіх умовах утрыманне ў ім бета-караціну вышэй у два разы, а ўтрыманне лікапіну ў параўнанні з іх утрыманнем у ахаладжаным кавуне больш на 20 працэнтаў», — кажуць спецыялісты.

Калі кавуны захоўваюцца пры пакаёвай тэмпературы, станоўчыя змяненні ў іх можна заўважыць нават няўзброеным вокам: дзякуючы павелічэнню канцэнтрацыі лікапіну, яны набываюць больш цёмную афарбоўку, а пародскі на іх становяцца вузейшымі. Непасрэдна перад ужываннем кавун можна ахаладзіць, на яго карысных уласцівасцях істотна гэта не адаб'ецца. Бета-каратцін і лікапін вядомыя сваім станоўчым уздзеяннем на зрок і імунную сістэму чалавека. Іх актыўна выкарыстоўваюць пры прафілактыцы і лячэнні анкалагічных захворванняў.

Кар. БЕЛТА.

Інфарм-укол

Квасок сілы аднаўляе

Квас — прадукт кіслamалочнага браджэння і ўздзейнічае на арганізм прыкладна гэткім жа чынам, што і кефір, ацыдафілін і сыраквашa.

Гэты напой здольны рэгуляваць абмен рэчываў, дзейнасць страўнікава-кішачнага тракта і сардэчна-сасудзістай сістэмы. Падчас цяжкіх сельскагаспадарчых работ сняляе заўсёды аддавалі перавагу квасу, які цудоўна аднаўляе сілы. Цяпер гэту вартасць пацвердзілі і вучоныя. Вітамінаў у квасе няшмат, але сілы аднавіць гэты напой сапраўды здольны. Для хатняга квасу хуткага прыгатавання спатрэбіцца 1 кг ржаных сухароў (лепей з рознага хлеба — іржанога, барадзінскага), 750 г цукру, 50 г разынак, 10-15 лісцікаў чорнай парэчкі, 2-3 ст. лыжкі вадкіх піўных дражджэй або 25 г хлебапякарных дражджэй, 2 ст. лыжкі сухой мяты, не перцавай. Падсушаныя ў духоўцы сухары заліць вядром кіпеню і даць настояцца 12 гадзін. Асобна заварыць мяту, асобна — чорнапарэчкавы ліст, настойваць 5 гадзін. Настой квасу пераліць пасля вытрымкі ў іншы посуд, дадаць да яго працэджаны настой мяты і парэчкі, цукар, гатаваны ў 0,5 л вады, дрожджы. Размяшаць, пакінуць на 4 гадзіны. Зняць пену, працадзіць, разліць па бутэльках, дадаць у кожную па некалькі разынак, пакінуць на два дні для вытрымкі на холадзе.

Малако супраць доўгага жыцця?

Аказваецца, малако не толькі карысны прадукт харчавання, але і... шкодны. Адсутнасць малака ў рацыёне харчавання можа служыць складовай даўгалецця.

Добра вядома, што доўгажыхарамі планеты з'яўляюцца японцы. Гэты феномен тлумачыцца ў тым ліку спецыфічнасцю іх нацыянальнай кухні — мінімум апрацоўкі прадуктаў, шмат злакавых і рыбы. Але ёсць і яшчэ адзін момант. Японцы не ўжываюць малака. Для арганізма важна здольнасць засваення кальцыю, а засвойвацца кальцыю дапамагае крэмній. Але пры недахопе апошняга кальцый «асядае» і тым самым спрыяе павышэнню ўзроўню халестэрыну ў крыві, што прыводзіць да рызыкі развіцця сардэчна-сасудзістых захворванняў. Дыетолагі раяць замест малака ўжываць садавіну і гародніну, пакольк ў іх назіраюцца аптымальныя суадносіны кальцыю і крэмнію.

Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.

Азбука бяспекі

Не пакідайце салаты на потым

Лета — час свежай агародніны і, зразумела, вельмі важным з'яўляецца пытанне чысціні і бяспекі гэтай прадукцыі, асабліва ўтрымання нітратаў. На Гродзеншчыне іх перавышэнне летась было выяўлена лабараторыямі ЦГЭ ў 22 пробах (4,7 працэнта).

— Такія даследаванні можна выканаць у любым цэнтры гігіены і эпідэміялогіі, а таксама ў лабараторыях ветсанэкспертызы на рынках, — адзначае **ўрач-гігіеніст Гродзенскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Анжэла ВАРАБЕЙ.**— Купляючы агародніну, садавіну, заўсёды пытайце аб утрыманні нітратаў, гэта інфармацыя павінна быць у магазінах.

На ўтрыманне нітратаў у глебе, вадзе, раслінах уплываюць адходы жывёлагадоўчых гаспадарак, неўпарадкаванае захоўванне гною і бытавога смецця. Важна праводзіць санітарную ачыстку тэрыторыі і правільна прымяняць мінеральныя і арганічныя ўгнаенні.

— Гаспадары прысядзібных участкаў, дачнікі аддаюць перавагу ўгнаенню натуральнага паходжання — гною. Сапраўды, ураджайнасць ад яго расце, але і ўтрыманне нітратаў у агародніне рэзка павялічваецца. Таму больш — яшчэ не значыць лепш, — папярэджвае Анжэла Вячаслававўна. — Трэба таксама ведаць, што ўтрыманне нітратаў у раслінаводчай прадукцыі вагаецца ў залежнасці ад часу сутак, мінімальная іх колькасць вечарам, ноччу і раніцай.

ЯК СКАРАЦІЦЬ УТРЫМАННЕ НІТРАТАЎ У АГАРОДНІНЕ?

● Колькасць нітратаў скарачаецца пры тэрмічнай апрацоўцы (вымочванне — на 20—30 працэнтаў, варка — на 60—80 працэнтаў).

● Старыя клубні бульбы заліваюць аднапрацэнтным растворам кухоннай солі.

● У кабачкоў, баклажанаў трэба зрэзаць верхнюю частку, якая прымыкае да пладаножкі.

● Агародніну, асабліва агуркі і кабачкі, перад ужываннем варта ачысціць ад лупіны.

● У агуркоў, буракоў, рэдзькі неабходна зрэзаць абодва канцы, паколькі тут самая высокая канцэнтрацыя нітратаў.

● Захоўвайце агародніну ў халадзільніку, бо пры тэмпературы +2 градусы немагчыма ператварэнне нітратаў у нітрыты.

● Шкодны ўплыў нітратаў на арганізм скарачаецца ўжываннем у ежу вітамінаў С і Е.

● Не варта выкарыстоўваць расол і марынад, у іх утрымліваецца шмат нітратаў.

● Рыхтуйце салаты непасрэдна перад іх ужываннем, не пакідаючы на потым.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Рух дзеля жыцця

«ТЭХНІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ» ДЛЯ ГАЛОЎНАГА «МАТОРА»

Кожны, хто набывае аўтамабіль, цяпер варты ў маіх вачах спачування. Проста я дакладна ведаю: чым часцей заскокваеш на зручнае сядзенне, тым далей «едзеш» ад свайго здароўя. Ва ўсякім выпадку, я проста не ведаю аўтамабілістаў, якія б прымушалі сябе «падскочыць» да бліжэйшай «булачнай» сваім ходам... Так што па адным толькі факце актыўнага росту колькасці аўтатранспарту можна дакладна прагназаваць і рост колькасці сардэчна-сасудзістых захворванняў.

Наогул не сакрэт, што большасць сучаснага насельніцтва зямнога шара праяўляе недастатковую фізічную актыўнасць. Паводле заходнееўрапейскіх назіранняў, зусім маларухомы лад жыцця вядуць ад 30 да 50 працэнтаў людзей і яшчэ 20—40 працэнтаў рухаюцца хоць і крыху больш, але недастаткова для эфектыўнага ўмацавання здароўя. Навошта ж чалавеку так патрэбны хада, бег, фіззарадкі і фітнэсы, а галоўнае, як з дапамогай апошніх умацаваць здароўе? Вось аб чым падрабязна расказвае вядучы навуковы супрацоўнік лабараторыі медыцынскіх інфармацыйных тэхналогій Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра «Кардыялогія» Ігар КАЗЛОЎ.



Фота Пятра ФАМІНА.

СПАЧУВАННЕ ЛОНДАНСКІМ ВАДЗІЦЕЛЯМ

— Пры нізкай рухальнай актыўнасці зніжаецца супрацiўляльнасць арганізма да разнастайных стрэсавых уздзеянняў, змяншаюцца функцыянальныя рэзервы розных органаў і сістэм, абмяжоўваюцца рабочыя магчымасці арганізма. Ступень рызыкі сардэчна-сасудзістых захворванняў для маларухомых людзей прыкладна такая ж, як і пры наяўнасці іншых, больш вядомых фактараў рызыкі — курэння, гіпертаніі і гіперхалестэрынеміі.

Упершыню роля гіпадынаміі як фактара рызыкі ішэмічнай хваробы сэрца была паказана англійскім вучоным Морысам. Яго высновы былі заснаваны на шматгадовым назіранні за ўзнікненнем ішэміі і яе фатальнага наступства — смерці ад інфаркту міякарда або раптоўнай каронарнай смерці ў лонданскіх вадзіцеляў і кандуктараў аўтобусаў. Кандуктары пастаянна рухаліся па двухпавярховых аўтобусах, а вадзіцелі, зразумела, сядзелі ўвесь свой працоўны дзень. Частата ўзнікнення інфаркту міякарда ў шафёраў аказалася ў 2 разы, а смяротнасць ад апошняга — у 3 разы вышэй, чым у кандуктараў. Аналагічнае назіранне вучоны правёў і сярод паштовых служачых. Клеркі паштовых ведамстваў хварэлі і паміралі ад ішэміі ў 2—3 разы часцей, чым іх фізічна актыўныя калегі — паштавікі.

ХОЦЬ БЫ 30 ХВІЛІН ШТОДНЯ

— Фізічная работа суправаджаецца павелічэннем колькасці сардэчных скарачэнняў. Чым вышэй інтэнсіўнасць работы, чым больш значным з'яўляецца намаганне, чым больш энергіі затрачваецца на гэта намаганне, тым часцей б'ецца сэрца. І наадварот, па частасце сардэчных скарачэнняў падчас фізічнай нагрузкі можна меркаваць аб яе інтэнсіўнасці.

Паводле рэкамендацый Еўрапейскага таварыства па атэрасклерозе, падчас выканання розных фізічных практыкаванняў, а гэтым практыкаваннем можа быць хуткая хада, бег, работа на загарадным участку, удзел у якой-небудзь спартыўнай гульні і г.д., частата сардэчных скарачэнняў павінна быць наступнай: ва ўзросце 20—29 гадоў — 115—145 скарачэнняў у хвіліну, 30—39 — 110—140, 40—49 — 105—130, 50—59 — 100—125, 60—69 — 95—115. Трэніраванасць сэрца выражаецца ў тым, што яго рэакцыя на фізічную нагрузку змяншаецца. Чалавек пачынае выконваць большую работу з ранейшай частатой сардэчных скарачэнняў, або, інакш кажучы, частата сардэчных скарачэнняў будзе дасягацца пры ўсё большым фізічным намаганні.

Ёсць і другі просты спосаб ацаніць выражанасць фізічнай нагрузкі. Падчас актыўнага занятку варта імкнуцца да таго, каб адчуць цяжкасць дыхання — задышку, але не настолькі, каб не быць здольным размаўляць. Такі ўзровень актыўнасці рэкамендуецца падтрымліваць не менш, чым па 20—30 хвілін на працягу кожнага занятку. Прычым такім заняткам можна лічыць любую дзейнасць, пры якой узнікае вышэйпамянёная задышка. Варта мець на ўвазе, што перыяду інтэнсіўных практыкаванняў павінен папярэднічаць 5—10-хвілінны перыяд размінкі ці разагрэву, а за ім павінен ісці таксама 5—10-хвілінны час змяншэння інтэнсіўнасці работы.

Лічыцца мэтазгодным павышаць сваю фізічную актыўнасць 3, а лепш 4—5 разоў у тыдзень. Эксперты Нацыянальнага інстытута сэрца, лёгкіх і крыві ЗША лічаць, што атрымаць пажаданыя 30 хвілін актыўнасці на працягу дня можна з улікам больш каротkіх перыядаў павышанай фізічнай актыўнасці. Рэкамендацыю інстытута можна сфармуляваць наступным чынам: «Кожны дарослы чалавек павінен паставіць перад сабой мэту назапашваць не менш за 30 хвілін фізічнай актыўнасці ўмераналй інтэнсіўнасці ў большую частку дзён, а лепш за ўсё — ва ўсе дні».

БЕГ ЦІ ГАНТЭЛІ?

— Апошнім часам у пералік фізічных нагрузак, якія аказваюць прафілактычнае ўздзеянне ў адносінах сардэчна-сасудзістых захворванняў, уключаны і статычныя практыкаванні. Напрыклад, узняцце цяжкасцяў, гантэляў, расцягванне эспандэраў, работа на трэнажорах, адцісканні ад падлогі, падцягванні на перакладзіне, прысяданні і г.д. Да нядаўняга часу лічылася, што такія практыкаванні з'яўляюцца толькі сродкам павелічэння мышачнай масы і нарошчвання сілы. Аднак цяпер можна лічыць устаноўленым, што гэтыя практыкаванні ў многім аказваюць такое ж уздзеянне на сардэчна-сасудзістую сістэму і ўтрыманне ліпідаў (тлушчаў) у крыві, як і практыкаванні «на трывалasць», у сэнсе, бег, хада, язда на веласіпедзе...

Сілавыя практыкаванні не лічацца небяспечнымі і для тых, у каго ўжо ёсць хваробы сэрца і сасудаў. Больш за тое, менавіта такія практыкаванні аказваюць на здароўе ўплыў, які не можа быць дасягнуты трэніроўкай «на трывалasць». Так, Амерыканская калегія спартыўнай медыцыны рэкамендуе здаровым асобам 8—10 сілавых практыкаванняў — па адным практыкаванні для кожнай з асноўных груп мышцаў груднога і брушнога прэса, плячэй, сцёгнаў, мышцаў тулава, па 10—15 паўтораў кожнае, мінімум два разы на тыдзень. Амерыканская асацыяцыя сэрца рэкамендуе хворым з сардэчна-сасудзістымі захворваннямі аналагічныя практыкаванні з меншай сілавой нагрузкай, але таксама па 10—15 паўтораў, 2—3 разы на тыдні.

Практыкаванні на развіццё сілы спрыяюць і зніжэнню вагі. Калі такія віды трэніроўкі, як хада ці бег проста «спальваюць калорыі», то сілавыя практыкаванні павялічваюць мышачную масу, якая не ўтрымлівае тлушчу і, акрамя таго, аказваюць уплыў на асноўны абмен. Гаворка ідзе пра энергію, якая расходуецца на работу мозгу, сэрца, нырак і г.д. Таму павелічэнне гэтага паказчыка прыводзіць да пастаяннага павелічэння расходавання калорый і, адпаведна, спрыяе змяншэнню вагі з той, зразумела, умовай, што чалавек не павялічвае каларыйнасці рацыёну.

АБАРОНА «ЎКЛЮЧАНА»!

— Эфект трэніроўкі праявіцца прыкладна праз 4—6 тыдняў. Колькасць сардэчных скарачэнняў у стане спакою зменшыцца, пульс больш хутка пачне вяртацца да пачатковага ўзроўню пасля фізічнай нагрузкі, стане магчымым нарошчванне працягласці і інтэнсіўнасці фізічных нагрузак без нарастання стомленасці. Такая карціна — прыкмета больш эканомнай і эфектыўнай работы сэрца, больш нізкага спажывання сардэчнай мышцай кіслароду. Іншымі словамі, прыкмета абароны ад ішэміі.

Фізічная актыўнасць здольная нейтралізаваць або значна зменшыць шкоднае ўздзеянне на арганізм іншых фактараў: залішняга і незбалансаванага харчавання, павышанага артэрыяльнага ціску, павышанага ўтрымання халестэрыну ў крыві. Акрамя таго, фізічная актыўнасць валодае прафілактычным эфектам у дачыненні да раку, астэапарозу, умацоўвае псіхічнае здароўе.

ЧЫМ РАНЕЙ, ТЫМ ЛЕПШ

— У адным з даследаванняў выпускнікоў гавардскага каледжа група выпускнікоў, якая прытрымлівалася актыўнага ладу жыцця, мела верагоднасць узнікнення смерці ад ішэмічнай хваробы сэрца на 40 працэнтаў ніжэйшую ў параўнанні з іх менш актыўнымі аднакурснікамі. Прынцыпова важна, што абарончы эфект фізічнай актыўнасці мае месца толькі ў тым выпадку, калі актыўныя заняткі адбываюцца тут і зараз. І не спыняюцца. Больш нізкую рызыку ішэміі і яе наступстваў маюць толькі тыя, хто падтрымліваe рэгулярную фізічную актыўнасць. Дарэчы, цікава, што студэнты, якія былі фізічна неактыўнымі падчас вучобы, у асноўным заставаліся фізічна пасіўнымі і ў больш старэйшым узросце.

НОВЫ ДЗЕНЬ — НОВЫ РУХ

— Сусветная арганізацыя аховы здароўя заклікае кожнага чалавека да мінімум 30-хвілінай штодзённай фізічнай актыўнасці, падчас якой будзе расходавацца энергія. І не важна, што менавіта вы будзеце рабіць — займацца нейкім відам спорту або хадзіць пешшу, прыбірацца або танцаваць.

Запісала Святлана БАРЫСЕНКА.

Першую аперацыю на адкрытым сэрцы правялі ў Гродне

61-гадоваму пацыенту з дыягназам ішэмія паспяхова зрабілі аортакаранарнае шунціраванне. Аб гэтым паведаміў галоўны ўрач Гродзенскай абласной клінічнай бальніцы Святаслаў Савіцкі. Паводле яго слоў, аперацыя, якая доўжылася каля чатырох гадзін, выканана згодна з праграмай маштабнага асваення сучасных кардыяхірургічных тэхналогій. Раней у Гродне рабілі толькі стэнціраванне, без ускрыцця грудной клеткі.

БЕЛТА.

Новае папаўненне ўрачоў

прыйшло ў медыцынскія ўстановы Гомеля пасля атрымання імі дыпломаў аб заканчэнні адпаведных устаноў вышэйшай адукацыі: 17 педыятраў, 15 участковых дактароў, 5 неўролагаў і г.д. Усяго — 67 спецыялістаў. Пры няхватцы да гэтага часу ў горадзе 244 урачоў указаная вышэй лічба здаецца недастатковай. Так яно і ёсць. Час пакажа, што будзе далей.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Жаночае здароўе

«Платным» гінекалагам — больш даверу?

14 працэнтаў апытаных жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту ўступалі ў сэксуальныя кантакты на працягу апошніх 12 месяцаў з двума і болей партнёрамі. Пры гэтым падчас апошняга кантакту прэзерватывам карысталіся 60 працэнтаў.

Такія даныя былі атрыманы ў выніку даследавання, праведзеных у межах рэалізацыі нацыянальнай сістэмы маніторынгу і ацэнкі сітуацыі па ВІЧ/СНІДу пры падтрымцы праекта міжнароднай тэхнічнай дапамогі «Прафілактыка і лячэнне ВІЧ/СНІДу ў Рэспубліцы Беларусь», які фінансуецца Глабальным фондам для барацьбы са СНІДам, туберкулёзам і малярыяй.

Паводле ананімных прызнанняў рэспандэнтак, 35 працэнтаў з іх на працягу года здавалі аналіз на ВІЧ. Даследаванне выявіла, што 90 працэнтаў жанчын рэпрадуктыўнага ўзросту добра інфармаваныя аб праблеме ВІЧ-інфекцыі. Палова лічыць сваё здароўе здавальняючым. Пры гэтым стаўленне да паслуг урачоў у апытаных стрыманае. Толькі чвэрць рэгулярна наведвае ўрачоў для прафілактычных аглядаў. Абсалютная большасць атрымлівае гінекалагічную дапамогу ў дзяржаўнай паліклініцы, а хацелі б яе там атрымліваць толькі... 4 працэнты. Жанчыны аддаюць перавагу медыцынскай дапамозе ў платных медыцынскіх цэнтрах або ў прыватнага ўрача.

Святлана БАРЫСЕНКА.

Другасныя функцыі ўчастковых урачоў будуць выконваць іх кваліфікаваныя памочнікі

Аб гэтым паведаміў першы намеснік міністра аховы здароўя Беларусі Роберт Часнойць.

Паводле яго слоў, неабходна аптымізаваць працу ўрача — ён павінен займацца інтэлектуальнай работай, прымаючы пацыентаў, а другарадныя абавязкі (напрыклад, выпісваць рэцэпты) будзе выконваць сярэдні медыцынскі персанал, паўнамоцтвы якога пашырацца. У ўчастковых тэрапеўтаў з'явяцца памочнікі, на плечы якіх будзе ўскладзена частка функцый і адказнасці ўрача. «Новаўвядзенне не азначае пашырэння штату, спецыялісты будуць рыхтавацца сярэднімі спецыяльнымі навучальнымі ўстановамі і заменяць медыцынскіх сясцёр, а ў сельскай мясцовасці фельдшараў ФАПаў», — адзначыў першы намеснік міністра.

Перагледжана ўжо праграма падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі спецыялістаў, першы выпуск якіх запланаваны на наступны год.

Каментуючы праблему чэргаў у паліклініках, Роберт Часнойць адзначыў, што найбольшая колькасць пацыентаў прыпадае на першую палову дня, што звязана як з аб'ектыўнай неабходнасцю (напрыклад, некаторыя аналізы бяруцца нашча), так і з суб'ектыўнымі фактарамі. У сувязі з гэтым у паліклініках плануецца павялічыць колькасць спецыялістаў па забору крыві, працздурных медыцынскіх сясцёр.

БЕЛТА.

Нараджальнасць у Мінску перавышае смяротнасць

Натуральны прырост насельніцтва ў сталіцы за шэсць месяцаў 2008 года склаў 1008 чалавек. У студзені — чэрвені ў Мінску нарадзілася 9773 дзіцяці, што на 5,6 працэнта больш, чым за першае паўгоддзе 2007 года. Аб гэтым на аператыўнай нарадзе ў мэрыі паведаміў старшыня Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Дзмітрый Піневіч. За шэсць месяцаў гэтага года пайшлі з жыцця 8765 мінчан, за аналагічны перыяд 2007 года — 8823. Узровень смяротнасці зменшыўся на 0,7 працэнта (у цэлым па краіне на 1,1).

«Мінск—Навіны».

АХ, ЯКОЕ СВЕЖАЕ ДЫХАННЕ!

Дрэнны пах з рота (па-навуковаму — галітоз) — дастаткова распаўсюджанае захворванне, якое ўскладняе жыццё не толькі яго ўладальніку, але і тым людзям, з якімі ён кантактуе. Як жа пазбавіцца ад гэтай напасці і вярнуць свежае дыханне?

ПЕРШАЕ ДЗЕЯННЕ: ВЫСВЯТЛЯЕМ ПРЫЧЫНЫ ГАЛІТОЗУ

Часцей за ўсё з'яўленне нясвежага дыхання звязана са станам ротавай поласці. Самы просты выпадак — недастаткова часта або старанна вычышчаныя зубы і язык. Рэшткі ежы раскладаюцца пад уплывам бактэрый, гніюць — і надаюць дыханню нежаданы «водар». Па такім жа механізме з'яўляецца пах пры карыесе і захворваннях дзясен (гінгівіт, парадантыт). Нясвежае дыханне можа быць выклікана няякасна ўстаноўленай пломбай або дрэнна падагнанымі зубнымі пратэзамі.

У з'яўленні галітозу вінавата і сліна, а дакладней, яе недахоп. Сліна — своеасаблівы прыродны ачышчальнік ротавай поласці. Пры сухасці ў роце, якая можа быць звязана з парушэннем дзейнасці слінных залоз, прыёмам некаторых лекаў і нават доўгім дыханнем праз рот (напрыклад, пры адэноідах), ахоўная функцыя слiны зніжаецца, бактэрыі пры гэтым інтэнсіўна размнажаюцца, што і прыводзіць да паяўлення дрэннага паху.

Яшчэ адна прычына галітозу — хранічныя хваробы дыхальных шляхоў (рыніты, танзіліты, бранхіты), страўнікава-кішачнага тракта (асабліва калі існуе праблема з ператраўліваннем ежы). Дарэчы, непрыемны пах з рота можа з'явіцца ў прыхільніц строгіх дыет — з-за вельмі рэдкага або аднастайнага харчавання.

Ну і, безумоўна, усім вядомая «пахучасць», якая ўзнікае пасля ўжывання часнаку, цыбулі, алкаголю.

ДРУГОЕ ДЗЕЯННЕ: ПАЗБАЎЛЯЕМСЯ АД ГАЛІТОЗУ

● Перш-наперш, для таго, каб дакладна ўстанавіць прычыну з'яўлення паху, прайдзіце абследаванне ў стаматолага, а таксама наведайце тэрапеўта, каб выявіць ачагі хранічных інфекцый.

● Паспрабуйце адмовіцца ад шкодных звычак (курэння, алкаголю).

● Залог здаровых зубоў — рацыянальнае харчаванне: абмяжуйце салодкае і павялічце колькасць сокаў, садавіны, агародніны, зяленіва.

● Старанна даглядайце ротавую поласць: ачышчайце шчоткай не толькі зубы, але і язык, паднябенне, унутраную паверхню шчок. Прымяняйце для паласкання асвяжальныя эліксіры з ментолам або эфірным алеем.

● Самыя даступныя сродкі для ачышчэння зубоў — хрусткія свежыя яблыкі ці морква.

● Стымулюйце ўтварэнне слiны: як мага часцей і больш піце вадкасці; жуйце жуйкі без цукру і смакчыце асвяжальныя ледзянцы. Народныя лекары раяць пры парушэннях слінааддзялення есці раніцай аўсяную кашу.

● Каб перабіць пах, выкліканы ўжываннем чагосьці «не таго», можна пажаваць пятрушку, сельдэрэй, кроп, каляндру, мяту, аніс, фенхель.

● Пры захворваннях слізістай поласці рота ў народнай медыцыне здаўна прымяняліся паласканні лекавымі травамі. Разам з процізапаленчым дзеянням яны аказваюць і добры дэзадаруючы эфект. Выкарыстоўвайце для гэтых мэтаў календулу, кару дуба, мелісу, мяту, рамонак, сунічнік, траву палыну, шалфей, эўкаліпт. Звычайна траву заварваюць з разліку 1 ст. лыжка на шклянку кіпеню, настойваюць, адціскаюць. Паўшклянкі цёплага настою дастаткова для аднаго паласкання. Палашчыце рот пасля кожнага прыёму ежы і на ноч пасля чысткі зубоў.

● Калі ў абедзенны час на рабоце займацца свaімі зубамі няма магчымасці, заварыце хоць бы свежага чаю і папалашчыце ім рот. У гэтым традыцыйным напоі ўтрымліваецца бактэрыцыдная рэчыва — поліфенол, якое і змагаецца з «водарам».

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Каля 300 хлопчыкаў і дзяўчынак з розных рэгіёнаў Гомельскай вобласці прахо-дзяць аздараўленне ў дзіцячым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Пціч» Петрыкаўскага раёна. Сярод адпачываючых праходзілі курс рэабілітацыі выхаванцы Хойніцкага раённага сацыяльна-педагагічнага цэнтра, гэта — дзеці, бацькі якіх пазбаўлены бацькоўскіх правоў, і дзеці-сіроты. Пяцiразовае харчаванне, медыцынскае абслугоўванне, работа з псіхолагамі і сацыяльная адаптацыя для выхаванцаў Хойніцкага сацыяльна-педагагічнага цэнтра, а таксама ўвага і клопат выхавальнікаў дазваляюць дзеткам адчуваць сябе ў абстаноўцы, максімальна набліжанай да хатняй.

На здымку: мінеральная вада для Жэні Рубцова — «не вельмі».

Фота Сяргея ХАЛАДЗІЛІНА, БЕЛТА.

Чытайце ў наступным нумары

Пра гэта вы не ведалі...

Як на Беларусі шукалі камяні на будаўніцтва маўзалея Леніна

У 1929 годзе пры будаўніцтве ў Маскве маўзалея У.І. Леніна было прынята рашэнне, што калоны, якія падтрымліваюць верхнюю вянцовую пліту, павінны быць выкананы з камянёў кожнай саюзнай рэспублікі. Савет Народных Камісараў Беларускай ССР атрымаў з Масквы пісьмо-тэлеграму аб тэрміновай адпраўцы для будаўніцтва маўзалея дзвюх каменных калон чырванаватага колеру, памерам 150х40х40 см.

Фестывалі

Прымадонна ацаніла грамадзянскую пазіцыю Дзядзі Вані на сцэне «Новай хвалі-2008»

Як паведамляе афіцыйны сайт конкурсу «Новая хваля», прыз музы конкурсу Алы Пугачовай «Залатая зорка Алы» атрымаў удзельнік ад Беларусі Дзядзя Ваня (Іван Вабішчэвіч).

Уручаючы ўзнагароду, прымадонна адзначыла, што беларускі выканаўца, не маючы вакальных звышданых, тым не менш, мае самае галоўнае — сваю грамадзянскую пазіцыю, што вельмі рэдка бывае на сцэне. Ала Пугачова таксама лічыць, што артыст валодае добрымі мужчынскімі якасцямі і вобразам.

Такая ацэнка па кантрасту з ацэнкай журы, якое давала самыя невысокія балы беларускаму канкурсанту, была нечаканай і для Івана Вабішчэвіча. Другую «Залатую зорку Алы» атрымаў выканаўца з Кіргізіі Амар.

Пераможцам конкурсу «Новая хваля-2008» стаў дуэт з Грузіі Georgia. Другое месца ў расіянкі Ірыс, якую, дарэчы прызналі самай стыльнай канкурсанткай. На трэцім радку выканаўца з Італіі Алесандра Рысторы. Яны атрымалі дыпломы і грашовыя прызы — $70 тыс., $40 тыс. і $30 тыс. адпаведна.

БЕЛТА.

СЁННЯ

Месяц

Апошняя квадра.

Месяц у сузор'і Рака.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.20	21.11	15.51
Віцебск —	5.04	21.06	16.02
Магілёў —	5.10	21.01	15.51
Гомель —	5.14	20.51	15.37
Гродна —	5.37	21.25	15.48
Брэст —	5.44	21.19	15.35

Імяніны

Пр. *Маргарыты, Марыны, Лазара, Леаніда.*

К. *Людмілы, Юліты, Леапольда, Пятра, Расціслава.*

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

30 ліпеня

1937 год — у Міску адбыўся пленум ЦК КП (б) Б, у якім удзельнічалі Г. Малянкоў і Я. Якаўлеў, якія прыбылі з Масквы. З гэтага моманту ў рэспубліцы распачалася хваля масавых рэпрэсій. У гэты ж дзень надзвычайныя «тройкі» НКУС атрымалі права выносіць смяротныя прысуды «ворагам народа».

1930 год — першым чэмпіёнам свету па футболе стала каманда Уругвая, якая ў Мантэвідэо ў фінале перамагла аргенцінцаў: 4:2. Прэзідэнт ФІФА Жуль Рымэ ўручыў сціплы з выгляду Кубак кіраўніку ўругвайскай фэдэрацыі Раулю Худэ.

Цытата дня:

«Нам патрэбны два разрады знаёмых: тыя, каму можна скардзіцца на жыццё, і тыя, перад кім можна хваліцца».

Логан Пірсал Сміт.

Усміхнёмся!

Назіранне.

На бардзюры два галубы сядзяць. Адзін натапырыўся, прысеў, а другі першаму па галаве — цюк-цюк! Першы сядзіць, трывае — муж, мусіць!

☺

У парыжскім рэстаране. Афіцыянт:

— Выплюньце! Хутчэй выплюньце!

Наведвальнік:

— Цьфу. Але чаму?

— Яна яшчэ квакае! Нас потым абаронцы прыроды іскамі заваляць!

☺

— Доктар, доктар, як ён?

— Вы ведаеце, ён у цяжкім стане, у яго абшырны інфаркт, пераломы!

— Я магу з ім пагаварыць?

— Не, на жаль, гэта немагчыма. Калі вы нешта хочаце яму сказаць, скажыце мне, я перадам.

— Спытайце ў яго, ці здала я на правы?

Утерянные филиалом Белгосстраха по г. Минску бланки страховых полисов по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу **серия БЛ № 0592725, № 0592730 считать недействительными.**

АДКУЛЬ ПРЫХОДЗЯЦЬ СНЫ?

Гісторыкі сведчаць, што ў старажытныя часы кожны фараон, султан, цар альбо кароль, які сябе паважаў, абавязкова меў асабістага перакладчыка сноў. Яшчэ ў Егіпце каля двух тысяч гадоў да нашай эры будаваліся Храмы Сноў, дзе жрацы «спецыялізаваліся» на іх тлумачэнні і нават лекавалі пры дапамозе начных мрояў.

У Старым Запавеце можна знайсці шмат сноў і заснаваных на іх падзей. У даўніну паважліва стаўленне да сноў дапамагала людзям абраць свой жыццёвы шлях, пазбягаць памылак, небяспекі. І як яны толькі разумелі дзіўную мову шэрагу самых розных знакаў?..

Але і сёння ёсць некаторыя людзі, якія «з павагай» ставяцца да сваіх сноў, ёсць пэўная катэгорыя знаўцаў, якія з ахвотай патлумачаць усё што заўгодна і нават будуць сцвярджаць, што ў сонніку праявіўся народны розум. А некаторыя, наадварот, сцвярджаюць, што ў штодзённай мітусні сучасны чалавек развучыўся не толькі надаваць вялікае значэнне снам, але і запамінаць іх.

Каму шчукі, а каму і шчупакі

Чытаць соннікі — любімы занятак дзяўчат на выданні. Зрэшты, сярод людзей з вопытам таксама час ад часу зойдзе размова пра сны-вешчуны, якія некаму загадзя прадказалі ці то багацце, ці то развітанне. Ці бывае такое і ці варта верыць снам, у якіх мы праводзім трэцюю частку свайго жыцця?

Спакон веку сны заставаліся загадкай для людзей. Ім надавалі містычнае значэнне, лічылі, што ў спалучэнні розных сюжэтаў, якія часта паміж сабой не звязаныя, схаваныя нейкія прадказанні. Гэтым тлумачыцца папулярнасць соннікаў — кніжак, якія даносяць сэнс сімвалаў, якія чалавек бачыў ноччу.

— Наўрад ці ёсць чалавек, які прачынаецца раніцай і не думае пра тое, што сніў, — гаворыць **этнограф Ірына МАХОЎСКАЯ**. — У народнай традыцыі ставіліся даволі сур'ёзна да гэтага моманту. Лічылася, што сны могуць прадказваць сур'ёзныя падзеі, нават такія, як нараджэнне і смерць. Найбольш яркія сюжэты сноў, паводле народнага вопыту, былі звязаныя менавіта з імі, а яшчэ з цяжарнасцю. І цяпер часта можна пачуць прыкмету: калі сніцца пчолы, кураняты, кацяняты (нешта дробнае і многа) — то гэта да таго, каб нарадзіць дзіця. Бывае, нават робяць высновы, хто народзіцца. У адной вёсцы бабуля расказвала, як у сне бачылі два шчупакі — і нарадзіліся два сыны. А ў другой вёсцы гаварылі, што бачылі дзве шчукі — і на свет з'явіліся дзве дзяўчынкі. Старыя людзі расказваюць сны, у якіх прадчуваюць смерць: калі хто-небудзь з памерлых сваякоў да іх прыходзіць, кажуць, каб забраць. Кожны сон разглядаецца адпаведна сітуацыі, якая датычыцца жыццёвага кола праблем. Напрыклад, маладой нарадзе вяселля сніцца зерне, якое каласіцца, то тут усё проста: да лепшага жыцця. Іншая справа, што вывучаць сёння народныя прыкметы, якія датычацца сноў, складана і не мае асаблівага сэнсу — бабулі самі ўжо карыстаюцца выдадзенымі соннікамі. А там такое прачытаць можна...

Затое ў народзе знайшлі свае сродкі змагацца з дрэннымі снамі. Напрыклад, нічога не кажучы, з раніцы паглядзець у акно. Ірына раіць узгадваць разумную народную прыказку: «Куды ноч — туды і сон». Ці сказаць: «Няхай усё ідзе на сухі лес». І забыцца на бязглуздзіцу як мага хутчэй — не вартая яна таго, каб надаваць ёй столькі ўвагі і губляць дзень на тое, каб гадаць: а раптам спраўдзіцца?

Што б там ні казалі розныя ахвотнікі да тлумачэнняў падзей з чужога жыцця, наўрад ці яны, не ведаючы чалавека, могуць сказаць, пусты сон ён бачыў ці з сэнсам. Любому сімвалу ці вобразу можна надаць сэнс штучна, любым можна скарыстацца, каб уцягнуць чалавека ў містыку, асабліва таго, які ўжо сам гатовы ў нешта паверыць.

Але існаванне сноў-вестуноў не адвяргае нават навука. Такі сон бывае вельмі ясным, што яго не трэба ўвогуле тлумачыць, а ўсе падзеі ўспрымаюцца ў ім амаль літаральна. Чалавек у гэты час усведамляе, што бачыць сон, у якім яму нехта яўляецца і паведамляе адказ на пытанне, якое яго надта непакоіла.

Толькі розум

— Соннікі нічога і не могуць патлумачыць, — сцвярджае **псіхолаг Наталля ЦЯРПАК.** — Дастаткова ўзяць некалькі гэтых кніжачак, каб зразумець, што кожная з іх тлумачыць адны і тыя ж сны па-рознаму. Гэта, хутчэй, зборнік прыкмет, які розны ў розных народаў, а калі і бываюць супадзенні, то выпадковыя. А вось напалохаць ці прымусіць пра нешта думаць — могуць. І важна не забывацца, што думкі матэрыяльныя, а ў той час, калі мы думаем пра тое, што можа здарыцца ў жыцці, яно насамрэч праходзіць — без нашага ўдзелу. Іншая справа — асаблівыя сны. Гэта нават не сны ў чыстым выглядзе, а, хутчэй, мроі. У навуцы апісаныя шмат выпадкаў, калі чалавек трапляе ў тую ж самую сітуацыю, якую ён перажываў у сне. Гэта дапамагае яму ці перажыць радасную падзею, ці то падрыхтаваным сустрэць небяспеку. Але за гэта мы павінны дзякаваць уласны мозг.

Псіхолагі распавядаюць пра выпадак, які стаў шырока вядомы. Адзін студэнт некалькі разоў бачыў адзін і той жа сон, калі яго абвіваў пітон, не дазваляючы нават пашавяліцца. Медыцынскія даследаванні не выявілі ніякіх хваробаў. Але праз год пасля «прарочага» сну ў яго выявілі хваробу, якая прывяла да паралічу. Падобныя выпадкі былі апісаныя яшчэ ў 1791 годзе рускім фізіёлагам Нудавым у працы «Вопыт пабудовы тэорыі сну». Іншыя даследчыкі развівалі тэму, імкнучыся прасачыць сувязь сноў з рознымі хваробамі. Заўважана, што характар сноў у чалавека мяняецца прыкладна за 2-3 месяцы да выяўлення ў яго гіпертаніі, за два месяцы да першых прыкмет туберкулёзу, за месяц — да гастрыту. А па выявах у снах можна разумець, дзе хвароба вылезе.

Ёсць адна прыкмета, якая ў гісторыі была праверана шматразова. Калі нейкі сон паўтараецца ты разы запар, ён амаль верагодна спраўдзіцца. У жыцці лічыцца, што сон неабходны чалавеку не толькі для адпачынку арганізму, але ў тым ліку мозгу. Але даказана, што ў сне мозг працуе нават больш актыўна. Распаўсюджана меркаванне, што ўначы адна палова мозгу адпачывае, а другая працуе, а потым яны мяняюцца. Але працуюць абодва паўшар'і, аднаўляючы тое, што было ў пражытым дне, аналізуючы падзеі і робячы высновы: ці ўсё было зроблена правільна за дзень, ці не было ўчынку, з-за якога потым могуць напаткаць непрыемнасці. Выбіраюцца варыянты вырашэння іх наступстваў. Гэтыя варыянты, кароткія, нелагічныя, неверагодныя, мы і бачым у нашых начных мроях. І немагчыма ім знайсці рацыянальнае тлумачэнне. Але часам гэтыя ўрыўкі ствараюць цэльную карцінку, якая цалкам кладзецца на рэальнае жыццё. Гэта і ёсць сны-вестуны, якія могуць перавярнуць жыццё не аднаго чалавека, а нават чалавецтва. Памятаеце Мендзялеева з яго мудрагелістай табліцай?

Сімвалы для вернікаў

Сапраўды, што толькі ні выплыве са свядомасці, якая перагружана інфармацыяй самага розната кшталту? Розум сучаснага чалавека можа нараджаць такіх пачвараў і правакаваць жахі, і хочацца хутчэй выкінуць з галавы тое, што бачыў ноччу. Куды там звярнаць увагу на рознае глупства... Але раптам прысніцца такое, пасля чаго хочацца змяніць усё сваё жыццё.

Аднойчы мне патэлефанаваў сябра Анатоль, ён быў вельмі ўзрушаны. Увечары жонку забралі ў радзільню, ён так перажываў за яе, што першы раз у жыцці ўпаў на калені перад абразамі, якія былі падораны кімсьці ім на вяселле. А ноччу яму прысніўся сівы барадаты стары і сказаў, у які час народзіцца дачка, тварам яна будзе падобная на тату. Якое ж было здзіўленне, калі раніцой у радзільні яму паведамілі час з'яўлення на свет дачкі — дакладна да хвіліны. Калі шчаслівыя бацькі вырашылі хрысціць немаўля, у царкве іх чакала яшчэ адно адкрыццё: тата літаральна знямеў, убачыўшы выяву святога, які прынёс яму радасную навіну. З таго часу ў сям'і асабліва любяць Мікалая Цудатворцу. Так завуць старэйшага з трох сыноў, якія нарадзіліся пасля дачкі ў сям'і, якая з Божай ласкі стала шматдзетнай. Гэта быў сон, які адкрыў шлях да цудаў не толькі ім, але многім блізкім і знаёмым. Як ў такое паверыць? Сон-вяшчун не можа быць даказаны як факт. Але асобны чалавек, які супастаўляе факты свайго ўнутранага жыцця і рэальнасці, можа ўпэўніцца ў тым, што бачыў менавіта яго. Пераканаць у гэтым астатніх будзе вельмі складана. Хіба што сапраўды прыкладам уласных перамен, якія проста так наўрад ці адбыліся б.

І як не зразумець тых людзей, якія падобныя сны лічаць часткай свайго асабістага духоўнага вопыту? Нібыта інфармацыя прыходзіць з будучыні, якая пакуль што не існуе і не акрэслілася, але ўжо заяўляе пра сябе і дае падставы разважаць пра сведчанне нематэрыяльнай сутнасці чалавека. Нехта дорыць нам гэтыя маленькія цуды, каб мы не патанулі ў адчаі.

Доўгі час пакутуючы на бяссонніцу, я лічыла, што расказы пра сны-вестуны ды і проста ра сны — нейкі здзек. Сны чалавека — адлюстраванне гэтага свету, які часта выглядае як блазан. Як вынік — хаос, бессэнсовасць і нават камічнасць вобразаў, якія знікаюць з розуму раніцай. Але ж ёсць навука, якая вывучае гэты феномен, нездарма ж псіхолагі сцвярджаюць, што дзевяноста дзевяць працэнтаў сну — вобразы мінулага вопыту і ўласнай фантазіі.

«Усё проста: ты вельмі доўга пра гэта думала, доўга хадзіла і глядзела розныя кватэры, каб набыць сабе жыллё, — тлумачыла мой дзіўны сон псіхолаг Наталля. — Вось падсвядомасць і зрабіла сваю справу». Нават большую, чым на той час маглі ўявіць. Пасля некалькіх месяцаў пошуку кватэры, мы ўжо спыніліся на адным варыянце, падпісалі пагадненне з рыэлтарам і аддалі грашовы заклад. Раніцой я прачнулася ў шоку і расказала мужу, што бачыла ў сне, як у новай кватэры мяне забіваюць. Праз знаёмых, якія звязаныя з міліцыяй, мы высветлілі, што дом і сапраўды з крыміналам... Нібыта нехта папярэдзіў.

А пра адзін сон я адразу вырашыла распавесці свайму сябру, які абраў шлях веры. Мне сніўся вялікі суд. Той самы, пра які хоць аднойчы задумваецца кожны. «На споведзі даўно была?» — пачулася пытанне. — Мы, грэшныя, праз сны найчасцей спакусу атрымаць можам — што глядзім, што слухаем? Чаго ж тут дзівіцца?..»

Ды ці сапраўды людзі гатовыя да папярэджанняў? Зрэшты, павінны быць гатовыя — уся гісторыя чалавецтва вяла да гэтага: здаўна лічылца, што сны з'яўляюцца найбольш распаўсюджанай формай размовы чалавека з Богам.

Прарокі і іх мроі

У Бібліі паўсюль ад самага пачатку да Адкравення Яна Багаслова сны выступаюць пасярэднікам паміж Богам і чалавекам. У сне Іосіф, хаваючы сына і жонку, атрымлівае папярэджанне пра небяспеку вяртання да Ірада і неабходнасць пайсці ў Егіпет , а потым — інфармацыю пра вяртанне ў Ізраіль.

Гісторыя будзьму пачынаецца са сну маці Буды, у якім яна зразумела, што зацяжарала чалавекам, які будзе кіраваць вернікамі і стане Настаўнікам.

У Новым Запавеце Іосіф праз сон атрымаў навіну пра цяжарнасць Марыі і нараджэнне сына Божага, якога ён павінен прыняць як свайго.

Першыя пасланні Мухамеду, з якіх ён даведаўся пра сваё наканаванне, прыйшлі менавіта ў сне, які вядомы як «Начное падарожжа»: прыбыўшы ў Іерусалім на дзіўнай жывёліне, якая напалову была чалавекам, напалову кабылай, ён сустрэўся са сваімі папярэднікамі — Аўрамам, Маісеем, Ісусам.

Пра адзін з самых дзіўных сноў Новага Запавета распавядае Евангелле ад Матфея. Жонка Понція Пілата пераконвала мужа вызваліць Хрыста, а не Вараву: «Бо я сёння ў сне шмат пацярпела за яго». У большасці падзей, пра якія паведамляецца ў снах біблейскіх герояў, увасабляюцца ў рэальнасць, аднак у гэтым выпадку Пілат не скарыстаў парады і Хрыстос быў распяты...

Ларыса ЦІМОШЫК.

У свеце

Англійскія хлопцы хапаюцца за нажы

пакуль іх бацькі спрачаюцца наконт таго, што лепш у выхаванні — бізун ці пернік?

Яшчэ адносна нядаўна дзеля ўзмацнення выхаваўчага эфекту звонкая аплявуха, удар палкай па руках ці ніжэй спіны было звычайнай з'явай у англійскіх школах і сем'ях. Але з часам норавы мяняліся ў бок змякчэння гэтых не лепшых традыцый туманнага Альбіёна. Праўда, надзвычай марудна, як, дарэчы, і іншыя англійскія традыцыі. Бо толькі ў 1986 годзе ў дзяржаўных школах Вялікабрытаніі былі забаронены фізічныя пакаранні вучняў, а ў прыватных — у 1998 годзе. Аднак дома гэта забарона нярэдка ігнаруецца, таму што многія бацькі лічаць лепшым метадам выхавання падрастаючага пакалення спалучэнне бізуна і перніка. І такіх сем'яў у Вялікабрытаніі дастаткова, настолькі, што асобныя палітыкі прапануюць на заканадаўчым узроўні канчаткова забараніць падымаць руку на дзяцей і няпоўнагадовых.

Бо гэта — пытанне абароны правоў чалавека, настойваюць палітыкі. Іх непакоіць, што дзеці, якіх білі ў пяшчотным узросце, потым будуць успрымаць агрэсію і насіле як норму паводзінаў. Відаць, невыпадкова англійскія хлопцы ўсё часцей хапаюцца за нажы падчас вулічных «разборак», нематываных сутыкненняў з падлеткамі па дробных прычынах. Апошнім часам у Вялікабрытаніі назіраецца літаральна эпідэмія боек сярод моладзі з выкарыстаннем халоднай зброі. Ад удара нажа ўжо загінулі дзесяткі маладых людзей. Праблема набыла такія маштабы, што яна абмяркоўвалася ва ўрадзе і парламенце.

Пры падтрымцы неабыякавых палітыкаў і садзейнічанні іх аднадумцаў у Лондане працуе «гарачая» тэлефонная лінія для пакрыўджаных дзяцей і падлеткаў. Палову звонкоў складаюць скаргі на бацькоў ад збітых юных суграмадзян. Калі падыходзіць фармальна, то сёння англійскім бацькам нічога не пагражае за біццё дзіцяці, галоўнае, каб не было траўмаў і сінякоў. Законам за збіццё дарослага прадугледжана крымінальная адказнасць, нават удар жывёлы разглядаецца як праява жорсткасці. Атрымлваецца, што гвалт над дзецьмі і падлеткамі — гэта ні што іншае, як выхаванне.

У Еўропе ўсё больш рашуча гучаць патрабаванні адмовіцца ад практыкі фізічнага пакарання дзяцей і падлеткаў у выхаваўчых мэтах. А ў Вялікабрытаніі нават нарадзіўся грамадскі рух пад красамоўнай назвай «Дзеці недатыкальныя». Яго ўдзельнікі ставяць мэтай унясенне змяненняў у заканадаўства, якія б адназначна пад пагрозай адказнасці забаранялі дзікунскія метады выхавання. Аб маштабе праблемы гаворыць хоць бы той факт, што заснаваны ў 1998 годзе рух аб'ядноўвае больш за 400 грамадскіх арганізацый і мае тысячы аднадумцаў і прыхільнікаў па ўсёй краіне.

Замшэлымі метадамі ўздзеяння на непаслухмяных няпоўнагадовых грашаць не толькі англічане. Згодна з еўрапейскімі крыніцамі, з 47 краін — удзельніц Савета Еўропы (арганізацыя, якая актыўна і мэтанакіравана займаецца абаронай правоў чалавека) толькі ў 18 поўнасцю забаронены фізічныя пакаранні дзяцей. У астатніх краінах яшчэ працягваюцца дыскусіі на тэму бізуна і перніка. А тым часам працягваюць пакутаваць сотні тысяч юных еўрапейцаў.

Леанід ТУГАРЫН.

Зваротная сувязь

У пошуках «чатырохногага сябра»

«У мяне быў вельмі добры абаронца і адданы сябар — сабака пароды шпіц. Праслужыў мне шчыра адзінаццаць гадоў. Нядаўна ён так моцна захварэў, што ніякія лекі не дапамагалі. Вельмі сумую па свайму Жучку і хацеў бы набыць шчаня такой жа пароды.

Хочацца даведацца, ці ёсць у Мінску клубы альбо секцыі сабакаводаў, па рэкамендацыі якіх я мог бы купіць сапраўднага маленькага ці сярэдняга шпіца».

Уладзіслаў Пілячынскі, *Докшыцкі раён.*

Нямецкі шпіц.

...Айда на выставу

Па дапамогу звярнулася ў Беларускае кіналагічнае аб'яднанне.

Паводле слоў кінолага Віктара, шчаня можна набыць трыма спосабамі. **Першы спосаб:** праглядзець аб'явы ў газеце «Из рук в руки» (альтэрнатыва — аб'явы на спецыялізаваных сайтах у Інтэрнэце).

Другі спосаб: паехаць на рынак (напрыклад, на сталічны рынак «Ждановічы»).

Трэці спосаб: наведаць выставы сабак, якія клубы сабакаводаў арганізоўваюць адзін-два разы на тыдзень (час і месца правядзення можна даведацца на сайце: http://www.bcu-upo.org).

«Дарэчы, апошні варыянт я рэкамендаваў бы разгледзець у першую чаргу. На выставу, як правіла, прывозяць дарослых сабак, таму там вы можаце выбраць маці для свайго будучага шчаняці. Акрамя таго, адразу ж на месцы ёсць цудоўная магчымасць наладзіць кантакты з уладальнікамі сабак любой пароды. І калі ў гаспадара няма на дадзены момант патрэбнага вам шчаняці, то як толькі малы з'явіцца на свет, ён вам паведаміць. Акрамя таго, на выставах можна пракансультавацца ў прафесійных кінолагаў, якія могуць параіць, якога сабаку лепш набыць.

У «сябра чалавека» павінны быць дакументы!

«Дзе і ў каго б вы ні набывалі сабаку, абавязкова праверце наяўнасць шчанячай карткі, дзе б значылася дата нараджэння шчаняці, яго радаслоўная. Акрамя таго, шчаня, якое дасягнула 2 месяцаў, павінна быць абавязкова прывітае — каб пераканацца ў гэтым, патрабуйце ветэрынарны пашпарт.

У склад Беларускага кіналагічнага аб'яднання (тэл. (8017) 306 31 64) уваходзяць 27 клубаў. Вось каардынаты толькі некаторых з іх: Віцебскі клуб сабакаводства «Кінолаг», тэл. (80212) 24 20 94, «Альба Росс» (Мінск), тэл. (8017) 216 09 10, «Хобби» (Мінск), тэл. (8017) 206 34 98.

Лепш за ўсё набываць шчаня ва ўзросце ад 3 да 6 месяцаў (у трохмесячнага шчаняці ўжо сфарміраваны імунітэт, а вось пасля 6 месяцаў яго будзе складана адабраць ад гаспадара, да якога яно паспела прывыкнуць).

Увага!

«Сапраўднага народзістага сабаку можна вызначыць, у першую чаргу, па знешнім выглядзе. Агульны выгляд шпіца: кароткая, квадратная сабака з лісінай вострай мордачкай, невялікімі, стаячымі, востраканечнымі вушамі і моцна скручаным, закінутым на спіну пушыстым хвастом. Шэрстка густая і пушыстая, утварае на шыі шыкоўны каўнер. Галава, вушы і лапы пакрытыя кароткай густой шэрсцю.

Часта на рынках гаспадары спрабуюць збыць бракаваных шчанят: плоская ці круглая галава, вельмі вялікія вочы, вісячыя, пастаўленыя далёка адно ад другога, вушы, светлыя мочкі носа, павекі і вусны. Хвост няшчыльна прылягае да спіны, вельмі доўгі, вісячы ўбок. Хвалістая шэрсць. Таму пры выбары шчаняці трэба быць уважлівым і не спяшацца. А лепш за ўсё ўзяць з сабой спецыяліста».

Надзея ДРЫЛА.

ШАХМАТЫ

Пад рэдакцыяй майстра спорту Уладзіміра СЫЧОВА

ПЯЦЬ ХВІЛІН НА РОЗДУМ

Ф. Вісента



Белыя пачынаюць і даюць мат за 4 хады пешкай. (3+1).

Ф. Вісента



Шах і мат пешкай за 5 хадоў. (6+3).

Задачы складзеныя Францыскам Вісентам і апублікаваныя ў яго кнізе ў 1495 годзе на каталонскай мове ў Валенсіі. Ф. Вісенту (Францыя) па праву лічаць першым кампазітарам сучасных шахмат. Чакаем вашых адказаў.

ПРАВЕРЦЕ СВАЕ РАШЭННІ

Прыводзім рашэнні кампазіцый, апублікаваных у «Звяздзе» 19 і 28 чэрвеня г.г.

Л. Лебедзеў. 1. Kc6! -- 2. Фd8x.

М. Бантыш. 1. Cb6! -- 2. Лg4+ Kf4 3. Kg5x. 1. ... Kc5 2. Cd4+, 1. ... Лf3 2. Cd3+.

З чаго пачаць? Штальберг — Алёхін (1930 г.). 30. ... h6! 31. Kph1 Л:f3 і белыя здаліся.

Якому каралю горш? Канстанцінопальскі — Дубінін (1928 г.). Перамога белых няпростая: 39. h3! Ф:e3 40. Kph1! Cd5 41.C:d5 ed 42. Лg1! Фe4! 43. Фf8 Kph5 44. e6! Лc3! 45. Kph2 Фe2! 46. Фf6! Чорныя здаліся.

ПЕРАМОЖЦЫ ВЫЗНАЧАНЫ

У Міжнародны дзень шахмат у Мінску праводзіліся вочныя рэспубліканскія спаборніцтвы па рашэнні шахматных задач і эцюдаў. Перамог прадпрымальнік з Кліча Аляксандр Булаўка, які набраў 75 ачкоў і патрацію 309 мінут. Другое месца заняў мінчанін Мікалай Сігневіч — 63 ачкі (357 мінут). На трэцім месцы — настаўнік з горада Ганцавічы Іван Бондар — 61 ачко (322 мінуты). На наступных месцах: У. Барташ (Мінск) — 53 ачкі (350 мінут), В. Волчак (Лідскі раён) — 46,5 (360 мінут). Астатнія ўдзельнікі набралі менш за 45 ачкоў.

Прыводзім для рашэння задачу на зваротны мат. Гэтую задачу ўдзельнікі спаборніцтва рашыць не здолелі.



Мат за 4 хады. (13+4).

Чакаем вашых адказаў на цікавую задачу.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар.

Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».

Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.

Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4074. Нумар падпісаны ў 19.30.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12